Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

КОШТ НУМАРУ 4 коп.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Навынарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:

На 1 месяц	— 70 к.
„ 3 „	2 р. — к.
„ 6 „	4 р. — к.
„ 1 год	8 р. — к.
Зьмена адрасу: іншагародняя	— 20 к.
мясцовыя	— 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:

За радок капярэлі пасьля тэксту	— р. 50 к.
За радок капярэлі пасьпяод тэксту	1 р. — к.
За радок капярэлі перад тэкстам	1 р. 50 к.

Сьпецыяльныя на 50 проц. дарожай.

Звыш тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ:

За 1 дакумант	35 кап.
За кожны дадатковы	15 „
Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумант	15 „
За кожны дадатковы	5 „

Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх пашт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 8 (2196) Аўторак, 10-га студзеня 1928 г.

2-ая Сэсія ЦВК БССР VIII скліканьня.

Становішча і далейшыя пэрспэктывы разьвіцьця народнае гаспадаркі БССР.

Даклад Старшыні Савету Народных Камісараў БССР тав. Галадзеда.

Таварышы! На мяне ўскладзена вельмі складаная і цяжкая задача. Я навінен буду далажыць 2-й Сэсіі ЦВК VIII-га скліканьня аб тых дасягненьнях, якія пралетарыят і працоўнае сялянства Беларусі мелі на працягу апошніх год у гаспадарчым і культурным будаўніцтве.

Нядаўна працоўныя ўсяго Савецкага Саюзу, з удзелам прадстаўнікоў рабочае клясы чужаземных дзяржаў, сьвяткавалі вялікае сьвята Пралетарскай Рэвалюцыі—10-ю гадавіну Кастрычніка. Па ўсіх куткох вялікага Савецкага Саюзу, а таксама і ў нас на Беларусі, працоўныя масы падагульвалі тыя вынікі, якія мы мелі на шляху сацыялістычнага будаўніцтва на працягу гэтых год змаганьня і працы над пабудовай нашай гаспадаркі, над пабудовай новага сацыялістычнага жыцьця. Мне прыдзецца, можа быць, у некаторых мясцох паўтарацца у зьвязку з тым, што мы ня раз ужо гаварылі на зьездах партыі і іншых сходах аб нашых дасягненьнях. Але калі я гэтага не зраблю, то гэта азначала-б, што я ня дам больш-менш поўнага і яскравага малюнку таго становішча нашай гаспадаркі, якое мы маем зараз і ад якога мы павінны намячаць далейшыя пэрспэктывы, але я ўсё такі буду старацца, каб спыняцца толькі на галоўных момантах як становішча, так і далейшых пэрспэктыў, маючы на ўвазе, што я на некаторыя пытаньні нашай працы, працы ўраду ў галіне адшуканьня ўсіх магчымасьцяў дзеля большых асыгнаваньняў сродкаў на гаспадарчае будаўніцтва—гэта пытаньне аб скарачэньні і рэарганізацыі дзяржаўнага апарату будзе стаяць асобна ў парадку дня нашай працы, аб чым будзе дакладваць т. Калнін, таксама пытаньні культурнага будаўніцтва і дзяржаўны бюджэт на 1927-28 год будуць спэцыяльна абгаварвацца, а таму я на гэтых пунктах буду спыняцца вельмі мала.

БАЗА БУДАЎНІЦТВА І ЎМОВЫ ПРАЦЫ.

Што мы мелі тады, калі ўступілі на шлях новага сацыялістычнага будаўніцтва пасьля заваёвы ўлады пралетарыятам? Перш-на-перш мы мелі вёзкі ўзровень сельскай гаспадаркі і прамысловасьці. Нізкі ўзровень прамысловасьці трымаў таксама і сельскую гаспадарку ў экстэнсыўным становішчы, але ўся тая спадчына, якую мы атрымалі ад царскай Расеі, была яшчэ зруйнавана гадамі імпэрыялістычнай і грамадзкай войн і гадамі акупацыі Беларусі.

Так што, як бачыце, гаспадарчая база, на якой пралетарыят і працоўнае сялянства Беларусі павінна было разгортваць сваю працу па сацыялістычным будаўніцтве, была вельмі слабая. Умовы, у якіх мы пачалі працаваць і ў якіх мы ўвесь час працуем, таксама былі неспрыяючымі. Мы, напрыклад, пачалі працаваць значна пазьней, чым працуюць працоўныя Савецкага Саюзу. Папершае, нямецкая, а потым беларуская акупацыі выбілі ў нас цэлых тры гады, якія мы мелі-б магчымасьць патраціць на адбудову нашае гаспадаркі. Мы працуем толькі 7 гадоў.

На працягу гэтых 7-мі гадоў мы ўнутры нашае краіны ў пабудове гаспадаркі мелі таксама вялікія перашкоды з боку палітычнага бандытызму, які выконваў волю і пажаданьне эўрапейскага капіталізму і які доўгі час—амаль што да 1924 году—перашкаджаў нашай мірнай працы.

Міжнародныя абставіны.

Міжнародныя ўзаемаадносіны таксама мелі вялікі ўплыў на наш адбудоўчы пэрыяд. Галоўныя моманты на якія не маглі не рэагаваць працоўныя Савецкага Саюзу, а асабліва працоўныя Савецкай Беларусі, я пералічу ў хронолёгічным парадку:

У 1923 годзе нота Керзона, якая ўскалыхнула працоўных усяго Савецкага Саюзу і якой наша мірная праца была парушана.

Далей, вобыскі ў гандлёвым прадстаўніцтве СССР у Бэрліне. Другая ангельская нота ў зьвязку з лістом Зіноўева; адмова новага ўраду Бальдвіна ратыфікаваць дагавор, які нам прышлося зрабіць з урадам Магданальда. У 1926 годзе мы маем такія выпадкі, як, напрыклад, напад на нашых дыплёматычных кур'ераў у поездзе пад Рыгай. У верасьні 1926 г. Чжан-Цзо-Лін, па даручэньні кансэрватыўнага ўраду ангельшчыны, насільна затрымаў тыя судны, якія былі маемасьцю Ўходня-Кітайскай чыгункі.

Возьмеце першыя месяцы 27 году. Яны таксама поўны гэтых міжнародных актаў, якія мелі вялікі ўплыў на нашу мірную працу. Напрыклад, налёт кітайскай паліцыі на памяшканьне гандлёвага прадстаўніцтва ў Харбіне, напад пекінскай паліцыі на памяшканьне ваеннага аташэ і прадстаўніцтва ў Пекіне, а таксама на кватэры супрацоўнікаў.

Далей, напад ангельскай паліцыі на памяшканьні нашага гандлёвага прадстаўніцтва і Аркоса ў Лёндане і потым разрыў дыплёматычных узаемаадносін паміж СССР і Англіяй і, урэшце, забойства т. Войкава ў Варшаве.

Усе гэтыя галоўныя пункты, бязумоўна, мелі непарыўную сувязь з той працай, якую рабочыя і сяляне праводзілі на працягу ўсяго гэтага часу.

Наша палітыка—палітыка міру.

Якія галоўныя прынцыпы ў міжнароднай палітыцы з боку Савецкага Саюзу? Першае — наш лёзунг быў, ёсьць і застанецца на далейшы час—гэта барацьба за мір.

Ні адзін ўрад на ўсёй зямной кулі, акрача савецкага, не вядзе такой паслядоўнай энэргічнай палітыкі за тое, каб не дапусьціць новае вайны. Толькі савецкі ўрад паўхільна вядзе такую палітыку. Далей, прынцыпы нашай міжнароднай палітыкі ў барацьбе супроць фінансавай і эканамічнай блёкады Саюзу з боку капіталістычных дзяржаў. Трэцяе, што зьлучецца асновай у нашай міжнароднай палітыцы—гэта братэрскае спачуваньне і маральнае падтрыманьне Савецкім Саюзам тых нацыяў, тых малых дзяржаў, якія вядуць барацьбу за сваё нацыянальнае вызваленьне і за незалежнасьць сваіх краін.

Вось тыя галоўныя моманты, якія кіравалі нашай міжнароднай палітыкай як у мінулым, так і цяпер.

Што мы маем з боку капіталістычных дзяржаў у міжнароднай палітыцы? Папершае, буржуазныя дзяржавы робяць усякія перашкоды, каб ня даць нам ажыцьцяўляць нашую мірную палітыку. З таго моманту, як кансэрватыўны ўрад Англіі прышоў да ўлады, ён увесь час нясупынна вядзе працу па стварэньні антысавецкага блёку, ён увесь час вядзе такую палітыку, якая перашкодзіла-б нам мірна працаваць над пабудовай нашай сацыялістычнай гаспадаркі. Ангельскі ўрад увесь час, і нават да разрыву ўзае маадносін з намі, працаваў над тым, каб стварыць навакол нас фінансава-эканамічную блёкаду. І зараз нясупынна імкнецца ажыцьцявіць гэтую палітыку. Супроць гэтай палітыкі мы ставім палітыку міру і ўстанаўленьня мірных адносін са ўсімі дзяржавамі. Нашы дасягненьні ў гэтым зводзяцца да таго, што мы, ня гледзячы на тую шалёную працу, якую вядзе супроць нас ангельскі ўрад, каб акружыць нас эканамічна-фінансавым і ваенным кальцом, усё-ж маем посьпехі: мы заключылі дагаворы аб ненападзе з Латвіяй, Турцыяй, Пэрсіяй, Літвой; мы вядзём перагаворы аб ненападзе з Эстоніяй, Польшчай, Фінляндыяй і інш. дзяржавамі; мы гатовы заключыць з любой дзяржаваю дагавор аб ненападзе і аб дзелавых эканамічных узаемаадносінах. Гэта мы заўсёды заяўлялі і заяўляем і заўсёды гэта праводзім у жыцьцё. Напрыклад, мы дабіліся такіх посьпехаў у справе ўстанаўленьня дзелавых адносін. Мы заключылі гандлёвыя дагаворы з Турцыяй, Пэрсіяй, Літвой і Латвіяй і інш. Характэрным зьяўляецца і тое, што ў Злучаных Штатах Амэрыкі паасобныя грамадзкія колы ўсё больш настойваюць перад сваім урадам аб заключэньні з намі нармальных адносін. Гэта выказваецца ў тым, напрыклад, што з боку асобных фінансавых колаў Амэрыкі мы атрымліваем значнае павялічэньне крэдытаў, асабліва, як вы ведаеце з друку, у галіне тэкстыльнай прамысловасьці. Затым, мы таксама спадзяёмся, што нашы перагаворы з Францыяй аб заключэньні дагавору, аб якім мы ўжо гаварылі, таксама будуць адноўлены, ня гледзячы на тое, што яны былі першы раз сарваны і, бязумоўна, праз ангельскі ўрад, праз вядомага вам Дэтэрдынга, таго Дэтэрдынга, які ў сваёй нянавісьці да Савецкага Саюзу з-за канкурэнцыі на нафтавым рынку рабіў нам усякія перашкоды ўключна да таго, што разам з белагвардзейцамі, якіх рабочыя і сяляне Савецкага Саюзу выгналі замежы сацыялістычнае дзяржавы, пачаў друкаваць фальшывыя чырвонцы. Мы ня ведаем, якую ролю адыгрываў у гэтай справе сам нафтавы король. Дэтэрдынг, магчыма, ён быў простым «рабочым ад станка», а магчыма ён быў кіраўніком. Але нам адно вядома, што гэты самы «адукаваны» англелец, вялікі патрыёт, спрабуе ўсе магчымасьці, як спрабаваў раней, каб перашкодзіць нашай мірнай працы. Таксама нам дасканала вядома і тое, што якую-б ролю гэты Дэтэрдынг не адыгрываў у фабрыкацыі фальшывак, ён працуе над гэтымі справамі ў поўнай сувязі і пад кіраўніцтвам ангельскага ўраду. Так што нас ня можа ня цікавіць яго роля ў гэтай бандыцкай белагвардзейскай шайцы, якая займалася падробкай савецкіх чырвонцаў.

Ураду Савецкага Саюзу прымаў усе меры, каб кожна было ажыцьцявіць нашы папярэднія лёзунгі аб усеагульным разброеньні. Але мы бачым, што капіталістычныя дзяржавы, ня гледзячы на ўсю брахню іх аб разброеньні, усё пашыраюць узброеньні. Імпэрыялісты паўхільна пасоўваюцца ўперад да вайны. Уся гэта праца па ўзмацненьні ўзброеньняў усіх капіталістычных дзяржаў, па падрыхтоўцы вайны прыкрываецца пустымі гутаркамі аб міры

Тав. ГАЛАДЗЕД.

Савецкі ўрад пасылаў сваю дэлегацыю пад старшынствам т. Ліцьвінава на канфэрэнцыю па разброеньні ў Жэневу, загадзя ведаючы, што Ліга Нацый, пры якой канфэрэнцыя гэта зьбіралася, ніколі ня здольна і ня будзе здольна правесьці лінію па ўсеагульным разброеньні. Мы гэта ведалі раней, бо яшчэ калісьці на Гэнуэскай канфэрэнцыі мы высоўвалі гэты лёзунг усеагульнага разброеньня.

Мы высоўвалі праз тав. Ліцьвінава сваю праграму, праграму разброеньня. Мы гэтую праграму паставілі яскрава, каб ня было ніякай магчымасьці прадстаўніком капіталістычных дзяржаў што-небудзь выставіць супроць яе. Пагэтаму імпэрыялістам яна прышлася не да смаку. Яны пастараліся праз усякія камісіі і падкамісіі гэту праграму схаваць і цэлых тры дні сядзелі над тым, каб толькі абгаварыць, калі яшчэ ім сабрацца для пустых гутарак аб разброеньні.

Але трэба адзначыць, што гэтая праграма нашла гарачае падтрыманьне ня толькі сярод пралетарыяту і працоўных усяго сьвету, але нават і сярод нацыфісцкіх колаў дробнай буржуазеі. Тыя лісты, якія атрымаў Ліцьвінаў, будучы ў Жэневе, і тыя лісты, якія ён атрымаў вярнуўшыся ў Маскву ад прадстаўнікоў нацыфісцкіх колаў дробнай буржуазеі, гаворыць аб тым, што наша праграма мела свой уплыў, як-бы ні хавалі над усякімі камісіі і падкамісіі прадстаўнікі капіталістычных урадаў.

Наша праграма аб усеагульным разброеньні, наша палітыка, якую мы ўвесь час праводзім, яна, як вам вядома, падтрымліваецца, падтрымлівалася і будзе падтрымліваецца вялічэзнай арміяй працоўных усяго сьвету. Гэта паказалі і водгукі на нашы прапановы на канфэрэнцыі, на якую езьдзіў т. Ліцьвінаў, аб гэтым гаворыць і тое спачуваньне, якое выказаў пралетарыят і працоўныя масы ўсяго сьвету ў часе сьвяткаваньня намі 10-цігодзьдзя існаваньня савецкае ўлады. Так што, грунтуючыся на гэтых падставах, мы гаворым, што наша палітыка, палітыка савецкага ўраду зусім правільная, і мы яе далей будзем праводзіць, ня гледзячы ні на якія перашкоды, што робіцца на гэтым шляху з боку імпэрыялістычных дзяржаў.

Вось агульныя заўвагі аб палітыцы міжнародных узаемаадносін.

Цяпер я навінен каротка спыніцца па паасобных дзяржавах і асабліва на тых, з якімі мы жывём побач, але раней закранём пытаньне аб Кітаі.

Усім вядома, што народ Кітаю прыгнечаны замежнымі імпэрыялістымі, якія па сутнасьці заўладалі ўсёю маемасьцю яго і ўсёй тэрыторыяй Кітаю, —гэты працоўны народ Кітаю рашуча павёў барацьбу супроць уціску з боку замежнага капіталізму. Але кітайская нацыянальная буржуазея, якая спачатку баролася разам з працоўнымі, перайшла ў лягер контр-рэвалюцыі; яна здрадзіла ў барацьбе сваім працоўным масам за вызваленьне Кітаю ад імпэрыялістаў і цалкам пашла на ўтрыманьне замежных імпэрыялістаў.

За апошнія дні, бязумоўна, пад непасрэдным націскам і кіраўніцтвам Англіі ёсьць цэлы шэраг такіх выступленьняў кітайскіх генэралаў, якія закранаюць інтарэсы Савецкага Саюзу. Напрыклад, мы мелі за апошнія дні ў наўднёвым Кітаі такія зьявішчы, як забойства супрацоўнікаў савецкага консульства, разгром консульства і шэрагу гандлёвых устаноў.

Мы бачым, што забіты цэлы шэраг савецкіх грамадзян, савецкіх афіцыйных працаўнікоў, якія працавалі ў нашых паўнамоцных прадстаўніцтвах.

Гэта такое зьявішча, міма якога ня могуць прайсьці ніякі працоўныя масы. Мы ведаем, што з боку саюзнага ўраду прыняты належныя меры. Мы навінны тут сказаць, што працоўныя Беларусі і ўсяго СССР пакідаюць за сабою поўнае права яшчэ раз вярнуцца да гэтага пытаньня, калі прыдзе належны час, і прад'явіць больш моцны рахунак за тыя страты, якія працоўныя Савецкага Саюзу панесьлі, дзякуючы, бязумоўна, непасрэднаму ўдзелу ў гэтай ганебнай справе ангельскага ўраду.

Болей я ня буду застанаўляцца на пытаньні аб Кітаі.

Цяпер некалькі слоў аб Польшчы. Нашы ўзаемаадносіны з Польшчай пасьля вострай напружанасьці, у зьвязку з забойствам тав. Войкава, у апошнія часы сталі больш-менш нармальнымі. Мы гэта можам ужо падкрэсьліць. Праўда, мы не дасягнулі яшчэ тых неабходных умоў, якія яшчэ больш узмацнілі б гэтыя нармальныя ўзаемаадносіны. Напрыклад, мы яшчэ канчаткова не дагаварыліся аб заключэньні з Польшчай дагавораў аб ненападзе і ня прыступілі яшчэ да заключэньня гандлёвага дагавору, але мы навінны тут падкрэсьліць, што гэта здарылася не па нашай віне. Саюзны ўрад неадпакроць заяўляў і заяўляе цяпер, што ён заўсёды імкнецца да таго, каб хутчэй заключыць памянёныя дагаворы з Польшчай, але трэба сказаць, на вялікі жаль, што дасюль гэта справа не па нашай віне пасоўваецца слаба. Мы пакуль што ня бачым з боку польскага ўраду шчырага імкненьня да хутчэйшага заключэньня дагавораў.

Мы навінны таксама адзначыць па сэсіі ЦВК БССР, што мы і ў далейшым будзем стаяць за палітыку ўстанаўленьня самых лепшых узаемаадносін з нашымі суседзямі, але побач з гэтым дазвольце яшчэ адзначыць, што ўсё-ж такі палітыка Польшчы ня раз зацяняла нашыя добрасуседзкія ўзаемаадносіны. Мы зьяўляемся сьведкамі, што польскі ўрад у адносінах да нацменшасьцяў, у прыватнасьці да беларусаў Заходняй Беларусі, стасаваў шэраг прыгнечаньняў, і асабліва жорсткіх рэпрэсій да беларускіх культурна-нацыянальных арганізацый, якія ў рамках, дазволеных польскай канстытуцыяй, баранілі самыя элемэнтарныя правы працоўных беларусаў Заходняй Беларусі.

Зараз мы даведаліся з друку, што ў недалёкай будучыні адбудзецца суд, на якім будуць судзіць да 400 асоб, арыштаваных за абарону культурна-нацыянальных і сацыяльных правоў беларускага насельніцтва.

Трэба сказаць тут, што мы, працоўныя савецкай Беларусі, будзем вельмі пільна сачыць за гэтым працэсам. Мы будзем сачыць за тым, наколькі лёяльна будзе палітыка польскага ўраду ў адносінах да беларускай нацыянальнасьці ў Польшчы і наколькі гэтая палітыка будзе адпавядаць Рыскаму дагавору.

Вось, таварышы, тое, што я лічыў неабходным адзначыць у нашых узаемаадносінах з Польшчай.

Цяпер некалькі слоў аб польска-літоўскім канфлікце. Скажу аб гэтым вельмі каротка. Папершае, што трэба адзначыць, што гэты канфлікт, бязумоўна, мог нацягнуць за сабой небясьпечнасьць у справе міру ва ўсёй Эўропе, асабліва сярод нашых суседзяў заходняй мяжы. Іменна таму савецкі ўрад так рэагаваў на гэты польска-літоўскі канфлікт. Вам усім вядома тая нота, з якой зьвяртаўся ўрад Савецкага Саюзу да некаторых капіталістычных дзяржаў, а таксама да ўраду Польшчы і Літвы. Трэба, таварышы, адзначыць, што гэтая нота, з якой зьвяртаўся ўрад Савецкага Саюзу з прычыны польска-літоўскага канфлікту, бязумоўна, мела ўплыў на зьмяншэньне вострасьці гэтага канфлікту. Праўда, гэта прайшло, як быццам па жаданьні Лігі Нацый, якая як быццам пагадзіла Пілсудзкага з Літвой, але мы не такія наіўныя, каб ня ведалі таго, што Ліга Нацый прымушана была гаварыць аб нейкім замірэньні. Мы таксама ведалі і тое, што ёй карысна супроць прадстаўляць адну другой прыбалтыцкія дзяржавы дзеля таго, каб гэтым самым шкодзіць Савецкаму Саюзу ў мірнай працы яго на сацыялістычным будаўніцтве. Але нота савецкага ўраду сваю справу зрабіла, і ў сучасны момант няма ўжо такой непасрэднай небясьпекі, якая была ў мінулым пры польска-літоўскім канфлікце.

Трэба адзначыць, што ў апошнія дні польскі друк ізноў пачаў гаварыць больш грозным тонам аб Вільні і аб лёсе Літвы.

Савецкі ўрад і ўсе працоўныя ўважліва сачаць за падзеямі на польска-літоўскай мяжы.

Нашы ўзаемаадносіны з Літвой. Мы падпісалі з Літвой дагавор аб ненападзе і гандлёвы дагавор і на гэтых падставах разгортваецца ўся наша праца.

Нашы ўзаемаадносіны з Латвіяй. Мы таксама падпісалі гандлёвы дагавор. Мы спадзяёмся, што ня гледзячы на тое, што ўрад, які падпісаў з намі дагавор, падаў у адстаўку, усё-ж такі новы ўрад Латвіі, маючы на ўвазе інтарэсы Латвіі, будзе праводзіць у жыцьцё гэты гандлёвы дагавор.

Узаемаадносіны з Эстоніяй і Фінляндыяй. Зараз ідуць перагаворы аб заключэньні дагавору аб ненападзе. Трэба адзначыць, што тут справа пасоўваецца вельмі марудна таму, што ўрады гэтых дзяржаў яшчэ знаходзяцца пад вялікім уплывам ангельскага ўраду, і вось таму нашы перагаворы з Фінляндыяй так ціха пасоўваюцца наперад.

Трэба яшчэ адзначыць, што ў апошнія часы ў Эстоніі робяць правакацыю супроць паўнамоцнага прадстаўніцтва СССР. Мы думаем, што гэтая правакацыя ня ўдасца.

Мы навінны адзначыць, што эстонскі ўрад ня досыць энэргічна прыпыняе гэту правакацыю.

Гаворачы аб агульным міжнародным становішчы, у якім мы жывём, трэба адзначыць, што, ня гледзячы на вельмі энэргічную працу з боку Англіі па ўтварэньні антысавецкага блёку, як узброенага нападу, так і фінансава-эканамічнай блёкады—ўраду Савецкага Саюзу ўсе-ж удаецца гэты фронт прарываць у тым ці ў іншым месцы, удаецца разрываць гэты блёк і заключаць з паасобнымі дзяржавамі дагаворы аб ненападзе, дзелавых узаемаадносінах.

Мы навінны, бязумоўна, адзначыць вялікія посьпехі нашага ўраду ў галіне міжнароднай палітыкі, у галіне ажыцьцяўленьня лёзунгаў і прынцыпаў міру.

Але гэта не адзначае, што пагроза вайны, аб якой мы ўвесь час гаворым, паменшылася; з такой-жа энэргіяй і напружанасьцю канцэнтруюць ўрад Англіі паранейшаму вядзе працу па скалачваньні супроць савецкага блёку; небясьпека вайны зараз стаіць таксама востра, і мы заўсёды навінны памятаць гэта.

У сувязі з забойствам тав. Войкава і магчымасьцю канфлікту пімат жыхароў, асабліва гарадзкія абываталі, пачалі скуплівацца і хаваць крупу муку і г. д. чым была парушана нармальная кан'юнктура рынку. У сувязі з гэтым вынікаў ненармальны попыт на прадукты. Кожны з вас можа пацьвердзіць, што былі такія выпадкі, калі сяляне прыяжджалі і куплялі шмат солі і інш. прадуктаў.

Ураду прышлося ўжыць цэлы шэраг эканамічных мерапрыёмстваў, каб ліквідаваць напружанасьць на нашым рынку. Прышлося павялічыць завоз хлеба ў нашы каапэрацыйныя арганізацыі, прышлося павялічыць завоз іншых тавараў і тым самым паказаць, што папершае, мы ня зьбіраемся заяваць, а падругое, што мы ня так бедны, што на заўтрашні дзень ня будзе магчымасьці купіць хлеба.

Ці мела значэньне, ці адбівалася на эканамічным становішчы тая спадчына, якую мы атрымалі ад царскай Расеі? Бязумоўна, адбівалася на працягу ўсяго нашага будаўнічага пэрыяду, бо база для разьвіцьця была вельмі слабая; нам, апроч таго, перашкаджалі акупацыя, бандытызм; мы навінны былі мабілізаваць усю ўвагу і актыўнасьць шырокіх мас для нашага гаспадарчага будаўніцтва. Гэта задача была вельмі цяжкая з прычыны нізкай культурнасьці і ранейшай адсталасьці ўсіх працоўных мас. І таму перад намі адначасова стаяла задача падняцьця культурнасьці працоўных мас, бо толькі такім шляхам мы маглі ўцягнуць усе працоўныя масы ў нашу будаўнічую працу, без чаго не маглі-б мець такіх посьпехаў. Мы навінны былі таксама грунтоўна зьмяніць структуру ўсёй нашай гаспадаркі, гэта значыць, навінны былі залажыць базу сацыялістычнага будаўніцтва, бо ранейшая структура і гаспадарка, якую мы атрымалі ў спадчыну, была капіталістычная. Нам трэба было даць напрамак сельскай гаспадарцы ў бок інтэнсіфікацыі яе, пашырэньня жывёлагадоўлі і павышэньня ўраджаю, разьвіцьця тэхнічных культур і гэт. дал.; нам трэба было павялічыць тэмп прамысловага будаўніцтва, гэта значыць, стаць на шлях індустрыялізацыі.

Нам значна перашкаджала і цяпер яшчэ перашкаджае тое, што ў нашай гаспадарчай працы адсутнічаюць навукова-дасьледчыя матар'ялы. У нас, у Беларусі, раней ня была разьвіта праца па навуковым вывучэньні нашай краіны і ўсіх тых багацьцяў, якія ў вас ёсьць. І таму мы ня толькі не маглі балянсаваць нашу народную гаспадарку, але нам нават цяжка было знайсьці тыя шляхі, тыя энэргетычныя крыніцы ў нашай краіне, тую матар'яльную базу, якая магла даць у хуткім часе больш моцны эканамічны эфэкт. Гэта пытаньне я асабліва падкрэсьліваю, бо яно найважнейшае ва ўсёй нашай працы. Мы, уступаючы ў адбудову нашай народнай гаспадаркі, ня мелі ніякіх навуковых дасьледаў нашай краіны, гэта нам значна перашкоджала ва ўсёй працы. Апроч таго, мы мелі разбуранае мястэчка, якое патрабавала ад ураду БССР значнай увагі, бо там сканцэнтраваны многія сотні і тысячы беднаты, якой трэба было даць падставу для працоўнага жыцьця.

НАШЫ ДАСЯГНЕНЬНІ.

Цяпер дазвольце спыніцца каротка на нашых дасягненьнях, канкрэтных дасягненьнях да сучаснага моманту. Раней усяго трэба адзначыць, што дасягненьні, якія мы маем, маглі быць атрыманы толькі дзякуючы таму, што наша дзяржава кіруецца пралетарыятам. Ні ў водная буржуазная краіне няма такіх дасягненьняў, ні адзін буржуазны ўрад ня можа мець і ня мае такіх посьпехаў, як савецкі ўрад: вазьмеце любую буржуазную краіну. Вы ня знойдзеце там такога шпаркага тэмпу аднаўленьня народнай гаспадаркі, а тым больш пасьля такога зруйнаваньня, якое мы мелі тут на Беларусі. І вось, ня гледзячы на гэтыя цяжкасьці і перашкоды, якія мы мелі, мы ўсё-ж да сучаснага моманту маем ужо вельмі значныя дасягненьні. Канкрэтна, у галіне сельскай гаспадаркі мы маем узрост валавай прадукцыі з 1924-25 гаспадарчага году да 26-27 г. па 44,3 проц., узрост тэхнічных культур на 2 проц., рост і разьвіцьцё працаёмкіх культур на 81,3 проц., узрост і навучэньне жывёлагадоўлі на 30 пр.

У сувязі з сельскай гаспадаркай трэба спыніцца на значэньні жывёлагадоўлі ў нашай народнай гаспадарцы. Ужо ёсьць некалькі пастаноў ураду і партыйных ворганаў аб тым, каб надаць хуткі жывёлагадоўлі сельскай гаспадарцы. Пастанова гэта выклікана тым, што навукова даказана, што толькі шырокае разьвіцьцё жывёлагадоўлі ў сельскай гаспадарцы БССР можа даць вялікі эканамічны эфэкт.

Навуковымі дасьледаваньнямі даказана, што найвялікшы эканамічны эфэкт сельская гаспадарка можа даць тады, калі яна прадукцыю паляводзтва ў значнай частцы пераапрацуе праз апарат жывёліны. Да такога выводу прышлі многія выдатныя эканамісты, якія гавораць, што найбольш прыбытковай крыніцай у сельскай гаспадарцы зьяўляецца жывёла, і асабліва калі разгортваецца і разьвіваецца малочная жывёла, сьвінагадоўля і г.д., і калі паўстараю, усе тыя прадукты, якія селянін зьбірае на полі, будуць пераварваны праз апарат жывёлы. Мы навінны служыць прыкладам культурнага прагрэсу ў гаспадарцы, прыкладам культурнага пераваротy.

Я навінен падкрэсьліць, што мы тут ужо змаглі ў свой час зьвярнуць належную ўвагу на разьвіцьцё савецкіх гаспадарак, змаглі іх, як гавораць, прывесьці ў жылой від, бо раней яны выглядалі вельмі дрэнна, асабліва ў першыя гады пасьля Кастрычнікавай рэвалюцыі. Зараз мы маем бязумоўна ўзмацненьне савецкіх гаспадарак. Напрыклад, валавая прадукцыя вырасла амаль што у 2,5 разы супроць, 25 г., г. з. на 141,4 проц., у лічбах гэта будзе так: валавая прадукцыя складала ў 1925 г. 3,4 міліёны чырв. рублёў, а ў 1927 г. ужо 8,3 міліёны чырв. р., так што валавая прадукцыя расьце.

Калі ўзяць маемасьць савецкіх гаспадарак, то яна таксама вырасла, ці каштоўнасьць яе павялічылася вырасла на 38,6 проц.

Калі ўзяць колькасьць жывёны, то тут таксама ёсьць павялічэньне. Напрыклад, колькасьць коняў павялічылася на 21 проц., рагатая скаціна на 56 проц., у тым ліку гатункавая скаціна, г. з., той рассадник які мае асаблівую каштоўнасьць для нашай сельскай гаспадаркі, складае 25 проц. ад усёй жывёлы, якая знаходзіцца ў савецкіх гаспадараках. Гэтыя нешматлікія лічбы сьведчаць аб тым, што мы ўжо, бязумоўна, сталі на шлях узмацненьня савецкіх гаспадарак, што апошнія ўжо больш трывала становяцца на ногі. Трэба і надалей праводзіць гэту палітыку, трэба разгарнуць іх работу і зьвярнуць асаблівую ўвагу на гэта ўсіх працоўных мас.

Становішча камун і арцеляй.

Палажэньне аб камунах і арцелях таксама нас павінна цікавіць.

Калі мы гаворым аб уздыме с. г. наогул, то трэба яшчэ паставіць пытаньне: а куды расьце сельская гаспадарка? Як у ёй разгортваецца рост аграмаджанага сэктару. Гэтае пытаньне мы ніколі не павінны забываць. Аграмаджаным сэктарам пакуль што зьяўляюцца савецкія гаспадаркі, камуны, арцелі, калектыўныя гаспадаркі і яшчэ каапэрацыя, у першую чаргу сельска-гаспадарчая. Усіх арцеляў і камунаў ёсьць па Беларусі—411.

Валавая прадукцыя іх гэткая: у 1924-25 г. яна складала 3503000 р., а ў 1926-27 г. ужо 4696000 р., гэта значыць, яна павялічылася на 34 пр. Значыцца аграмаджаны сэктар у сваім аб'ёме таксама расьце.

Трэба адзначыць, што процант ліку ўдзельнікаў калектываў таксама расьце, яны вырасьлі на 26 пр., прыкладна такія-ж лічбы росту па ўсіх паасобных галінах камун і арцеляў на жывёле, па таварнасьці. Трэба, каб у далейшым зварачаць асаблівую ўвагу на ўзмацненьне і разьвіцьцё калектыўных гаспадарак.

Земляўпарадкаваньне працоўных яўрэяў.

Некалькі слоў адносна надзяленьня працоўных яўрэяў зямлёй. Калі я адзначаў тыя цяжкасьці і перашкоды, якія адбіваліся на нашай будаўнічай рабоце, я разам з гэтым адзначаў разбуранасьць нашых мястэчак. Ці працаваў урад над тым, каб палепшыць іх становішча? Так, працаваў. Да гэтага часу яўрэяў-земляробаў ужо налічваецца больш чым 7000 сем'яў, прычым яны атрымалі зямлю для працоўнага карыстаньня ў колькасьці 53900 гэктараў. Як бачыце, мы правялі вельмі вялікую працу па землянадзяленьню працоўнага яўрэйства.

Тут трэба падкрэсьліць, што ня толькі гэты факт мае значэньне. Асабліва мае значэньне тое, што ўраду ўдалося яўрэйства мястачак пасадзіць на вытворчую працу. Вось у чым самы галоўны сэнс.

Да рэвалюцыі яўрэі больш усяго прымалі ўдзел у гандлёвых справах,

(ПРАЦЯГ НА 1 СТАР).

Становішча і далейшыя пэрспэктывы разьвіцьця народнае гаспадаркі БССР.

Працяг дакладу Старшыні Савету Народных Камісараў БССР тав. Галадзеда.

значны процант яўрэйскага насельніцтва ня быў уцягнут у вытворчую работу. Дзякуючы правільнай палітыцы партыі, да гэта часу нам удалося дасягнуць таго, што мы ўцягнулі больш чым 7000 сем'яў у сельскую гаспадарку. Трэба адзначыць яшчэ і тое, што іх земляўпарадкаваньне праходзіць больш усяго ў калектыўных формах. Мы маем у ліку земляўпарадкаваных яўрэяў—169 калхозаў з 400.

Мы павінны адзначыць, што ўсе нашы адпаведныя органы, у прыватнасьці НКзем, правільна зрабілі, што сталі на шлях стварэньня арцеляў. Гэта ёсьць адна з заслуг земляробства, якую трэба адзначыць.

Акрамя таго, мы ня так даўно паставілі пытаньне аб больш грунтоўным вырашэньні праблемы мястэчак. Многія таварышы чыталі аб тэй пастанове, якая была прынята ўрадам па гаспадарчым упарадкаваньні мястэчак. Тут мы ставім пытаньне шырэй—ня толькі яўрэйскага насельніцтва, але наогул жыхароў мястэчак. Мы да гэтуль займаліся вёскай, займаліся прамысловым будаўніцтвам, а ў справе ўпарадкаваньня мястэчак, якія могуць даволі шырока разгарнуць работу па разьвіцьцю гароднічтва і садавіны, мы яшчэ ня многа зрабілі. Таму Савет Народных Камісараў нядаўна прыняў сэцыяльную пастанову.

Далей ідуць тыя прынцыпы, на падставе якіх павінен быць складзен плян. Мне вядома, што т. Карклін, як старшыня Дзяржплану, будзе канкрэтна гаварыць з старшынямі АВК аб тым, як гэтыя пляны распрацоўваць; тэрмін ужо падыходзіць і хутка пляны павінны быць прадстаўлены ў СНК. Гэта гаворыць аб тым, што савецкі ўрад, побач з агульнай працай па гаспадарчым будаўніцтве, па паляпшаньню дабрабыту ўсіх працоўных, вырашае і гэта пытаньне, пытаньне аб гаспадарчым упарадкаваньні мястэчак.

Трэба, таварышы, адзначыць, што такія мерапрыемствы з боку савецкага ўраду ня вельмі падабаюцца буржуазным урадам. Мне, таварышы, нядаўна паказалі, што ў зьвязку з тым, што хутка пачынаюцца ў Польшчы перавыбары, у Львове (трэба палагаць з ведама ўраду) быў склікан зьезд рабінаў, які займаўся пытаньнем аб лёсе яўрэйскай нацыі. Там выступілі з прывітаньнем львоўскі ваявода, прадстаўнік ураду і іншыя. І вось характэрна: львоўскі ваявода гаворыць: „Я ўпэўнен у тым, што вы будзеце шанаваць і падтрымліваць наш урад і ўпэўнен таксама ў тым, што пасьля гэтага зьезду мы яшчэ зможам зрабіць некалькі нарад і зьездаў для таго, каб гаварыць аб лёсе яўрэйскай нацыі". Я ў гэтым таксама ўпэўнен, што яны будуць яшчэ некалькі разоў зьяжджацца і гаварыць.

З гэтага мы бачым, што на ўсе нашыя мерапрыемствы, якія савецкі ўрад праводзіць, як мерапрыемствы, зусім новыя ў гісторыі, зусім ня віданыя, як мерапрыемствы, якія не праводзіла ніводная буржуазная дзяржава, на гэтыя мерапрыемствы ёсьць і водгукі, у выглядзе такіх зьездаў. Праўда, гэты зьезд рабінаў дагэтуль яшчэ ня прынаў ніякай пастановы, бо разышліся након фармуліроўкі пастановы. З аднаго боку—урадавая група, а з другога боку—якая тось «лібэральная» частка, якая хоча сказаць што-небудзь „радыкальнае". Быў такі выпадак: яны сабраліся ў адным памяшканьні, памаліліся богу і давай абгаварваць праэкт рэзалюцыі, а паліцыя прышла і абвясьціла іх сход незаконным. Гэты прыклад адзначае тое, што тая праца, якая праводзілася дагэтуль савецкім урадам па прыстасаваньні яўрэйскага працоўнага насельніцтва да вытворчай працы, ёсьць гістарычна важная, якая сьведчыць аб тым, што мы ня толькі гаворым, але і робім.

ПЫТАНЬНІ ГАСПАДАРЧАГА БУДАЎНІЦТВА.

Што мы, таварышы, маем у галіне прамысловасьці ў якасьці дасягненьняў? Нечага і гаворыць аб тым, што ў час вайны асноўны капітал прамысловасьці і ўдзельная вага апошняй у агульна-гаспадарчым звароце былі зусім нікчэмныя, бо ніякая частка гаспадаркі так не разбурылася ў часе ім нарыялістычнай і грамадзянскай вайны, як прамысловасьць. У некаторых мясцох вытворчасьць яе складала толькі 15—20 проц. той вытворчасьці, якая была нават да вайны. А калі ўзяць тыя лічбы, якія ў нас ёсьць і з усіх бакоў правераныя, то мы атрымаем наступны малюнак. Узрост валавой прадукцыі па прамысловасьці мы маем з 1924-25 г. да 1926-27 г. на— 85 проц.

Укладаньні ў прамысловасьць за мінулы час выглядалі наступным чынам: за тры гады мы ўклалі ў прамысловасьць 27.468 тысяч руб., а на гадох: у 1924-25 г. капітальныя ўкладаньні ў прамысловасьць складалі 3.797 тыс., а ў 1926-27 г.—ужо 15.110 тыс. Як бачыце, мы маем буйны ўзрост.

Што мы адраманталі за гэтыя гады і што новага пабудавалі? Каб многа не затрымліваць вашай увагі, я толькі пералічу тут тыя прадпрыемствы, якія мелі самы буйны і значны рамонт. Напрыклад, у шкляной прамысловасьці мы панова абсталявалі шкляныя заводы «Октябрь» і «Ильич».

І гэтым самым мы пазбавілі іх вытворчасьць. Па металёапрацоўваючай прамысловасьці да сучаснага часу пераабсталявалі завод с-г. машын у Віцебску, шляхам пабудовы новых пэхаў, а таксама пабудавалі новы ліцейны цэх на заводзе «Энэргія», мханізавалі працэсы вытворчасьці ў кравецкай прамысловасьці, панчошна-трыкатажная фабрыка пашырана шляхам пабудовы новага 3-га паверху; па запалачнай прамысловасьці мы канчаткова дабудавалі запалачную фабрыку ў Рэчыцы і таксама хутка думаем скончыць у 1928-29 годзе пабудову новай запалачнай фабрыкі ў Барысаве «Чырвоная Бярэзіна». Гэта будзе вялікае прадпрыемства, якое ў некалькі разоў павялічыць вытворчасьць «Чырвонай Бярэзіны». Палепшана таксама вытворчасьць дражджэй на дражджавых заводах: «Пралетары» і «Чырвоная Зара» ў Менску, дзе зроблены вельмі значны капітальны рамонт. Апроч таго, мы хутка павінны скончыць пабудову вельмі значнага прадпрыемства—камбінату ў Бабруйску (дасапільна-фанэрны камбінат. 90 проц. гэтай пабудовы ўжо выканана). Вялікая праца зроблена на папяровай ф-цы ў Дабружы, якая на 80 проц., як кажуць спэцыялісты, павялічыць сваю вытворчасьць, ня гледзячы на то, што гэта наогул вялікая ф-ка, якая дае шмат прадукцыі.

Я ня буду затрымліваць вашай увагі па іншых працах, якія зроблены на працягу гэтага часу.

Зараз удзельная вага прамысловасьці мае такі выгляд: з 11,9 проц. у 1924-25 г. яна падняласа да 17 пр. Як бачыце, курс на праводзеньне індустрыялізацыі мы ажыцьцяўляем цалкам. За гэты час мы маем значны прырост рабочых, які складае 49,4 проц., прычым гэта толькі ў цэнзавай прамысловасьці, ня ўлічваючы будаўнічых рабочых, якіх па абшарах Беларусі ёсьць каля 18 тыс., а таксама часовых рабочых, рабочых на торфараспрацоўках і г. д.

Заработная плата за гэты час павялічылася на 34,8 проц.

Вельмі характэрна прасачыць за тым, як расьлі асноўныя капіталы нашай прамысловасьці і ў паасобных галінах гаспадаркі, гэта значыць, як расла энэргетычная і матар'яльная база ў нашай народнай гаспадарцы, ў прыватнасьці ў прамысловасьці. Наступныя лічбы сьведчаць аб гэтым узросьце. У 1925 г. асноўныя капіталы ў прамысловасьці складалі 27.400 т. руб., а ў 1927-28 г. яны ўжо падняліся да 41.400 тысяч, г. зн. што асноўныя капіталы ў нашай прамысловасьці павялічыліся амаль што ў 2 разы. Мы лічым, што гэта вельмі значныя дасягненьні.

Таксама ў мясцовай прамысловасьці асноўныя капіталы з 2.400 тыс. павялічыліся да 4.800 тыс. р., г. зн. у два разы.

А вось напрыклад, што мы маем на электрычнай прамысловасьці: у 1910 годзе ўсяго было 4 элект. станцыі, з агульнай магутнасьцю ў 1700 кілёват. У 1920 г. іменна за час нашай працы, за час працы савецкага ўраду мы ўжо маем 10 электр. станцый, з агульнай магутнасьцю ў 1900 кілёват.

Наогул лічбы гэтыя выглядаюць так: скажам, у 1925 г. агульная магутнасьць электрычнай энэргіі складала 3450 кілёват, а зараз, у гэты годзе складае 7950, больш, чым у два разы мы павялічылі энэргетычную базу ў якасьці электрычнай энэргіі.

Чаму я адзначаю гэтыя моманты? Таму што яны зьяўляюцца асновай, на якой будзе разгортвацца наша прамысловасьць. Уся наша гаспадарка будзе пасоўвацца пасьпяхоўна па шляху разьвіцьця толькі тады, калі пад ёй будзе грунтоўная энэргетычная база, калі яна будзе базіравацца на цьвёрдым матар'яльным грунце, калі мы скарыстаем усе энэргетычныя рэсурсы якія ў нас ёсьць. Бяз гэтага мы ня можам шпаркім тэмпам разьвіваць нашу народную гаспадарку.

У галіне таваразвароту мы да гэтага часу маем такое становішча: узрост таваразвароту павялічыўся на 60 пр., прычым аграмаджаны сэктар тут займае ўсё большае месца: ён з 64 проц. у 1924 г. павялічыўся на 69,3 проц.

Вось дасягненьні ў галіне гаспадаркі.

Значэньне навукова-дасьледчай працы для нашага будаўніцтва.

Я зазначаў аб важным моманце ў нашай працы, аб значэньні навукова-дасьледчай працы для далейшага разьвіцьця нашага будаўніцтва. Дазвольце зазначыць, што ў гэтай галіне мы маем бязумоўныя дасягненьні. Яны заключаюцца ў тым, што мы да гэтага часу змаглі пабудаваць ужо 2 навукова-дасьледчыя установы, закліканыя цалкам абслугоўваць запатрабаваньні народнае гаспадаркі.

Напрыклад, мы ўжо ў гэтым годзе канчаткова разгортваем працу Навукова-Дасьледчага Інстытуту сельскай і лясной гаспадаркі імя Леніна, які ў вас ужо ўгрунтаваўся, і мы думаем, што ён будзе цалкам адпавядаць тым заданьням, якія на яго ўскладзены.

Мы таксама ў гэтым годзе арганізавалі ў складзе Інстытуту Беларускай Культуры спэцыяльны Геолёгічны Інстытут, які таксама цалкам будзе працаваць над дасьледваньнем матар'яльнай энэргетычнай базы. Інбелькульт таксама разгарнуў у шмат якіх галінах працу па дасьледваньню нашай краіны, па вывучэньню яе матар'яльных рэсурсаў і рэсурсаў сырцу, якія ёсьць у нашай гаспадарцы. Досыць вялікая праца праведена Вышэйшым Саветам Народнай Гаспадаркі, які зьвязваў яе з працай нашых навуковых установаў. Я падам тут адзін прыклад, які паказвае, што справа вывучэньня нашай краіны заслугоўвае вельмі значнай увагі. Папярэднія матар'ялы, якія атрыманы камісіяй ВСНГ, гавораць аб тым, што мы маем у Беларусі, напрыклад, вялічэзныя залежы цэмантнага мэргелю, у такой колькасьці, якой хопіць на 100 гадоў. І гэта толькі ў адным вучастку Беларусі. Гэты прыклад сьведчыць аб тых вялікіх багацьцях, якія ў нас ёсьць і аб якіх мы раней нічога ня ведалі. Альбо такая справа, як выкарыстоўваньне фасфарыту: у Калінінскай акрузе знойдзены вельмі багатыя залежы фасфарытаў, якія могуць быць вычарпаны адным заводам значнай магутнасьці толькі праз 20 30 год. Вялічэзныя залежы фасфарытаў знойдзены ў Мсьціслаўскім раёне, якіх хопіць для вырабу на сотні гадоў. Ня гледзячы на тое, што мы яшчэ мала працавалі ў галіне дасьледаў, мы пакуль што саматужным шляхам ужо нашчупываем тыя рэсурсы, якія ёсьць у нашай краіне. Альбо вазьмеце вапнякі: у нас знойдзена вельмі значная колькасьць вапнякоў, якія маюць у сабе вялікі процант магнэзіі,—гэтага вельмі каштоўнага элемэнту. Гэтай-ж самая камісія ВСНГ у сваім дакладзе гаворыць: «Значная колькасьць знойдзена ў раёне станцыі Дараганава даланіту, асаблівага роду вапняку, багатага магнэзіяй. Паказаныя выкапні зьяўляюцца асаблівай каштоўнасьцю для выпрацоўкі паветраных і гідраўлічных вапнякоў, агнятрывалага матар'ялу для мэталёапрацоўчай прамысловасьці і хімічнага прадукту магнэзіі ў злучэньні з азбестам, як матар'ялам для тэрма-ізяляцыі». Гэта ўсё каштоўнейшыя залежы, аб якіх мы да гэтага часу ня ведалі, а гэта ўсё датычыць да сырцовай базы, на падставе якой мы павінны разгортваць будаўніцтва нашай народнай гаспадаркі.

Я ня буду спыняцца на паасобных момантах працы ў галіне дасьледваньня, але падкрэсьліваю, **што гэтай справе мы павінны аддаць шмат увагі для таго, каб скарыстаць усе наш я магчымасьці**, усе тыя залежы, якія існуюць у нашай уласнай краіне. Трэба на гэтую навукова-дасьледчую справу зьвярнуць значную ўвагу працоўных мас.

Шляхавае будаўніцтва.

Я павінен адзначыць, што цяпер у нашай Беларусі праводзіцца вельмі вялікая праца на аднаўленьню шляхоў. Ніколі раней чыгуначнае будаўніцтва так шырока і шпарка не разгортвалася, як у нас. Трэба адзначыць, што ў гэтым годзе нам удалося дабіцца ў Саюзным урадзе, каб уключыць гэтую працу ў дзяржаўны бюджэт, прычым бярэцца такі напрамак, каб на працягу 2-3 гадоў скончыць гэтыя шляхі. Трэба адзначыць, што мы значную працу зрабілі ў галіне разьвіцьця таксама нашых рачных шляхоў. Вялікая праца, напрыклад, зроблена ў Гомелі на пабудове прыстані. Гэтая прыстань мае вялікае гаспадарчае значэньне для ўсёй Беларусі, бо, дзякуючы ёй, мы зможам скарыстаць усю нашу рачную сыстэму Намі ўзьнята пытаньне аб аднаўленьні Бярэзінскай сыстэмы. Адначасна я зазначаю, што ў зьвязку з працамі па будаўніцтву сялянства мае значныя заработкі. На працы па шашы, на пабудове шляхоў, на лесараспрацоўках—сялянства ў Беларусі зарабляе ў год больш 13 млн. руб. на адной Беларусі. Я гэта асабліва падкрэсьліваю таму, што пабочны заработак ў селяніна зараз складае значную долю яго даходаў, і калі мы гаворым аб матар'яльным становішчы вёскі, мы ня можам выкінуць гэты факт, які мае значны ўплыў на сялянскае жыцьцё і яго гаспадарку.

ЧЛЕНЫ ЦВК БССР.

Зьлева направа: т. Паўлаў—сялянін Горацкага р.; т. Кажэўнікава Агапа—работніца фабрыкі „Герой труда"; т. Талалай Іцка—земляроб Магілеўскага р.; т. Кратовіч Алеся—жанчына-старшыня Лоўскага с.-с., Гомельскай акругі.

Я яшчэ ў некалькіх словах адзначу тое, што мы за пязначны параўнаўча час правялі вялікую працу на зрашчываньню з БССР новай часткі Беларусі,—Гомельшчыны, якая была ў 1926 годзе далучана да БССР. Яшчэ на УШ-м Зьезьдзе Саветаў БССР мы адзначылі, што ўрад павінен прыняць шэраг мерапрыемстваў для таго, каб з боку гаспадарчага і палітычнага хутчэй зрасьціць Гомельшчыну з усёй БССР. І мы павінны адзначыць, што ў гэтай працы мы маем ужо вялікія дасягненьні; сувязь Гомельшчыны з БССР цалкам праведзена, і Гомель цяпер адыгрывае важнейшую ролю ў справе нашага гаспадарчага разьвіцьця.

ЧАМУ МЫ МАЕМ ТАКІЯ ПОСЬПЕХІ?

Вось у кароткіх рысах тыя пасьпяхоўныя вынікі, якія мы маем да сучаснага моманту ў галіне разьвіцьця народнай гаспадаркі. Мы дасягнулі гэтых посьпехаў таму, што здолелі мабілізаваць увагу шырокіх колаў рабочых і сялян, а таксама працоўнай інтэлігенцыі, спэцыялістаў на справе аднаўленьня і пабудовы народнай гаспадаркі. Мы здолелі ўзьняць актыўнасьць шырокіх народных мас, бяз гэтага мы такіх пасьпяхоўных вынікаў ня мелі-б. Цяпер усе масы працуюць над адбудовай нашай гаспадаркі і культуры, можа толькі дзе небудзь у куточку і асталіся такія адзінкі, каторыя яшчэ хістаюцца. Іх амаль што зусім няма, а калі і ёсьць, дык гэтыя адзінкі не адыгрываюць ніякай ролі.

Я павінен адзначыць, што ўся рабочая кляса і ўся працоўная маса сялянства, а таксама ўся працоўная інтэлігенцыя і спэцыялісты,—усе шчыра працуюць над адбудовай нашай гаспадаркі. Гэта асноўны момант, які зьяўляецца галоўнай прычынай тых посьпехаў, якія мы маем.

Дасягнутыя намі посьпехі залежаць яшчэ і ад таго, што мы знаходзімся ў Саюзе Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, які нам дапамагаў будаваньню культуры і гаспадаркі ў нашай адсталай у мінулым краіне. Напрыклад, у гэтым годзе мы ад СССР будзем мець значную датацыю, нават і на дзяржаўным бюджэце. Наш бюджэт БССР дэфіцытны. У нас крыніцы прыбыткаў вельмі слабыя, бо нашая гаспадарка ня мела такой моцы, пры якой мы маглі-б збалянсаваць бесзэфіцытны бюджэт. Мы ў якасьці дотацыі па дзяржаўным бюджэце і ў якасьці крэдытаў атрымаем вялікую дапамогу ад Саюзу на адбудову нашай краіны. Аб гэтым больш падрабязна скажа т. Мікуліч у сваім дакладзе.

Мы маем посьпехі ў нашым будаўніцтве таму, што ў нас дыктатура пралетарыяту, што ў нас дзяржаваю кіруюць рабочыя і сяляне. Вось, памойму, тыя прычыны, якія ляжаць у аснове нашага пасьпяхоўнага прасоўваньня на шляху разьвіцьця і ўзмацненьня народнай гаспадаркі і культуры.

Што мы зрабілі для ўзмацненьня матар'яльнага дабрабыту бядняцкіх мас? Гэтае пытаньне к канцу 10-цігодзьдзя нашай работы трэба паставіць.

Я тут доўга на гэтым затрымліваць ня буду, але лічу неабходным даць тыя лічбы, якія гавораць, што савецкім урадам зроблена вялікая праца па матар'яльным узмацненьні ўсіх бядняцкіх мас вёскі, мястэчка і гораду, бо гэта была адна з галоўных задач, якія стаялі перад урадам і якую мы павінны былі выканаць, дапамагаючы беднаце стаць на ногі. Вось лічбы, якія гавораць аб нашай працы ў гэтай галіне: з 25 па 27 г. надзелена зямлёй 12.228 сялян, бядняцкіх двароў—54,819, прычым дзяржаваю на гэтую работу адпушчана сродкаў 484,5 тысяч рублёў.

Далей, па тыя работы, якія праводзіліся ў якасьці ўпутрысяленнага будаўніцтва беднаты, выдадзена 423.000р., а ўсяго па абодвых відах выдадзена каля 1.000.000 р. беднаце на зямляўпарадкаваньне, акрамя зямлі, якую прырэзалі і далі з дзяржаўнага фонду.

Далей, у зьвязку з земляўпарадкаваньнем, было адпушчана дармовага лесу на пабудову хат на суму 2.559.000 руб. Сюды ўваходзіць і льготны водпуск лесу. За 24-25 г. вызвалена ад сельска-гаспадарчага падатку на суму 1.163.000 руб., а ўсяго вызвалена за тры гады беднаты ад падатку на суму 2.229.000 р. У мінулым годзе—процант беднаты вызваленай ад с.-г. падатку складаў 26 проц., а сёлета—39,3 проц. Такім чынам 39,3 проц. сялянска-бядняцкіх гаспадарак зусім не плацуць падатковай павіннасьці перад дзяржавай і гэтым самым атрымліваюць дапамогу ад дзяржавы.

Акрамя таго, быў прынят цэлы шэраг мерапрыемстваў па стварэньні спэцыяльнага каапэрацыйнага фонду беднаце, за лік якой уносіліся паі для той беднаты, якая не магла сваімі сіламі ўнесьці ўступны пай у каапэрацыю. Быў утворан таксама спэцыяльны крэдытны фонд беднаце яшчэ ў 1925 г. у колькасьці да 700.000 р., ня гледзячы на тое, што дзярж. с.-г. банк усю сваю работу ў галіне крэдытаваньня на разьвіцьцё сельскай гаспадаркі прыстасоўвае да запатрабаваньняў, да здавальненьня бядняцкіх колаў вёскі. У мінулым годзе с.-г. банкам беднаце было выдана доўгатэрміновага крэдыту на суму 900.000 р. Калі скласьці ўсе гэтыя лічбы, якія ідуць у якасьці дзяржаўнай дапамогі бядняцкай масе, дык яны будуць складаць вельмі значную суму ў некалькі мільёнаў рублёў, якія ўрадам былі адпушчаны для ўзмацненьня матар'яльнага становішча беднаты. Мы лічым, што тая задача, якая ў гэтай галіне працы перад урадам стаяла, выконваецца ня дрэнна. У нас таксама многа каапэравана беднаты да гэтага часу як у галіне сельска-гаспадарчай каапэрацыі, гэтак і спажывецкай.

Мы маем бязумоўна пераваўку асобных груп у вёсцы ў залежнасьці ад матар'яльнага становішча. Мы маем такое зьявішча, калі бядняцкая група, якая ўчора была бяднацкай, сёньня пераходзіць бліжэй да серадняцкай, дзякуючы той дапамозе, якую праводзіць урад, якую праводзяць усе выканаўчыя камітэты. Значную частку, некалькі сотняў тысяч беднаты мы выцягнулі з таго беднага становішча, у якім яна жыла як да рэвалюцыі, так і спачатку рэвалюцыйнага перыяду.

ПЭРСПЭКТЫВЫ РАЗЬВІЦЬЦЯ ГАСПАДАРКІ БССР.

Цяпер дазвольце мне спыніцца на тых пэрспэктывах разьвіцьця народнай гаспадаркі БССР, якія мы памячаем на бліжэйшыя часы. Што новага ў сучасны момант у нашай народнай гаспадарцы? Мы ведаем, што адбудоўчы пэрыяд у народнай гаспадарцы скончан, і мы ўзышлі ў пэрыяд рэканструкцыі і перабудовы ўсёй нашай гаспадаркі на новай вышэйшай тэхнічнай базе. Гэта галоўны момант, які павінен вызначыць тыя задачы, якія перад намі стаяць. Але гэтая задача рэканструкцыі і перабудовы ўсёй нашай гаспадаркі на новай вышэйшай тэхнічнай базе вельмі складаная і цяжкая задача. Яна патрабуе, папершае, самай найвялікшай пляновасьці ва ўсёй нашай працы. І, падругое, мы павінны быць папяраджаны ў тым, што тэмп разьвіцьця народнай гаспадаркі будзе значна меншы, чым ён быў у адбудоўчы пэрыяд. Аб гэтым усім трэба памятаваць, бо высокага тэмпу, які мы мелі за апошнія часы ў разьвіцьці ўсёй нашай працы, мы ў бліжэйшыя часы мець ня будзем. Прычын, чаму гэта так, я выкладаць ня буду, бо яны таварышам вядомы: тыя сродкі, якія мы будзем мець у гэтым пэрыядзе, прызначаюцца на капітальныя ўкладаньні. Гэта значыць, што мы гэтыя сродкі будзем укладаць на некалькі год. Таму мы ня будзем мець магчымасьці на працягу бліжэйшых часоў павялічваць нашы зваротныя капіталы ў такім ліку, у якім мы павялічвалі да гэтага часу і таго эканамічнага эфэкту, які мы мелі-б, калі б гэтыя сродкі былі кінуты на павялічэньне зваротных капіталаў. Гэта галоўная прычына.

Цяпер спынюся на галоўных момантах пяцігадовага пляну. Дзяржплан БССР правёў вялікую працу па складаньне пяцігодкі. Трэба адначасова адзначыць, што гэтая праца выканана нашымі пляновымі органамі добра. Асабліва я адзначаю вялікую ролю ў гэтай працы, якую адыгралі нашыя спэцыялісты, працаваўшыя над распрацоўкай паасобных галін народнай гаспадаркі.

Я спынюся на ўсёй пяцігодцы нямнога, пастараюся, як мага менш прыводзіць лічбаў, бо гэта зойме ў мяне шмат часу.

Якія галоўныя прынцыпы мы прынялі пры складаньні пяцігодкі? Папершае, у пяцігодцы мы ўзялі курс на індустрыялізацыю нашай краіны, гэта значыць, па найбольш шпаркае разьвіцьцё прамысловасьці, маючы на ўвазе, што прамысловасьць дагэтуль мае яшчэ пязначную ролю ў нашай гаспадарцы. Другі прынцып—гэта вырашэньне праблемы па змаганьню з аграрнай перанасельнасьцю беларускай вёскі. У гэты прынцып мы ўкладаем такія канкрэтныя задачы: інтэнсыфікацыя сельскай гаспадаркі, разьвіцьцё жывёлагадоўлі, разьвіцьцё працаёмкіх культур і галоўная цэнтральная задача—гэта праца па мэліярацыі. Мэліярацыя нашых балот павінна грунтоўна зьмяніць ня толькі эканоміку вёскі, а і тое становішча, якое ёсьць у нас сёньня з перанасельнасьцю беларускай вёскі. Далей, як мы ставім пры складаньні пяцігодкі прынцыповае пытаньне, вырашэньне праблемы з беспрацоўем.

Мы з беспрацоўем маем такое становішча: у нас беспрацоўе ў горадзе расьце, перанасельнасьць у вёсцы вельмі вялікая і ў той жа час мы ўвозім рабочых па паасобных галінах нашай працы з-за межаў Беларусі. Бязумоўна—перад кожным работнікам, як нізавым, гэтак і цэнтральным, павінна стаць пытаньне, чаму гэта так выходзіць: нашы лішнія працоўныя рукі з Беларусі ідуць на шахты, ідуць за межы Беларусі шукаць сабе працы, а мы ў той жа час увозім працаўнікоў па паасобных галінах нашага будаўніцтва з-за межаў Беларусі. Гэта здарылася таму, што часка ізбытковага насельніцтва Беларусі непрыстасавана да выкананьня тых задач капіталістычных мерапрыемстваў, якія мы праводзім у сябе ўнутры нашае дзяржавы. Вось, напрыклад, перад намі стаіць вялікая праблема торфараспрацовак. Торф на Беларусі павінен адыгрываць самую сур'ёзную ролю ў стварэньні энэргетычнай базы, на падставе якой павінна расьці наша гаспадарка; і вось на гэтыя работы па торфараспрацоўках мы правозім людзей з пазамежаў Беларусі, бо нашае насельніцтва не прыстасавана да выкананьня гэтых галоўных па аб'ёму вялікіх задач. Таму я стаўлю пытаньне так: мы павінны ў бліжэйшыя гады, цяпер жа не адкладваючы ў доўгую скрынку, вырашыць пытаньне прыстасаваньня ізбытковага насельніцтва да выкананьня гэтых работ на капітальных мерапрыемствах, якія мы тут-жа ў нас праводзім, на якія мы трацім мільёны грошай; практычна можна вырашыць задачу так: скажам, можна ўзяць некалькі інструктароў у Бранскай, ці Калужскай губ., пасадзіць на некалькі год у нас і заставіць іх вывучыць нашае ізбытковае насельніцтва, каб яно магло потым працаваць само на торфараспрацоўках.

Акрамя таго, вазьміце працу па мэліярацыі—як ня соромна нам, а факт астаецца фактам: мы прывозім у межы Беларусі тых людзей, якія павінны капаць канавы, у той час, калі ў нас некуды дзяваць свае працоўныя рукі. У чым тут справа? Аказваецца, што выкананьне работ па мэліярацыі нашае насельніцтва таксама ня можа праводзіць, яно можа лапаткай падкінуць зямлю, якая выкінута з канавы, але капаць канавы па ўсіх мэліяратыйных правілах яно ня ўмее Работа па мэліярацыі вельмі трудаёмкая, вельмі капітальная, яна ўсё больш і больш будзе расьці. Трэба каб мы гэтую работу выконвалі сваімі працоўнымі рэсурсамі, значыць, стаіць пытаньне аб прыстасаваньні лішніх рабочых рук да запатрабаваньняў нашае гаспадаркі, для правядзеньня торфараспрацовак, да мэліярацыі і г. д. Гэтае пытаньне перад намі стаіць ва ўвесь свой рост. Мы павінны і на мясцох і ў цэнтры прыняць цэлы шэраг мерапрыемстваў, каб аслабіць тое беспрацоўе, якое ў нас ёсьць, скарыстаўшы лішнія рукі ў нас тут-жа дома і зьменшыць прывоз рабочых рук з па-замежаў Беларусі.

Чым мы цяпер займаемся? Напрыклад, Менская электрастанцыя працуе на торфу—запытайце Яцкевіча, чыімі рабочымі рукамі ён распрацоўвае торф. (Яцкевіч: —калускімі).

Тут нам саромна, самі маем армію беспрацоўных, вялікую цеснату ў вёсцы, вялікае беспрацоўе і перанасельнасьць вёскі, і адначасова прывозім калускіх рабочых.

Тут, праўда, мы маем яшчэ такія выпадкі, калі асобныя колы беспрацоўных ня хочуць працаваць па мэліярацыі і торфараспрацоўках. Былі такія выпадкі, калі мы з Менску, з біржы працы бралі беспрацоўных для торфараспрацовак на Менскую электрастанцыю, а яны адмовіліся працаваць. Тут можа быць нам трэба мець на ўвазе, што некаторыя адміністрацыйныя меры прыдзецца прыняць да тых беспрацоўных, якія лічуць, што лепш ім атрымліваць па 15-20 р. у месяц па беспрацоўі, чым працаваць. Калі мы будзем распрацоўваць балянс працы, а мы павінны яго дасканала распрацаваць, мы павінны абмеркаваць і гэтае зьявішча.

Чацьвёрты прынцып, які быў пакладзен пры складаньні 5-цігодкі—гэта прынцып вырашэньня праблем культурнага ўздыму і культурнага разьвіцьця ўсіх народных мас і ўсяе нашае краіны ў зьвязку з задачай па індустрыялізацыі. Прынцыпова гэтае пытаньне стаіць так, што нельга адарваць задачу па ўзьняцьцю культурнасьці працоўных мас і па ўзьняцьцю наогул культурнага будаўніцтва ў нашай Беларусі, ад задач па індустрыялізацыі. **Задача культурнага будаўніцтва** ёсьць непадзельная частка задачы па індустрыялізацыі. Мы гэта ў пяцігодцы прадугледзілі.

Пяты прынцып пабудовы пяцігодкі—гэта палепшаньне матар'яльнага дабрабыту працоўных мас.

Шосты прынцып таксама адыгрывае рашучую ролю,—гэта разьвіцьцё тэхнічнай і энэргетычнай базы народнай гаспадаркі БССР. Тут справа вось у чым: без адшуканьня энэргетычных рэсурсаў мы ня можам думаць аб сур'ёзным будаўніцтве; без павышэньня тэхнікі ў нашай народнай гаспадарцы мы ня выканаем тых задач, якія ставяцца па індустрыялізацыі краіны. Толькі на высока-тэхнічнай базе толькі з грунтоўнымі энэргэтычнымі падставамі мы можам думаць аб сур'ёзным разьвіцьці нашае народнае гаспадаркі. Калі ня будзем падымаць тэхніку, дык гэта азначае, што мы ня выканаем сацыялістычнага будаўніцтва, бо капіталісты ў тэхніцы нас могуць перагнаць, і тагды будуць нас біць на гаспадарчым фронце. Мы павінны працаваць вельмі сур'ёзна над падвышэньнем тэхнічнага ўзроўню ва ўсёй нашай народнай гаспадарцы.

Вось тыя шэсьць прынцыпаў, якія паложаны ў аснову пяцігодкі, і як канкрэтна гэтыя асноўныя прынцыпы адбіваюцца ў тых матар'ялах пяцігодкі, якія ўжо падрыхтаваны і вам раздаены. Вы мусіць маеце тоўстую кніжку нашага Дзяржплану, у якой пералічаны ўсе пэрспэктывы, якія мы ставім перад сабой.

Па-першае, ад XУ зьезду ЎсеКП(б), а таксама ад XI Зьезду Кампартыі Беларусі мы атрымалі грунтоўныя дырэктывы па гэтых прынцыпах.

Апроч гэтага ў нас была дырэктыва з боку ЦК КП(б)Б яшчэ ў ранейшыя часы. Так, што прынцыповае пытаньне ў гэтым матар'яле ўлічана цалкам.

Акрамя таго, мы ўжо дабіліся пастаноўкі дакладу Прэзыдыуму Дзяржпляну БССР на пасяджэньні Прэзыдыуму Дзярж. Пляну Саюзу ССР. Мы ўжо гэты даклад зрабілі, паставілі там пяцігодку, як у прынцыповым, так і ў практычным разрэзе. Прэзыдыум Дзярж. пляну Саюзу ССР цалкам і поўнасьцю згадзіўся з прынцыпамі пабудовы нашай пяцігодкі, гэта было ясна падкрэслена ў прамове Старшыні Дзярж. Пляну Саюзу т. Крыжаноўскага, які заявіў, што ён цалкам падпісваецца пад тымі прынцыпамі, якія мы тут у Беларусі ўлажылі ў нашу пяцігодку. Гэта гаворыць аб тым, што мы вельмі сур'ёзна папрацавалі над гэтаю справаю і што мы ўлічылі тыя задачы, якія ставяцца камуністычнай партыяй па індустрыялізацыі нашай краіны, прыстасаўваючы іх да тых запатрабаваньняў, якія стаяць непасрэдна перад БССР.

ПЯЦІГОДКА У ПРАКТЫЧНЫМ РАЗРЭЗЕ.

Канкрэтна, які ўзрост мы вызначаем па нашай пяцігодцы? Па-першае, па сельскай гаспадарцы (тут вы мяне выбачайце), я павінен некаторыя лічбы прывесьці, хоць гэта і запягне час, але бяз гэтага нельга абыйсьціся. На сельскай гаспадарцы мы вызначылі такі ўзрост валавой прадукцыі: на 24 пр. па даваенных цэнах; па тэхнічных культурах (канаплі і лёну) мы думаем у канцы пяцігодкі ўзрост падняць на 32 пр. Гэтую задачу я асабліва падкрэсьліваю. Беларуская гаспадарка, асабліва сельская гаспадарка, па-мойму прызвана перайсьці да больш высокага тэхнічнага ўзроўню. У нас ёсьць такія райёны, як Віцебскі, Магілеўскі, Гомельскі і цэлы шэраг іншых, у якіх можна даволі значна разьвіць канаплю і лён. Гэта тая база сыравіны для нашай прамысловасьці, на падставе якой можна разгарнуць сапраўды прамысловае будаўніцтва.

Акрамя таго, вучоныя спэцыялісты па сельскай гаспадарцы гавораць, што на мэліяраваным балоце можна таксама значна пашырыць ураджай канаплі. Пад канаплю мэліяраваная дзесяціна можа быць цалкам скарыстана, а мы ставім вялікую задачу па мэліярацыі. Мы ў нашай пяцігодцы прадугледжваем 500.000 дзесяцін мэліяраваць за 5 год—інтэнсыўна мэліяраваць.

Далей, працаёмкія культуры ў сельскай гаспадарцы мы думаем падняць на 27 проц., і вось тут стаіць пытаньне аб бульбе. Па дыяграмах, якія адбіваюць практычны разрэз нашай пяцігодкі, у нас больш усяго расьце бульба. Мы ставім даволі шырока праблему падняцьця і пашырэньня бульбяной вытворчасьці па-першае, разьвіць тэхнічную пераапрацоўку бульбы—гэта значыць крахмалапатачную вытворчасьць і вінакурэньне, разьвіць жывёлаводчы ўхіл у нашай сельскай гаспадарцы. Бульба—адзін з самых лепшых карняплодаў, на падставе якіх мы можам разьвіваць жывёлаводзт

ў такое стано ішча, каб можна было не скарыстаць, уцягнуць у гаспадарчы зварот, то гэта дасьць ня толькі эканамічны эфэкт, але гэта будзе эфэкт па разрадцы тэй аграрнай перанасельнасьці, якая ў нас ёсьць.

Капітальнае ўкладаньне ў сельскую гаспадарку мы праэктуем на 116.000000 р., улічваючы крэдыты і асыгнаваньні на бюджэту.

У галіне прамысловасьці мы думаем падвысіць валавую прадукцыю за гэтыя бліжэйшыя 5 год на 94,1 пр. Капітальнае ўкладаньне мы праэктуем па нашай 5-цігодцы у 126000000 руб. Адноведна з гэтым павышэньне ўдзельнай вагі прамысловасьці ва ўсім гаспадарчым звароце краіны павінна быць даведзена ад 18 проц., якое зараз яна займае, да 26,3 проц. у вылічэньні па даваенных цэнах.

Мы думаем, што наша прамысловае будаўніцтва ў бліжэйшыя гады будзе ісьці па шляху новага будаўніцтва. Мы ўжо, як гэта відна з тых лічбаў, якія я тут выкладаў, шмат пабудавалі і адрамантавалі тых прадпрыёмстваў, якія ў нас былі.

Мы ўжо асноўныя капіталы ў нашай прамысловасьці цалкам скарысталі, мы ўжо яго павялічылі. Мы яго ўжо падвоілі з 27000000 руб. да 55000000 р. Так што перад намі стаіць ужо задача новага будаўніцтва і ў значнай сваёй частцы пашырэньне ўдзельнай вагі прамысловасьці павінна ісьці за кошт новага будаўніцтва.

Я ня буду пералічваць тых прадпрыёмстваў, якія мы праэктуем пабудаваць запова, застанаўлюся толькі на галоўных. Мы, напрыклад, праэктуем пабудову фабрыкі штучнага шоўку. Гэта прадпрыёмства вельмі значнае. Мы шырэй ставім пытаньне, ня толькі штучнага шоўку, але наогул павінны паставіць праблемы па разьвіцьцю штучнага валакна, куды ўваходзіць на толькі шоўк, а яшчэ цэлы шэраг валакна, якое можа быць скарыстана ў нас. На гэтай падставе мы можам мець пэрспэктыву прамысловага разьвіцьця. Сюды ўваходзіць: канапля, лён, скарыстаньне лясной сыравіны, для таго, каб з яго рабіць валакно і перарабляць яго на нашых-жа фабрыках.

Акрамя таго, мы ставім пытаньне аб больш дасканалай перапрацоўцы той лясной сыравіны, якая ў нас ёсьць. Гэта ў нас выклікае неабходнасьць пабудовы такіх прадпрыёмстваў па лесапераапрацоўваючай прамысловасьці, якія маглі-б больш складана пераапрацоўваць тую лясную сыравіну, якая ў нас ёсьць, таму што мы ў значнай частцы, пакуль што, распрацоўваем мех і рэжам яго, на дошкі рэжам, і на гэтым застанаўліваемся. Зараз мы ставім задачу пабудаваць лесаапрацоўваючую прамысловасьць так, каб яна скарыстала ня толькі ўсю драўніну і лясную сыравіну, якая ў нас ёсьць, а ма' быць і тыя астаткі, якія ў нас ёсьць у лясной прамысловасьці.

Адсюль мы ставім сабе праблему пабудаваньня тых прадпрыёмстваў, якія маглі-б займацца выпрацоўкай матар'ялу для будаўніцтва, як вытворчасьць аконных рам і іншых частак, якія патрабуюцца наогул у нашым будаўніцтве.

Я ня буду больш гаварыць аб тым, што мы маем на ўвазе пашырэньне базы валакнянай сыравіны, але на падставе гэтага мы думаем будаваць льнопрадзільную і льнаткацкую фабрыкі. Гэта нам удасца тады, калі мы сапраўды зможам значна падняць узровень тэхнічных культур і калі мы зможам ужо на практыцы даказаць, што мы нашу лясную сыравіну можам перарабляць у валакно.

Калі мы гэтага не даб'емся, дык, як мне здаецца, мы будзем мець слабую падставу для далейшага пабудаваньня ткацкіх і прадзільных фабрык.

Таму правільна ставіць пытаньне Вышэйшы Савет Народнай Гаспадаркі, лічачы, што ў першую чаргу трэба пабудаваць фабрыку штучнага шоўку, каб на справе даказаць, што мы можам тую цэлюлёзу, якую вырабляем у нас з драўніны, скарыстаць на тую вытворчасьць, якая будзе задавольваць шырокія запатрабаваньні працоўных.

Больш я ня буду спыняцца на тых прадпрыёмствах, якія мы будзем будаваць, лік якіх даходзіць да 20.

Адзначу, што мы ставім пытаньне аб пабудаваньні прамысловасьці такой, якая будзе вырабляць прадукты спажыўцтва і прадукты вытворчасьці для сельскай гаспадаркі.

Мы не бярэм на сябе задачы такой, каб будаваць тую прамысловасьць, якая вырабляла-б сродкі вытворчасьці, напрыклад, машынастраеньне і г. д. Мы на часьці машынастраеньня можам толькі гаварыць аб сельска-гаспадарчых машынах. І таму мы праэктуем, гэта ўжо зацьверджана адноведнымі Саюзнымі органамі, пабудаваць новы завод веялак, сеялак і саламарэзак у Гомелі.

Гэты завод будзе каштаваць значную суму грошай. І райён, які ён будзе здавальняць, будзе выходзіць нават за межы Беларусі. ВСНГ Саюзу лічыць, што мы гэтым заводам можам задаволіць ня толькі патрэбы Беларусі, але і патрэбы Бранскай губерні. Мы маем ужо некаторыя асыгнаваньні на пачатак пабудовы гэтага заводу.

Чаму мы бярэм такую ўстаноўку на пабудову такой прамысловасьці, якая будзе задавольваць нашыя спажывецкія патрэбы? Усім вядома, што ў нас няма такіх выкапняў, якія б дазволілі нам думаць аб машынабудоўлі і інш. Я ў папярэдняй частцы майго дакладу пералічваў, што мы знайшлі ў нашых нетрах: мы знайшлі вельмі каштоўныя выкапні, але ў нас няма ні вугалю, ні жалеза і г. д. Пабудова прамысловасьці, вырабляючай сродкі вытворчасьці, можа грунтавацца бязумоўна толькі на такіх выкапнях, як вугаль, жалеза і інш. Мы, зразумела, пры нашым прамысловым будаўніцтве не абмяжуемся толькі распрацоўкай той сырыны, якую мы маем у нашай краіне: **мы ставім таксама задачу пабудовы такіх галін прамысловасьці, якія будуць працаваць і на прывознай сыравіне,** але мы кажам, што ў першую чаргу мы можам і павінны будаваць тую прамысловасьць, якая будзе грунтавацца на той сыравіне, якая ёсьць у нашай Беларусі і толькі ў другую чаргу будаваць такія прадпрыёмствы, якія будуць працаваць на прывознай сыравіне. Я лічу, што такая ўстаноўка зусім зразумелая і правільная.

Узрост ліку рабочых па нашай пяцігодцы, у зьвязку з гэтым прамысловым будаўніцтвам, праэктуецца на 40 проц. Але сюды ўваходзяць толькі лічбы па цэнзавай прамысловасьці. Калі-ж узяць усё нашае будаўніцтва, то колькасьць рабочых у нас вырасьце прыкладна на 70 тыс. чалавек. Гэта, зразумела, толькі пры той умове, што мы поўнасьцю ажыцьцявім праграму прамысловага будаўніцтва.

АБ ТЭХНІЧНАЙ БАЗЕ.

Таксама я павінен сказаць некалькі слоў аб тэхнічнай базе і электрабудаўніцтве. Я ўжо ў першай частцы свайго дакладу вызначыў, што тэхнічная база —гэта аснова, на якой мы будзем грунтаваць усе нашы меркаваньні і пляны па прамысловаму і наогул народнагаспадарчаму будаўніцтву. Таму ў нас стаіць непасрэдная задача—электрабудаўніцтва. Для гэтага ў нас ёсьць тая база, якая патрэбна, і электрычная энэргія зьявіцца тым коранем, на якім мы будзем будаваць усю нашую гаспадарку. У пяцігодцы мы адзначаем пабудову Асінастрою, які дасьць нам вельмі значны прырост электрычнай энэргіі. Але гэтым справа яшчэ не канчаецца. Да гэтага часу мы думалі, што на энэргію ад Асінастрою мы будзем разгортваць прамысловасьць Віцебскай, Аршанскай і Магілеўскай округ, але перад намі стаіць яшчэ задача, **як пры дапамозе Асінастрою (як больш значнай станцыі) і іншых электрычных станцыяў, мець уплыў таксама і на сельскую гаспадарку, каб пры дапамозе электрычнай энэргіі зрабіць пераварот у сельскай гаспадарцы, каб з электрычнай энэргіяй больш шпарка павесьці ўперад разьвіцьцё сельскай гаспадаркі.** Гэтая задача вельмі складаная і вялікая, яна перад намі стаіць, і мы павінны яе вырашыць абавязкова. Астаноўка толькі за намі, за тым, як мы зможам прыдумаць тыя шляхі, пры дапамозе якіх мы бы праз электраэнэргію ўклініліся ў сельскую гаспадарку.

Я павінен падкрэсьліць, што электрабудаўніцтва ўключае ў сябе два прынцыпы: тэхнічны, бо праз электрычнасьць мы можам шпарка пасоўвацца ўперад па тэхнічнаму прагрэсу і энэргетычны прынцып, бо праз электрычнасьць мы можам скарыстаць тыя энэргетычныя рэсурсы, якія закладзены ў нашых нетрах, у якасьці торфу. Пры гэтым трэба адзначыць, што ў нас ужо знойдзены, здаецца, у Мазырскай акрузе (дасканала ня помню) дасьледчымі камісіямі, якія былі камандыраваны ВСНГ, залежы такога торфу, які па сваёй якасьці можа быць названы ўжо бурым вугалем.

Так што, бачыце, ужо пры тых невялічкіх кроках, якія мы пасьпелі зрабіць для дасьледваньня нашай краіны, мы ўжо выяўляем вялікія багацьці, якія мы можам і павінны скарыстаць. І вось, у зьвязку з гэтым мы маем вялічэзныя пэрспэктывы для электрабудаўніцтва, праз якое мы канцэнтруем два галоўнейшых прынцыпы, аб якіх я казаў: скарыстаньне энэргетычнай базы і пашырэньне і павышэньне тэхнічнага ўзроўню.

НАШЫ КУЛЬТУРНЫЯ ЗАДАЧЫ.

Цяпер аб культурных задачах, якія мы прадугледжваем нашай пяцігодкай. Я спынюся толькі на двух моментах. Папершае, выдаткі на культурную справу ў нас к канцу пяцігодкі павінны павялічыцца на 31,8 проц. і такім парадкам, што сёлета, як у першым годзе пяцігодкі, яны складаюць 23.122.000 р., а ў канцы пяцігодкі павінны ў год складаць 30.470.000 р.

Як мы будзем ажыцьцяўляць плян усеагульнага навучаньня? Тут мы думаем так: калі ў нас цяпер ахоп дзяцей школьнага ўзросту нашымі навучальнымі ўстановамі даходзіць да 71,6 проц., то да канца пяцігодкі ён будзе даходзіць да 92,7 проц., застанецца ў нас 7,3 проц.

Тэмп мы бярэм такі, каб поўнае ажыцьцяўленьне пляну ўсеагульнага навучаньня прыстасаваць да 32-33 г. г.; у 1932-1933 г., г. з. у пачатку другой пяцігодкі мы павінны будзем цалкам ажыцьцёвіць плян усеагульнага навучаньня. Такую пастанову вібыта вынесла другая Сэсія ЦВК Саюзу ССР. Мы думаем, што мы яе цалкам ажыцьцёвім.

Вось па гэтых двух моментах я толькі спынуўся на культурным будаўніцтве.

Некалькі заўваг аб бюджэце. Наш бюджэт, як дзяржаўны, так асабліва мясцовы, будзе мець вялікія перашкоды, аб якіх дасканала будзе гаварыць тав. Мікуліч у сваім дакладзе аб бюджэце на 1927-28 г. Я толькі падкрэсьліваю, што наш дзяржаўны бюджэт мы праэктуем з дэфіцытам. Наш мясцовы бюджэт—зусім дэфіцытны бюджэт, у нас ёсьць такія округі, якім мы на 30-40 проц. павінны даць дапамогу з фонду рэгуляваньня. Пэрспэктывы рэсту прыбытку ў мясцовым бюджэце ў нас невялікі? Мы пакуль што тлумачым гэтае зьявішча тым, што ў нас прыбытковыя крыніцы вельмі зруйнаваны, напрыклад, камунальная гаспадарка не выглядае такой моцнай гаспадаркай, якая дала бы дастатковы прыбытак у наш мясцовы бюджэт. Нават у самым Менску у сталіцы, каналізацыя не на належнай вышыні, і выдатную конку ніяк ня можам здаць у архіў. Праўда, мы ў гэтым годзе дабіліся ўжо таго, што пачынаем работу па будаўніцтву трамваю.

У самым Менску камунальная гаспадарка не дае вялікага прыбытку, дык што-ж гаварыць аб другіх гарадох. Але ня толькі камунальная гаспадарка ў нашых гарадох яшчэ слабая, вазьмеце, напрыклад, жыльлёвы фонд, мясцовую прамысловасьць, гэта ўсё такія галіны, па якіх прыбытак павінен ісьці ў мясцовы бюджэт, мясцовая прамысловасьць таксама мае нязначную вагу. Такім чынам, мы загадзя прадугледжваем, што мясцовы бюджэт будзе цярпець на працягу бліжэйшых гадоў цяжкасьці.

БЮДЖЭТ.

Мы праэктуем дзяржаўны бюджэт на 5 год з дэфіцытам з тым, каб магчыма было праз субвэнцыйны фонд дапамагаць мясцоваму бюджэту. У гэтым годзе, трэба сказаць, мы дабіліся ўжо такога становішча, калі ў НКФ Саюзу ССР прызналі, што наш дзяржаўны бюджэт павінен быць дэфіцытным і павінен мець датацыю, каб яго збалянсаваць.

Якія задачы мы маем па бюджэтных справах. Я лічу, што мы павінны мабілізаваць усе нашыя сілы па тое, каб налягаць на павялічэньне прыбытку ў наш бюджэт, як непадатковых, так і падатковых крыніц, мы павінны іх пашырыць, бо, таварышы, разьлічваць толькі на датацыю нельга,—гэта няправільны прынцып. Датацыю мы павінны ўлічваць, як нейкую, дапамагаючую меру. Нам трэба налягаць усімі сіламі і сродкамі па тое, каб мы мелі магчымасьць вышэйшых прыбытковых крыніцы ў нас і па іх падставе разьвіваць работу.

Як мы ўваходзім у пяцігадовы пляны пэрыяд і з чым уваходзім? Ці гэта толькі словы, ці гэта будуць ужо справы, тое, аб чым я гаварыў. Я лічу, што гэта будуць справы. Мы ўжо ў гэтым годзе, г. зн. у першы год пяцігодкі ўступілі з досыць грунтоўнымі падставамі, напрыклад, па прамысловасьці замест 8.000.000 р., якія мы мелі на капітальных укладах у прамысловасьць, мы ў гэтым годзе ўжо маем згоду Саюзных органаў на тое, каб улажыць у нашу прамысловасьць 14,6 міліёнаў рублёў. Такі рост капітальных укладаў у прамысловасьць дае нам поўную магчымасьць гаварыць, што мы пяцігодку будзем ажыцьцяўляць на справе.

У мінулым годзе мы мелі 51 млн. руб. па дзярж. бюджэце, а ў гэтым годзе мы яго ўжо склалі на 63 міліёны руб., якія вы тут будзеце зацьвярджаць. Гэта ёсьць вялікі рост.

Па крэдыту на сельскую гаспадарку, напрыклад, мы маем ужо 15 міл. руб. у гэтым годзе. Гэтая лічба амаль што ў два разы большая, чым у мінулым годзе.

Але я адзначу, што лічбы ў матар'ялах, разданых вам па пяцігадоваму пляну, і тыя лічбы, якія я агалашаў —папярэднія, і яны на працягу жыцьця будуць мець бязумоўныя зьмены: трэба прадбачыць, што яны будуць ці павялічвацца, ці паменшацца. Тут перасоўкі такія будуць. Я лічу, што мы павінны ад імя Сэсіі сказаць рашучае слова, што ўвага ўсіх працоўных мас усёй БССР павінна быць зьвернута на ажыцьцяўленьне гэтага пляну, бо ў гэтым плане сканцэнтравана ўся практыка будаўніцтва ўсёй нашай дзяржавы і падкрэсьліць гэта перад усімі працоўнымі масамі ад імя Сэсіі вельмі неабходна. Мы гэта ажыцьцёвім толькі тады, калі і ў далейшым будзем усе разам працаваць над ажыцьцяўленьнем гэтага пляну, як працавалі раней. Цяпер, таварышы, дазвольце мне спыніцца на такіх пытаньнях, як кан'юнктурныя зьявішчы, якія ёсьць у сучасны момант, і па канкрэтных задачах, якія стаіць непасрэдна ў бліжэйшы пэрыяд у галіне гаспадарчага будаўніцтва.

КАН'ЮНКТУРА І КАНКРЭТНЫЯ ЗАДАЧЫ.

Паконт кан'юнктурных зьявішч я зраблю некалькі заўваг. Першае—які ўраджай у нас у гэтым годзе? Я буду гаварыць толькі аб кан'юнктуры Беларусі. Паводле даных, якія мы маем ад нашага ЦСУ, можна гаварыць, што ўраджай у нас у гэтым годзе трошкі горшы, чымся ў мінулым годзе. Праўда, хлеба-фуражны балянс ЦСУ складала некалькі разоў і паводле розных даных. У прыватнасьці нагорнулася бульба, а вы ведаеце, якую ролю ў нашай гаспадарцы мае бульба. Але гэтае памяншэньне вельмі нязначнае.

Як ідуць у нас загатоўкі хлеба? Я павінен адзначыць, што мы яшчэ мала зрабілі ў гэтай галіне. Тут нашыя цэнтральныя ўстановы, якія кіруюць гэтаю працаю, мала раскачаліся, таксама і нашыя мясцовыя ўстановы і тыя загатоўчыя органы, якія гэтым займаюцца—усе яны зусім мала зрабілі. Я са ўсёй сур'ёзнасьцю гэта падкрэсьліваю на Сэсіі ЦВК і Сэсія ЦВК павінна будзе ўжыць заходы, каб нашы органы ў сэнсе хлебазагатовак выказалі як мага больш актыўнасьці.

Трэба адзначыць таксама, што запатрабаваньні шырокіх мас пашырыліся; мы, напрыклад, ямо больш, чымся елі. У 1925-26 годзе мы прывозілі хлеб у Баларусь, у той час, як раней Беларусь вывозіла хлеб. Чаму гэта так? Мала таго, што хлеб у Беларусь увозіцца, але ўвоз усё больш з кожным годам павялічваецца. У 1925-26 годзе мы ўвезьлі каля 7.000.000 пуд., у мінулым годзе—18.000.000 п., у два разы больш. У чым-жа справа? Ці вёска зьбяднела? Не, не зьбяднела, яна багацей стала. Ураджай сёлета ў сярэднім той самы, а хлеба ў Беларусь увозім больш. Некаторыя, магчыма, скажуць, што хлебам мы замяняем некаторыя другія прадукты, але гэтага я-б не сказаў. Калі мы возьмем рост тэхнічных культур, альбо жывёлаводзтва, дык яны паўрад ці запоўнілі-б тое, што ў хлебе не хапае. У чым-жа тут справа? Справа ў тым, што сялянства, рабочая кляса і ўсе працоўныя пачалі больш ёсьці,—гэта бязумоўна, прычым пачалі лепей есьці. Набывальная здольнасьць сярод нашых мас расьце ўсё больш і больш. Расьце яна таму, што апроч прыбыткаў ад сельскай гаспадаркі, напрыклад, сялянства БССР, толькі на адных лесапрацоўках і набудове шляхаў заробляе 13-15 міліёнаў руб. у год, ды яшчэ на другіх галінах мае набочны заработак. Бясспрэчна і тое, што і ў рабочай клясы заработак павысіўся. Апроч таго, багацей пачала жыць вёска—гэта бязумоўна, і калі мне хто-небудзь скажа, што яна жыве дрэнна, я гэтаму ня дам веры. Гэта, вядома, не азначае, што ў вёсцы няма бедноты. Беднота і цяпер ёсьць, але побач з беднякамі вёска наогул расьце. Чым жа растлумачыць такое зьявішча, што парфумэрыі і галянтэрэйных тавараў у вёсцы не хапае больш, чым у горадзе? Напрыклад, у адэкалёне „дэфіцыт". Нашыя каапэратары далі даведку, што на вёсцы не хапае парфумэрыі і галянтэрэйных тавараў, што ў гэтых таварах адчуваецца недахоп. Відома, што гэтыя тавары купляе больш заможнае сялянства, але гэта ня факт.

Аб чым гэта гаворыць? Гэта гаворыць аб тым, што запатрабаваньні нашай вёскі значна пашырыліся, што мы ў разьвіцьці нашага дабрабыту прайшлі ўжо на вышэйшую ступеньку. Калі запатрабаваньні вёскі набліжаюцца да запатрабаваньняў гораду. Калі сялянка прыходзіць у краму, дык яна ўжо таго паркалю, за які яна ў 1919-20 г. г. давала 2 пуды хлеба, зараз ня хоча, яна гаворыць, што ёй трэба лепшы тавар. І таму стаіць больш вялікія задачы перад нашай прамысловасьцю. Гэтыя задачы заключаюцца ў тым, што якасьць вырабляемай прадукцыі нашай прамысловасьцю павінна абавязкова павышацца. Мы ўжо ня толькі гаворым аб аб'ёме і ўзросьце прамысловасьці, зараз стаіць пытаньне, каб палепшыць прадукцыю. Тая якасьць, якая здавальняла запатрабаваньні шырокіх мас у 1920-21 годзе, зараз ужо іх не здавальняе.

Трэба адзначыць, што другарадныя прадукты ў сельскай гаспадарцы набылі значна большае значэньне і што шмат склянства, асабліва заможнага, усе свае патрэбы пакрывае за кошт другарадных прадуктаў, а хлеб пакідае надалей. Таму перад намі ўсімі стаіць самая вострая задача павысіць хлебазагатоўкі. Я ня буду доўга затрымлівацца на тых гаспадарчых працэсах, які зараз адбываюцца ў вёсцы і горадзе, а таксама паміж вёскай і горадам. Я павінен у гэтай галіне толькі адзначыць, што тавараваарот паміж вёскай і горадам усё больш расьце і ўзмацняецца з кожным днём. Прадукцыя прамысловасьці, якая здавальняе запатрабаваньне сялянства, павялічваецца, а гэта выстарчыць для таго, каб указаць, што тавазварот паміж горадам і вёскай і ўзмацняецца і пашыраецца, вёска ўсё больш атрымлівае тавараў ад гораду.

Я цяпер спынюся крыху на тым, як сялянства выконвае свае абавязкі ў адносінах да прамысловасьці і ў адносінах да гораду. Я лічу, што сялянства выконвае гэтыя абавязкі ня зусім акуратна. Давайце тут на Сэсіі адкрыта назнаёмімся з гэтым. Паводле чаго можна судзіць аб гэтым? А вось, на падставе загатоўкі хлеба, як я ўжо казаў аб гэтым. У гэтым годзе хлебазагатоўкі па Беларусі ідуць слабей, чым у мінулым годзе. Той плян, які выпрацаван намі па загатоўцы, ён у гэтым годзе выконваецца слабей. Я гэта падкрэсьліваю некалькі разоў. Загатоўкі сыравіны для нашай прамысловасьці сёлета таксама праводзяцца слабей, чым у мінулым годзе. Я запытаўся ў нашага НКГ, як ён выконвае загатоўкі на ільну, канаплі; яго адказ мяне не здаволіў. Аказваецца, што загатоўкі ільну для нашай прамысловасьці, на якім мы грунтуем разьвіцьцё нашай прамысловасьці, у гэтым годзе менш, чым у мінулым годзе і выкананы толькі на 80-90 проц. І наогул загатоўкі іншай сельска-гаспадарчай сыравіны для нашай прамысловасьці таксама выконваюцца слабей у параўнаньні з мінулым годам. Возьмем, напрыклад, ячмень, загатоўка якога выконваецца слабей, чым у мінулы год, а ячмень адыгрывае значную ролю, як прадукт, як сыравіна у беларускай харчовай прамысловасьці.

Таму я з усёй сур'ёзнасьцю ўзьнімаю пытаньне аб тым, што, з аднаго боку, нашы адноведныя цэнтральныя органы, якім належыць праводзіць загатоўкі сельска-гаспадарчай сыравіны для нашай прамысловасьці і загатоўку хлеба,—зрабілі вельмі мала, а нашы адноведныя мясцовыя органы таксама зрабілі мала. Пытаньне стаіць сур'ёзна, вельмі сур'ёзна. Я гэта падкрэсьліваю. Калі мы тут ў Беларусі дамагаемся, каб нам Саюз даў сродкі для разьвіцьця прамысловасьці, калі мы стараемся адшукаць лішнюю капейку, якую мы маглі-б пусьціць у нашу прамысловасьць,—дык зараз мы, магчыма, прымушаны будзем які-небудзь броварны завод спыніць, бо для яго мала загатовілі сыравіны. Сёньня мы гаворым, што ў нас ёсьць вялікая сыравінная база, на гэтай базе мы павінны разгортваць нашу прамысловасьць, а заўтра прыдзе Старшыня Вышэйшага Савету Народнай Гаспадаркі і скажа, што завод спыняецца, сыравіны не хапае.

Таварышы сялянне, пытаньне тут сур'ёзнае. Мы ўступаем у новы пляны пэрыяд, мы ўсе сілы і сродкі павінны скарыстоўваць для таго, каб пабудаваць лішні завод ці фабрыку; просім грошы ў Савецкага Саюзу на гэтыя фабрыкі і заводы, даказваем, што ў нас вельмі грунтоўная сыравінная база..., а сыравіны не хапае, загатоўлена яе зусім мала.

Паўстае такое пытаньне, што калі мы тут не падгнаемся, гэта значыць, мы нашу 5-цігодку цалкам ня выканаем. Грошы на разьвіцьцё прамысловасьці нам даюць, а сыравінай для нашай уласнай прамысловасьці мы не забясьпечаны, між тым, як увесь час гаворым аб угрунтаваньні нашай прамысловасьці на нашай-жа сыравіне.

Я падкрэсьліваю гэтую задачу загатоўкі сыравіны, як баявую задачу. Перад усімі сялянамі, перад усімі работнікамі месц, перад усімі работнікамі цэнтру я заяўляю, што калі мы тут не падгнаемся, то мы нашу 5-цігодку будзем ажыцьцяўляць слаба; трэба ўсім падгнацца, узмацніць працу на розных загатоўках. Нам трэба мець на ўвазе, што загатоўка хлеба ў нас у Беларусі, загатоўка сыравіны, для прамысловасьці, загатоўка тэхнічных культур—гэта баявая задача, якая стаіць сёньня перад намі. Калі мы ў гэтым сэнсе нічога ня зробім, я баюся за нашую 5-цігодку.

Мы павінны мець на ўвазе, што пры пабудове прамысловасьці мала мець грошы; нельга ўвесь час разьлічваць на тое, што хто небудзь дасьць, а мы пабудуем: гэта сабезаўскі мэтад. Я падкрэсьліваю, што мала мець грошы, а трэба ўмець іх скарыстоўваць так, каб яны прынесьлі прыбытак. Грошы ёсьць, фабрыкі пабудавалі, а сыравіны не хапае.

Таму я з вялікай сур'ёзнасьцю яшчэ раз паўтарыў і буду паўтараць, што гэта самая цэнтральная задача, якая стаіць перад савецкімі працаўнікамі, перад сялянамі. Вытворчасьць прамысловасьці павялічваецца, рабочая кляса выконвае свае задачы, а сялянства дае мала сыравіны. У той час, калі валавая прадукцыя сельскай гаспадаркі павышаецца,—наогул сельская гаспадарка значна вырасла—задача загатоўкі сыравіны для прамысловасьці выканана значна слабей. У чым тут справа? Намойму мы вусім дрэнна працуем, не падумалі над гэтым пытаньнем, не зьвярнулі ўвагу на гэтае пытаньне. Справа ў тым, што мы на пытаньне загатоўкі сыравіны да гэтага часу не зварочвалі той увагі, якой гэтае пытаньне заслугоўвае і патрабуе.

Трэба мець на ўвазе, што з боку ўраду прымаюцца ўсе меры для таго, каб даць за лік гэтай сыравіны і прадукты прамысловай вытворчасьці, у прыватнасьці мануфактуру і іншыя прадукты. У далейшым, мы яшчэ павялічым завоз тавараў на вёску. Але сялянства і візавым савецкія і партыйныя працаўнікі павінны з свайго боку падгнацца і палепшыць працу па загатоўках с.-г. прадуктаў. Зварачваючыся да 5-цігодкі, я лічу, што трэба мець на ўвазе, што выконваньне 5-цігодкі наогул будзе цяжкім таму, што запатрабаваньні мас, па маёй думцы, будуць перарастаць тэмп народна-гаспадарчага разьвіцьця. А раз гэта так, то мы павінны ўсе нашы абавязкі ў гэтай галіне ажыцьцяўленьня пляну 5-годкі,—выконваць акуратна, на ўсе 100 проц.

Запатрабаваньні мас будуць расьці шпарчэй (яны ўжо растуць шпарчэй) чым тыя матар'яльныя магчымасьці ў разьвіцьці народнай гаспадаркі, якія мы маем. Гэта я адзначаю з націскам, гэта трэба мець на ўвазе, бо такое зьявішча можа пэрыядычна выклікаць некаторыя цяжкасьці ў нашай гаспадарчай працы і ўсялякія часовыя кан'юнктурныя хістаньні. Гэта трэба прадугледзіць і іменна таму трэба выконваць усе абавязкі адносна да загатоўкі сыру для прамысловасьці, хлеба як мага акуратней, разьвіваць тэхнічныя культуры і г. д.

Трэба знайсьці такія галіны гаспадарчай працы і разьвіваць такія галіны гаспадаркі, каб хутчэй атрымаць эканамічны эфэкт. Гэта цяпер першачарговая задача. Бо мала пабудаваць плян—трэба мець матар'яльную базу для яго ажыцьцяўленьня. Вось таму я і кажу: трэба разгарнуць тыя галіны гаспадаркі, якія ў больш кароткі час дадуць эканамічны эфэкт, гэта значыць, што па лініі сельскай гаспадаркі трэба завострыць пытаньне на разьвіцьці другарадных галін,—як птушкаводзтва, сьвінагадоўля, пераапрацоўка малочных прадуктаў, выраб экспортных тавараў і г. д. Нам трэба цяпер біць па такіх галінах гаспадаркі, якія адразу былі-б уключны ў зваротныя капіталы і маглі-б нам даць магчымасьць пашыраць нашыя зваротныя капіталы. Ва ўмовах Беларусі гэта галоўная задача. Як толькі мы падыходзім да збалянсаваньня нашай народнай гаспадаркі, то выходзіць, што мы па некаторых галінах дэфіцытны. А дзе-ж у нас прыбытак? Ці можна так жыць? Не, няможна. Таму мы павінны зараз пры дапамозе ўсіх навуковых устаноў, на падставе ўсяго навуковага матар'ялу і на падставе вопыту працы, які ў нас ёсьць, сканцэнтраваць сёньня нашую думку на разгортваньні тых галін гаспадаркі, якія-б маглі падвесьці матар'яльную базу па ажыцьцяўленьню нашага пляну.

Мы шмат можам зрабіць у галіне разгортваньня экспорту, і гэтай працай мы значна ўзмоцнім нашу матар'яльную базу. Напрыклад, экспорт прадуктаў сельскай гаспадаркі—птушніцтва, сьвінаводзтва і г. д., можа даць нам значны прыбытак, бо гэтыя прадукты маюць шырокі рынак збыту, а мы ад экспорту ўзмацняем нашую валюту. Але ўсё гора ў тым, што мы яшчэ ня ўмеем гадаваць гэтыя экспортныя тавары. Напрыклад, нашыя гусі, якія мы накіроўваем у Бэрлін, бракуюцца, бо яны ня то сінія, ня то худыя.

(Голас з мейсца: Няма чым карміць).

А я вам скажу, што тут і гатунак мае вялікае значэньне. Наш прадукт яшчэ слаба прыстосаван для экспорту і яго трэба прыстасаваць да замежнага рынку. Урад, каб дапамагчы гэтаму мерапрыёмству, думае даць на бюджэту спэцыяльныя сродкі НК Зему тое, каб ён купіў гатункавых птушак і раздаў сялянам з тым, каб яны разводзілі іх. Трэба толькі мець умовы, каб сяляне разводзілі іх. Гэтая справа ў нашых умовах даволі сур'ёзная. Мы на экспорце птушніцтва, жывёлы і розных другарадных прадуктаў можам тварыць вялікую базу. Наогул на экспорце другарадных прадуктаў, якія ў нас часта амаль пад нагамі валяюцца, мы маглі-б вельмі значна ўзмацніць нашае матар'яльнае становішча.

У галіне прамысловасьці таксама патрэбна разгортваць тыя галіны, якія могуць даць нам прадукты для экспорту і шырокага спажываньня.

Трэба, каб прамысловае будаўніцтва

Літоўцы Савецкай Беларусі віта-ю-ць 2-ю Сэсію ЦВК.

Учора на вячэрнім пасяджэньні зьявіўся вітаць Сэсію ЦВК усебеларускі зьезд сялян-літоўцаў, які зараз праходзіць у Менску.

Прывітальныя прамовы выступаўшых сялян Сэсія сустрэла гучнымі воплескамі.

З адказным словам ад сэсіі выступіў член ЦВК т. Ігнатоўскі, який у сваёй прамове адзначыў, што рычнікавая рэвалюцыя выв... нацыянальныя і сацыя... ні. Усе нацыянальнасьці, якія ... ляюць БССР, заяўляюцца членамі ... ... вялікай працоўнай сям'і, разам будуючь сацыялістычную гаспадарку.

Ад імя зьезду сялян-літоўцаў тав. Лаўр... віч агаласіў наступную дэкларацыю:

Першы ўсебеларускі зьезд сялян-літоўцаў перадае свае ... 2-ой Сэсіі Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Савецкай БССР.

Літоўцы і беларусы маюць многа супольнага ў мінулым: ад ... царпелі так, як і беларусы. У дадатак да цяжкае эканамічнае эксплёатацыі ... царпелі, як і беларусы нацыянальны ўціск; пасьля сялянскага паўстаньня ... на працягу доўгіх гадоў быў забаронен літоўскі друк. Большасьць літоўцаў каляністалі ішлі ў Беларусь ад бязьзямельля, якое панавала ў Літве, працуючы побача з беларусамі, ачышчалі лясы і абрабляли зямлю.

Пралетарская рэвалюцыя ў Кастрычніку вызваліла і беларусоў, і літоўцаў жылі ў Беларусі. Сумеснымі намаганьнямі пад кіраўніцтвам нашай партыі мы ўжо залячылі пасьляваенныя раны. Мы прыступілі да пабудовы сацыялістычнага жыцьця. Шмат у нас ёсьць: яшчэ недахопаў, шмат ... работы. Але тое, што мы пры Савецкай Рабоча-Сялянскай Уладзе з гоў... маем гаспадарку, палянішаем наш дабрабыт,—заяўляецца лепшай гара... шага разьвіцьця і красаваньня. Мы ведаем, што Савецкая Улада ... пацыянальнай палітыкай дапамагае нам у будоўлі шко... нацыялістычнай культуры на нашай роднай мове. Мы абяцаем пас... ганьні, каб будоўлю сацыялізму пад кіраўніцтвам і ў саюзе з ра... разгортваць, пашыраць, узмацняць супольнымі і дружнымі сі... вецкага краю.

Няхай жыве цесная сувязь усіх працоўных мас усіх на...

Няхай жыве сацыялістычнае будаўніцтва!

Няхай жыве Савецкая Улада!

нас часта амаль пад нагамі валяюцца, мы маглі-б вельмі значна ўзмацніць нашае матар'яльнае становішча.

У галіне прамысловасьці таксама патрэбна разгортваць тыя галіны, якія могуць даць нам прадукты для экспорту і шырокага спажываньня.

Трэба, каб прамысловае будаўніцтва

Абавязкі мясцовых орг...

За адно застанаўлюся на абавязках мясцовых органаў. Уперад за ўсё я вельмі раю мясцовым органам арыентавацца ва ўсім сваім будаўніцтве на мабілізацыі мясцовых сродкаў. Мы прывыклі будаваць за кошт датацый па дзяржаўным бюджэце, а гэта няправільны прынцып, бо далёка ня ўсе матар'яльныя магчымасьці, якія там ёсьць, на месцах скарыстаны. Таму я лічу, што прыцягненьне сродкаў і самога насельніцтва ў нашую гаспадарку трэба шпарчэй разьвіваць, бо гэта справа разгортваецца пакуль што зусім слаба. Напрыклад уклады ў нашы касы ашчаднасьці павялічыліся толькі на 12 проц. гэта пасьля таго 2-х тыдневіка, які мы правялі. Калі-б гэта было 12 проц. ад той сумы ... даў, якая даўней была, то гэта было б яшчэ добра, але гэта ж толькі 12 пр. тых грошай, якія да гэтага часу ўцягваліся ў касы ашчаднасьці. Такім чынам разгортваньне працы па ўцягваньню ў нашае народна-гаспадарчае будаўніцтва сродкаў самога насельніцтва пастаўлена слаба і **мясцовыя працаўнікі асабліва павінны гэта прыняць пад увагу.**

Далей, я стаўлю такое пытаньне: дзе вопыт мейсц у будаўніцтве на сродкі свайго райёну, дзе ёсьць такі вопыт? Няхай бы хоць адзін райённы працаўнік сказаў, што вось напрыклад на працягу апошніх годаў ён здабыў такі вопыт ад будаўнічай працы на свайму райёну, на ўласныя сродкі райёну без датацыяў з цэнтру. Аднак да гэтага часу мне такога вопыту не

Дзеньнік 2-ой Сэсіі ЦВК БССР.

У вячэрню, 8-га студзеня, былі [illegible] спрачкі па дакладу тав. [illegible] і заключнае слова па яго [illegible]

[illegible] пасяджэньні 9-га студзеня выступалі ў спрэчках т. т. Нераш[illegible]віч, Гроздан, праф. Вальфсон, Калінін, Крэмэр, праф. Пічэта, Багданаў, Краскоўскі, Каган, Маслоўская, Арнольдаў, Кулага, Ошэраў.

Сёньня працяг спрэчак па дакладу тав. Баліцкага і заключнае слова яго.

Хроніка Сэсіі.

[illegible] перарыву група членаў [illegible] 9-га студзеня экскурсіяй [illegible] хлебазавод і шкляную гуту [illegible]ры».

[illegible] некалькі груп членаў ЦВК [illegible]ведаць завод «Энергія» і Беларускі Дзяржаўны Музэй.

Вызначан спэцыяльны таварыш для кіраўніцтва экскурсіямі.

— Учора, 9 га студзеня, польскі і латыскі консулы наведалі пасяджэньне Сэсіі ЦВК БССР.

Літва ізноў завастрае віленскае пытаньне.

Перастрэлка на польска-літоўскай мяжы.

КОЎНЯ, 8-1. Водлуг атрыманых з Коўні вестак, на польска-літоўскай дэмаркацыйнай лініі ва Уцянскім павеце 4-га студзеня мела месца перастрэлка між польскаю і літоўскаю прыгранічнаю вартаю. Як паведамляе літоўскае тэлеграфнае агенцтва „Эльта», «Страляніна была распачата палякамі пры спробе літоўскае варты паставіць на ранейшае месца тычкі, напярэдадні перастаўленыя польскаю вартаю далей на літоўскую тэрыторыю».

Заява Вальдэмараса прадстаўніку ПАТ.

ВАРШАВА, 8-1. Польскае тэлеграфнае агенцтва паведамляе, што прыехаўшы ў Коўню карэспандэнт агенцтва наведаўся да Вальдэмараса і меў з ім гутарку.

Наконт тэрміну адчыненьня польска-літоўскіх перамоў Вальдэмарас заявіў, што ён чакае прысылкі польскіх прапаноў.

У гутарцы Вальдэмарас закрануў пытаньне аб прэтэнзіях Літвы на грашовую выплату за страты ад захопу Вільні генэралам Жэлігоўскім. «Калі, аднак,—заявіў Вальдэмарас,—Польшча не захоча абмаркоўваць віленскага пытаньня, дык можна будзе распачаць перамовы аб тэхнічным баку існаваньня абедзьвюх нацый побач. Так, Вальдэмарас лічыць, што пытаньне аб устанаўленьні гандлёвых зносін можа быць упарадкавана, бо ён на бачыць перашкод, каб Літва набывала ў Польшчы нафту, вугаль і тэкстыльныя тавары. Аднак, ён не знаходзіць магчымым дапусьціць прывоз у Літву тавараў, якія зьяўляюцца частнаю прадукцыі Віленскае вобласьці. З гэтаю агаворкаю Вальдэмарас лічыць магчымым аднавіць паштовыя зносіны. Вальдэмарас падкрэсьліў, што між Польшчаю і Літвою могуць устанавіцца досыць шырокія зносіны тэхнічнага парадку, калі перавагі магчымых між абодвымі краямі згод на будуць распаўсюджвацца на Віленскую вобласьць.

Нарэшце Вальдэмарас заявіў, што ніхто не жадае ў большай меры, чымся Літва, заснаваць добрыя адносіны з моцнаю Польшчаю. Абружаная з 3-х бакоў магутнымі суседзямі, Літва, водлуг слоў Вальдэмараса, хоча бачыць Польшчу моцнаю, бо магутнасьць Польшчы ў значнай ступені вызначаецца існаваньнем Літвы.

На запытаньне прадстаўніка агенцтва ці прадбачыць Вальдэмарас устанаўленьні дыплёматычных зносін з Польшчаю, літоўскі прэм'ер адказаў: «Літва акрэдытуе польскага пасланьніка толькі ў Вільні».

КАНФІСКАЦЫЯ МАЕМАСЬЦІ ЛІТОЎСКІХ ЭМІГРАНТАЎ.

Польскія газэты паведамляюць, што літоўскі ўрад настанавіў сканфіскаваць на ўласнасьць дзяржавы рухомую і нярухомую маемасьць эмігрантаў.

ПРАЦЭС ТАЎРОГЕНСКІХ ПАЎСТАНЦАЎ.

Літоўская прэса паведамляе, што ў канцы студзеня г. г. закончана будзе сьледзтва па справе паўстаньня ў Таўрогене. У характары абвінавачных выступіць каля 100 асоб, з якіх частка арыштавана, а частка знаходзіцца на волі.

ЛІТОЎСКІ ФЛЁТ.

Ковенскае „Эхо" паведамляе, што замежныя дзяржавы вельмі зацікаўлены праэктам пабудовы літоўскага флёту. Адна з фінансавых бэльгійскіх груп гатова ўдзяліць Літве пазычку ў разьмеры 15 млн. літаў (прыблізна 3 млн. рублёў).

У Саюзе ССР.

Лацінізацыя цюрскага альфабэту.

ТАШКЕНТ, 8-1. Учора ўвечары ў Старым горадзе адчыніўся пленум усесаюзнага камітэту па лацінізацыі альфабэту цюрка-татарскіх народнасьцяў. На пленум прыехалі прадстаўнікі ўсіх цюрка-татарскіх рэспублік і абласьцёў да далёкае Якутыі ўключна. Пленум заслухаў справаздачу прэзыдыуму. Дакладчык Агамалы Оглы адзначыў поспехі усюды новага альфабэту. Па справаздачы разгарнуліся доўгія спрэчкі.

Конкурс на большую ўраджайнасьць.

МАСКВА. На ініцыятыве НК РСІ і рэдакцыі «Крестьянской Газеты» і «Бедноты» арганізуецца ўсесаюзны конкурс сялянскіх гаспадарак на вышэйшую ўраджайнасьць. Конкурс павінен ня толькі выявіць гаспадаркі, якія дасягнулі ўраджайнасьці ў два і тры разы большай у параўнаньні з ураджаем даннае мясцовасьці, але і даць магчымасьць вывучыць прычыны, стварэўшыя павышэньне ўраджайнасьці, і вызначыць уплыў у гэтых адносінах калектыўных форм гаспадарчаньня. Па конкурс, па думцы ініцыятараў, павінны быць прыцягнуты гаспадарчыя калектывы і адзіначасобныя працоўныя гаспадаркі. Да арганізацыі яго павінна быць прыцягнута шырокая партыйная і савецкая грамадзкасьць.

Кулакі спалілі калектыўную гаспадарку.

КАЗАНЬ, 7-1. Калектыўная гаспадарка «Акцябр», у Буйнінскім кантоне Татрэспублікі, дасягшая посьпехаў у вядзеньні гаспадаркі, выклікала зайздрасьць кулакоў. Скончылася гэтая справа падпалам калектыўнае гаспадаркі. Згарэла частка інвэнтару, малатарня, дзьве жнівяркі, трактар і інш. Падпальшчыкі спрабавалі спаліць старшыню калектыўнае гаспадаркі камуніста Козіна, які выратаваўся, дзякуючы данамозе падасьпеўшых таварышаў.

Няшчасны выпадак.

НІЖНІ-НОЎГАРАД. У Сормаўскім райёне на заводзе, пабудова якога яшчэ ня скончана, здарылася катастрофа. У часе працы разваліліся лясы вялізарнага жалезнага корпусу. Разам з лясамі з вышыні 12-ці мэтраў упадалі рабочыя. У больніцу даставлена 9 рабочых, з якіх тры цяжка паранены.

Рэдкалегія перамагла.

УЛЬЯНАЎСК, 7-1. Гэтымі днямі ў нарсудзе скончыўся працэс рэдкалегіі пасьценнае газэты губэрскага адміністрацыйнага аддзелу па абвінавачаньні яе ў паклёпе. Газэта выкрыла бюракратызм памоцніка начальніка 3-га аддзяленьня. Працэс вызвіў недалікі апарату. 50 сьведак, выстаўленых памоцнікам начальніка, не дапамагалі. Рэдкалегія апраўдана. Бюракратызм памоцніка начальніка пацьверджан. Аўтарытэт газэты ўзрос.

ЫАНГЕЛЬСКІ РУХ У ІНДЫІ.

Е ПАДТРЫМАЕ НІЯКАГА ВЫСТУПЛЕНЬНЯ АНГЕЛЬСКІХ ІМПЭРЫЯЛІСТАЎ.

[illegible]анэва індыйскага нацыянальнага кангрэсу.

[illegible]муг паведамленьняў і[illegible]льнага другу, індыйскі [illegible]ухвалу рэзалюцыю, [illegible] Індыя адмаўляецца [illegible]-небудзь вайне, якую [illegible]ляюцца гэтая была [illegible] Нэру, які, бароначы [illegible] склеп, у значна [illegible] порад сусьветнаю [illegible] Нэру зазначыў на [illegible]ае ваеннае авіяцыі [illegible]раніцы Індыі і на за[illegible]ваага міністра ўсім [illegible] чыноўнікам быць напагатове да [illegible]ужбы.

[illegible] заявіў Нэру — зьяўляецца вялі[illegible]

Байкот ангельскіх тавараў.

[illegible] 7-1. З Рангуну (Індыя) паведамляюць, што гандлёвы [illegible]мы пастанавіла байкатаваць ангельскія тавары ў [illegible] проці пастановы ангельскага дарадчыка пры бурмадзе, які выказаўся проці зьмяншэньня падаткаў.

ПАЎСТАНЬНЕ Ў АНГЕЛЬСКІМ КОНГА.

[illegible]АН, 7-1. Водлуг паведам[illegible]ньняў ангельскіх карэспандэнт, пасажы[illegible]ня ў Антвэрп[illegible] заяўляюць, [illegible] з Конга там паўстала племя Кванго ў вобласьці Байёка, забіла ангельскіх куп'ераў і захапіла ў палон мясцовага ангельскага агента. Міністэрства калёній гэтае паведамленьне не пацьвярджае.

[illegible] ўрад у Вансяне.

[illegible]ан-Бао» паведамляе, што ў Вансяне (у за[illegible] заснаваўся камуністычны ўрад.

[illegible] дзейнасьць камуністаў таксама на спы[illegible]к, недалёка Вузуна, нібы выкрыт камуні[illegible]арыштавана шмат асоб. Газэта паведамляе [illegible]аў у Нанчане. Некаторыя з арыштаваных [illegible]

[illegible]нежня ў Ханькоу забаставала 4.000 рабочых тэкс[illegible]ні Юва.

[illegible]І К-о РЫХТУЮЦЦА К НАСТУПУ НА ХАНЬКОУ.

[illegible] На вестках японскага міністэрства па чуг[illegible]емных спра[illegible]шныя ранейшыя прыхільнікі Тан-Шэн-Чы прышлі к згодзе [illegible]рыхтуюцца к апэрацыям супроць Ханькоу.

[illegible] кантонскіх прафсаюзаў.

ТОКІЁ, 5-1. З Кантону паведамляюць, што Лі-Ці-Сін вярнуўся ў Кантон. Генэрал Хуан-Сяо-Ян падрыхтоўвае экспедыцыю проці Чан-Фа-Гуя.

[illegible]АЛЬНЫМ ТРАНСПАР[illegible]Е ЗБРОІ.

[illegible]РАНСПАРТ. [illegible]СЯ З ІТАЛІІ ЧЭХАСЛАВА[illegible]

[illegible]мяркоўваючы здарэньне, якое адсунула крыгайным правозам зброі [illegible]катарыя аўстрыйскія [illegible] паведамленьне [illegible]ова Повім», у якім [illegible]ыкарт зброі, вы[illegible]мзе, ужо дзесяты па [illegible]лькі зброі з Італіі. [illegible]арты таксама [illegible] [illegible]ладнымі з Вэроны [illegible] праз Аўстрыю, нібыта ў [illegible]оваместа ў Славакіі (у гэтым пры[illegible]ічным гарадку вакзал належыць [illegible]рыторыі гораду—Чэха[illegible]

[illegible]руку зьмешчана афі[illegible]ніках рась[illegible]цыдэнту

У паведамленьні зазначана, што адпраўкаю транспарту кулямётных частак зьяўляецца таварыства ў Вэроне, грузжа быў адрасаваны Бэрковічу у Новаместа Славакі. У накладной нібыта зазначана, што з Новаместа транспарт гэты павінен быць без перагрузкі пасланы ў Варшаву. Вэнгерская ўлада думае, што Бэрковіч павінен быў даць адрас для далейшага кірунку грузу.

НЕЧАКАНАСЬЦЬ ДЛЯ ДЗЯРЖАЎ МАЛОЕ АНТАНТЫ.

ВЕНА, 7-1. З Бухарэсту паведамляецца, што прадстаўнікі Малое Антанты ў Вэнгрыі ужо зрабілі прадстаўленьне ўраду Батлена наконт непаразуменьня ў Сан Гавардзе. Вынікі прадстаўленьня хаваюцца ў тайне.

Некаторыя румынскія газэты заявяюць, што чарговая канфэрэнцыя Малое Антанты будзе адкладзена, часткаю ў зьвязку з выкрыцьцём кантрабандзнага правозу зброі ў Вэнгрыю, часткаю ў зьвязку з выездам румынскага міністра заможных спраў Тытулеску заграніцу.

ПРОЦІ ВОЛІ САЦЫЯЛ-ЗДРАДНІКАЎ.

АБВАСТРЭНЬНЕ БАРАЦЬБЫ НЯМЕЦКІХ МЭТАЛЁЎЦАЎ ЗА 8-МІГАДЗІННЫ РАБОЧЫ ДЗЕНЬ.

БЭРЛІН, 8-1. Усе паведамленьні з Рурскае вобласьці і Саксоніі сьведчаць аб росьце бае́вога настрою і аб пашырэньні руху сярод рабочых мэталёўцаў. У Бахумскім райёне рабочыя некаторых новых прадпрыёмстваў ухвалілі з панядзелка пакідаць заводы пасьля 8-мігадзіннага працы. У Хамборне ў часе пасяджэньня пленуму заводзкага камітэту прадпрыёмстваў Тысэна, дзе абмяркоўвалася пытаньне аб зажыцьцяўленьні трацейскае пастановы, у памяшканьне зьявіліся рабочыя і патрабавалі неадкладна правесьці 8-мігадзінны рабочы дзень. Рабочыя заявілі, што ў іншым разе яны адновяць барацьбу. Старшыня заводзкага камітэту (сацыял-дэмакрат) адхіліў гэты ультыматум рабочых.

Адміністрацыя прадпрыёмстваў Крупа адмовілася выканаць утвораную ёю з заводзкім камітэтам згоду аб зажыцьцяўленьні з панядзелка 9-га студзеня трацейскае пастановы наконт даўжыні рабочага дню. На прадпрыёмствах вывешана абвестка, што перамовы, якія былі між адміністрацыяй і заводзкім камітэтам, скасоўваюцца.

Спроба легальнае фа[illegible]шызацыі Нямеччыны

БЭРЛІН, 7-1. Агенцтва Вольфа паведамляе: заснаваны «саюз абнаўленьня нямецкае дзяржавы» абраў сваім старшынёю быўшага рэйхсканцлера Лютэра. Адозва новае арганізацыі, пад якою ёсьць подпісы 20-ці выдатных дзеячоў палітыкі, народнае гаспадаркі і рабочага руху ва ўсіх частках Нямеччыны, падкрэсьлівае, што воляю гісторыі нямецкая дзяржава пастаўлена перад задачаю абнаўленьня самое сябе праз арганічную зьмену дзяржаўнага кіраваньня. Адозва патрабуе пашырыць і паўнамоцтвы агульна-дзяржаўнае ўлады ў галіне кіраваньня і зазначае, што праз спрашчэньне ўсяго дзяржаўнага адміністрацыйнага апарату можна дасягнуць значнае эканоміі і зьменшаньня падаткаў.

ІНІЦЫЯТАРЫ «САЮЗУ АБНАЎЛЕНЬНЯ».—МЕНШАВІК НОСКЕ Ў ЛІКУ ІНІЦЫЯТАРАЎ САЮЗУ.

БЭРЛІН, 8-1. У ліку асоб, якія падпісалі адозву «саюзу абнаўленьня нямецкае дзяржавы», большасьць—нацыянал сты і сябры народнае партыі і партыі цэнтру, у тым ліку буйнейшыя прадпрыёмцы (Вісэн, Круп і інш.), а таксама прадстаўнікі «нацыянальнага аб'яднаньня нямецкіх прафэсыянальных саюзаў». Рэфармісцкія «вольныя прафсаюзы», якім прапанавалася падпісацца пад адозваю, адмовіліся даць свае подпісы. Агульную ўвагу зварочваюць на сябе пяшчырыя паводзіны нямецкай сацыял-дэмакратыі; у той час, як сябра сацыял-дэмакратычнае партыі Носке падпісаў адозву, цэнтральны орган партыі «Форвэтс» крытыкуе як «саюз абнаўленьня нямецкае дзяржавы», так і агалошаную ім адозву.

Наступ даляру на лацінскую Амэрыку.

Няпрыязьнь да Вашынгтону.

ВАШЫНГТОН, 7-1. Апошнія падзеі ў Нікарагуа ізноў павялічылі ў дзяржавах лацінскае Амэрыкі няпрыязьнь да Злучаных Штатаў і тым самым разбурылі падрыхтоўку да пан-амэрыканскае канфэрэнцыі. У зьвязку з гэтым урадавыя колы Злучаных Штатаў ужываюць усе захады, каб да моманту адчыненьня канфэрэнцыі аднавіць ранейшае становішча.

Супроцьамэрыканскі рух на Кубе.

НЬЮ-ЁРК, 7-1. З Гаваны паведамляецца, што мясцовы друк ня спыняе нападаў на Злучаныя Штаты, васпуроць загадам прэзыдэнта Кубы Матчатада, стаўленіка Злучаных Штатаў. Так, кансэрватыўная «Эль Мундо», па прыкладзе газэт лацінскае Амэрыкі, патрабуе, каб Злучаныя Штаты даказалі шчырасьць сваіх міралюбных дэклярацый яшчэ да адчыненьня пан-амэрыканскае канфэрэнцыі.

СТАЧКА НІКАРАГУАСКІХ ПАРТАВІКОЎ.

НЬЮ-ЁРК, 7-1. Забастоўка партавых рабочых у Карынто (порт, які зьвязвае сталіцу Нікарагуа горад Манагуа з морам; праз яго праходзіць 65 проц. замежнага гандлю гэтага краю) непакоіць амэрыканцаў. Амэрыканцы баяцца, што ў зьвязку з забастоўкаю спыняцца чыгуначныя зносіны з Менагуа.

Амэрыканская ўлада пацьвярджае, што два салдаты экспэдыцыйнага атраду ў Нікарагуа дэзэртавалі, але адхіляе паведамленьне «Асошыэйтэд Прэсс» аб далучэньні дызэртыраў да войск Сандзіна. У зьвязку з гэтым, „Асошыэйтэд Прэсс" ізноў паведамляе, спасылаючыся на нікарагуанскае камандаваньне, што амэрыканскія дэзэртыры служаць у войсках Сандзіна.

Вылеценўшы з Манагуа Ліндбэрг прыляцеў у Сан-Хозэ (Костарыка). Перад адлётам Ліндбэрга, у Манагуа прыбылі амэрыканскія самалёты, даставіўшыя параненых у апошніх бойках з войскамі Сандзіна.

Нікарагуа—правінцыя Злучаных Штатаў.

НЬЮ-ЁРК, 7-1 Газэты паведамляюць, што сэнат Нікарагуа абвясьціў лідэра лібэралаў генэрала Сандзіно пазакону і дазволіў Злучаным Штатам кантраляваць парляманцкія выбары ў Нікарагуа сёлета ўвосень. У пачаце прадстаўнікоў гэтая пастанова яшчэ ня ўхвалена, бо некаторая частка дэпутатаў проці яе. У зьвязку з гэтым Злучаныя Штаты дамагаюцца неадкладнага і канчатковага зацьверджаньня гэтае пастановы.

У гэтым выпадку амэрыканская акупацыя Нікарагуа будзе легалізавана яшчэ да адчыненьня пан-амэрыканскае канфэрэнцыі.

Катастрофа на Уолстрыт не ўляглася.

Заспакойваючая заява Куліджа.

НЬЮ-ЁРК, 7-1. Каб падтрымаць курс акцый, які пахіснуўся пасьля краху на нью-ёркскай біржы, Куліджа заявіў, што становішча не стварае непакою, бо крах выклікан вялікім попытам на гатоўку з боку банкаў для спэкуляцыйных мэт.

Адначасна з гэтаю заявою зьявіліся паведамленьні, ацэньваючыя становішча сталёвае прамысловасьці аптымістычна. На фондавым рынку адчуваецца яшчэ некаторае напруджаньне, але застою ў вядзелках няма.

У АПОШНІ ЧАС.

(Атрымана а 1 гадз. укочы).

ВАЙНА ЗЛУЧАНЫХ ШТАТАЎ З ЛАЦІНСКАЙ АМЭРЫКАЙ.

НЬЮ-ЁРК, 9-1. Ваенная дзейнасьць між войскам Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў і лібэралаў адбываецца зараз у гарыстай мясцовасьці. Зносіны з абвакольваючай мясцовасьцю надзвычайна абцяжараны, у зьвязку з чым амэрыканскае ваеннае камандаваньне эвакуіруе раненых пры данамозе аэраплянаў. Санітарныя аэрапляны справаджаюцца баявымі аэраплянамі, якія абстрэльваюць войска лібэралаў.

АНГЕЛЬСКАЯ РАБОЧАЯ ПАРТЫЯ—ЗА АДНАЎЛЕНЬНЕ ЗНОСІН З СССР.

ЛЁНДАН, 9-1. Выступаючы на канфэрэнцыі рабочых унівэрсытэтаў, член рабочай партыі Трэвэльян (член парляманту, міністр народнае асьветы ў габінэце Макдональда) заявіў: «Цяпер найвялікшая апаска вайны існуе —з другога; яна існуе дзякуючы тым, хто кіруе Англіяй. Палітыка бліжэйшага рабочага ўраду павінна быць накіравана перш за ўсё на аднаўленьне сардэчных адносін з СССР. Павінен быць заключан угавор, які зьнішчыў-бы ўсе пытаньні, якія засталіся нявырашанымі. Гэты ўгавор павінен быць заснаваны на запраўдным прызнаньні расейскай рэвалюцыі і ў Маскву павінен быць адпраўлен пасол, які дапамагаў-бы гэтай рэвалюцыі. Адначасна павінны падахвочвацца пазыкі, назначаныя дзеля адраджэньня савецкага гандлю».

У Саюзе ССР.

Лацінізацыя цюрскага альфабэту.

ТАШКЕНТ, 8-1. Учора ўвечары ў Старым горадзе адчыніўся пленум усесаюзнага камітэту па лацінізацыі альфабэту цюрка-татарскіх народнасьцяў. На пленум прыехалі прадстаўнікі ўсіх цюрка-татарскіх рэспублік і абласьцёў да далёкае Якутыі ўключна. Пленум заслухаў справаздачу прэзыдыуму. Дакладчык Агамалы Оглы адзначыў поспехі усюды новага альфабэту. Па справаздачы разгарнуліся доўгія спрэчкі.

Конкурс на большую ўраджайнасьць.

МАСКВА. На ініцыятыве НК РСІ і рэдакцыі «Крестьянской Газеты» і «Бедноты» арганізуецца ўсесаюзны конкурс сялянскіх гаспадарак на вышэйшую ўраджайнасьць. Конкурс павінен ня толькі выявіць гаспадаркі, якія дасягнулі ўраджайнасьці ў два і тры разы большай у параўнаньні з ураджаем даннае мясцовасьці, але і даць магчымасьць вывучыць прычыны, стварэўшыя павышэньне ўраджайнасьці, і вызначыць уплыў у гэтых адносінах калектыўных форм гаспадарчаньня. Па конкурс, па думцы ініцыятараў, павінны быць прыцягнуты гаспадарчыя калектывы і адзіначасобныя працоўныя гаспадаркі. Да арганізацыі яго павінна быць прыцягнута шырокая партыйная і савецкая грамадзкасьць.

Па БССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Як праходзяць перавыбары ў спажывецкай каапэрацыі.

Актыўнасьць пайшчыкаў узьнялася.

Ворша. За апошнія два тыдні праведзены перавыбары ў 11 спажывецкіх таварыствах, якія яднаюць 5406 пайшчыкаў. Напярэдадні перавыбараў было праведзена 20 сходаў беднаты з агульным лікам удзельнікаў 736 ч. і 5 сходаў моладзі. Усе гэтыя сходы прайшлі досыць актыўна і беднота шла на перавыбарныя сходы арганізавана.

У перавыбарных сходах прынялі ўдзел 3552 пайшчыкі, ці 67,7 проц. агульнага ліку апошніх. Апрача таго, на гэтых сходах прысутнічала і прымала ўдзел у абгаварэньні справаздачы праўленьняў 1313 чалавек некаапэраванага сялянства. На гэтых сходах, якія рабіліся па паасобных вёсках, абіралі ўпаўнаважаных для перавыбараў праўленьня.

На сходах упаўнаважаных прысутнічала 76,9 проц. агульнага ліку абраных. У новыя праўленьні абрана 29 чал., з якіх 14 партыйцаў і камсамольцаў, а рэшта беднякі і сераднякі; у рэвізійныя камісіі абрана 27 чал., з іх 10 партыйцаў і камсамольцаў, 3 беднякі і 6 сераднякоў. Паогул трэба сказаць, што ўсюды праходзілі кандыдатуры, якія высоўваліся партыйнымі ячэйкамі, што сьведчыць аб падняцьці аўтарытэту апошніх.

Кулакоў ня пусьцілі.

Слуцак. Дагэтуль праведзены перавыбары па 26 спажывецкіх таварыствах. Гэтыя таварыствы яднаюць 17759 пайшчыкаў. Раней справаздачных сходаў праведзены 54 сходы беднаты, у якіх прымала ўдзел 1929 ч., 4 сходы жанчын і 3 моладзі з агульным лікам удзельнікаў 405 чал.

На сходах пайшчыкаў заслухоўваліся справаздачы праўленьня і абіраліся ўпаўнаважаныя. У гэтых сходах прымала ўдзел 1259 пайшчыкі, што складае 74 проц. ад агульнага ліку апошніх; разам з тым у справаздачна-перавыбарчых сходах прынялі ўдзел 7738 чал. некаапэравага насельніцтва.

У новыя праўленьні абраны камуністыя, камсамольцы, беднякі і лепшая частка сераднякоў. Кулакі хацелі вялі сваю «падрыхтоўчую» кампанію, але атрымалі належны адпор і кандыдатуры, якія высоўваліся апошнімі ва ўпаўнаважаныя, усюды провальваліся.

Заможным пралезьці не ўдалося.

Полацак. Перавыбары праўленьняў у спажывецкай каапэрацыі пакуль-што закончаны ў 27 спажывецкіх таварыствах. На перавыбарных сходы ў сярэднім зьявілася ўсяго толькі 42,5 пр. агульнага ліку пайшчыкаў. Трэба адзначыць, што актыўнасьць прысутных на сходзе была надзвычайная: кожная галіна працы каапэрацыі была абгаворана на сходзе. Цікава адзначыць, што разам з пайшчыкамі на справаздачных сходах прысутнічала па 27 таварыствах 3662 чал., якія таксама прымалі ўдзел у працы сходаў.

На сходах упаўнаважаных з 2504 абраных прысутнічала 1688 чал., што складае звыш 67 пр.ц. У новыя праўленьні і рэвізійныя камісіі абрана шмат болей, чым летась, камуністаў і камсамольцаў, а таксама і беднякоў. Заможным у праўленьні пралезьці не ўдалося.

В.

АРГАНІЗАЦЫЯ МЭЛІАРАЦЫЙНАГА ТАВАРЫСТВА.

Уваравічы, 7-1. Уваравіцкі райвыканком прызнаў неабходным арганізаваць мэліарацыйн. каапэрацыю для населеных пунктаў, зямля якіх размешчана на балотах р. Узы. Апрача таго ўзьнята хадайніцтва перад акр. зямельным аддзелам аб адчыненьні пракатнага пункту лугавога інвэнтару.

60.000 РУБ. НА ЗАГАТОЎКУ НАСЕНЬНЯ ДА ПАСЕЎНАЙ КАМПАНІІ.

Ворша, 9-1. Для фінансаваньня загатовак насеньня да вясеньняй пасеўнай кампаніі ў першым квартале гэтага году было адпушчана акруговаму сельска-гаспадарчаму крэдытнаму таварыству 40.000 руб. Загатоўка вядзецца праз нізавую сетку сельска-гаспадарчай каапэрацыі і мясцца надзея, што плян будзе выкананы поўнасьцю. Гэтымі днямі чакаецца дадатковы вокпуск з Белсельбанку на крэдытаваньне загатовак яшчэ 20.000 руб.

ГРАМАДЗКАЕ ХАРЧАВАНЬНЕ ПАШЫРАЕЦЦА.

Барысаў, 9-1. Зараз у горадзе і П.-Барысаве існуе 5 сталовак ЦРК, з якіх 3 знаходзяцца пры больш буйных фабрыках П.-Барысаве. Гэтымі днямі праводзілася абсьледаваньне сталовак спэцыяльнай камісіяй з прадстаўнікоў Белрабсэкцыі. У выніках абсьледаваньня прымаюцца меры да яшчэ большага паляпшаньня якасьці абедаў і наогул да ўтаненьня грамадзкага харчаваньня.

Абяцаюць.

Расасенскі сельсавет толькі аднаго просіць: «Дайце магчымасьць працаваць». Але-ж на вялікі жаль, сам Дубровенскі РВК не дае ніякой магчымасьці працаваць.

«Неабходна хуткая рэканструкцыя памяшканьня Расасенскага сельсавету».

Вось пра такую пастанову РВК, казаў мне сэкратар сельсавету амаль ня два гады таму назад.

Калі і цяпер запытацца працаўніку сельсавету, зачым не напраўляюць памяшканьня, дык адкажуць: «РВК усё яшчэ абяцае»...

Нядаўна сам старшыня РВК заявіўся, што ў канцылярыі так сьцюдзёна, а сэкратар ніша.

— І рукі ня мерзнуць?

— Нічога, я ўжо прывык.

А калі зойдзе ў канцылярыю селянін,—пачэша патылічу і скажа:

— А, бацюхны! У вас тутатка хоць ваўкоў ганяй і дзюркі, аж на самую вуліцу—сабака пралезе.

Ідзе селянін на падлозе, а старшыня с.-с. папераджае:

— Асьцярожна Трахімка, а то дамоў на кіях вернешся. У нас кволыя дошкі.

Вось так некалькі гадоў мучацца і мусіць яшчэ доўгі час будуць дарпець з-за нядбайных адносін РВК.

Астап Суніца.

Дубровенскі р., Аршаншчына.

Трэба дапамагчы.

31-га сьнежня ў нас адбыўся агульны сход пайшчыкаў пачатка сельска-гаспадарчага таварыства «Земляроб».

Дакладчык на гэты раз высьветліў запраўднае становішча т-ва «Земляроб».

— У мінулыя гады нам казалі ня-праўду, заўсёды падчалёўвалі; на справе мы ў гэтым годзе маем дэфіцыт на 18.000 руб. Знаходзіліся такія тавары ў грашовых сумах і ў парадачных, як агародная насенье ў выглядзе пылу і гнільля. Прыйшлося яго выкінуць, панізіць цэны, што і дало сёлета дэфіцыт.

Шмат было недахватаў і з грашмі і з крамамі. Прыказчыкі практыкавалі падробы і іншыя злачынствы.

Культурнай працы не вялося.

Малочныя аддзяленьні далі таксама дэфіцыт.

Пайшчыкі далі дырэктывы: аддаць над суд быўшае праўленьне, пазялічыць паі, прасіць пазыку на пакрыцьцё дэфіцыту, малочныя прадпрыемствы перавесьці на арцелі, пры хатах-чытальнях адчыніць куткі каапэрацыі, бібліятэкі з адпаведнай літаратурай.

Выбралі 15 упаўнаважаных.

А. Іваноў.

Александрова, Гарадоцкі

[illegible]ТОРЫІ ЛІТОЎСКАЕ БУРЖУАЗНАЕ ДЗЯРЖАЎНАСЬЦІ.

[illegible]ьскае і літоўска[illegible] буржуазеі [illegible]ўночна-заходнюю частку Бе[illegible] маленькай Літве вырокую [illegible]сьвецо, нават за межамі Э[illegible]ацца навялічэньне цікавасьці [illegible]а і мінулага Літвы, таксама [illegible]таварыства сучаснае літоўскае [illegible] гэтага бесспакойнага і не[illegible]ся справы міру карціна, [illegible] зьяўляецца буржуа[illegible]ходзіць і нам пераглядзець [illegible]оўныя моманты гэтае і[illegible] што толькі пялаўна м[illegible] абвяшчаньня „незалежнасьці Літвы.

[illegible]915 году, пасьля вялікага [illegible]асейскае армі, усесь аб[illegible]Літвы, Польшчы і Заходняе [illegible]я занятым нямецкай ар[illegible] Польшчы і Літвы нямецкі [illegible]—загадзя падрыхтаваны [illegible]ераба было толькі дэталізаваць [illegible]ваць, кіруючыся раней вызна[illegible]оўнымі лініямі. Адносна Бела[illegible]заг для вызначаньня плянаў ня [illegible] заграніцы беларускіх абшараў [illegible]ньня не разлічаў. Зазна[illegible]ход да Беларусі зьявілася дзеля яго [illegible]ьнасьцю.

[illegible]ка Літвы вялікі нямецкага імпэра[illegible]ежылі і да здаравьня не ад Ра[illegible]ейскага ня абяднаньня з [illegible]. Самаўж форма абяднаньня [illegible]мрыяна пазерад, і тут магі[illegible]ны хістаньні ад незалежнае [illegible] зьвязанае з Нямеччынаю вае[illegible]ым і іншымі саюзамі, да [illegible]ае Нямеччыны з большай ці мешан[illegible]

[illegible]імпэрыялісты разлічалі, што [illegible] Літва, наложная побач з [illegible] Нямеччынаю, зьявіцца натуральным [illegible]ным абшарам дзеля зьлітку на[illegible]сьці з Нямеччынай. Адсутнасьць [illegible]ых надраў нацыянальнае інтэлігэнцыі [illegible] нацыянальнае [illegible] культурнасьці ніяк у Літве [illegible]

[illegible]ваньня і самаўпраўленьня з каранною Нямеччынаю.

Літоўскія буржуазна-нацыяналістычныя дзеячы ведалі гэтыя імкненьні нямецкага імпэрыялізму, але тым ня менш ішлі ім насустрач, бачачы ў адарваньні ад Расеі і абяднаньні з Нямеччынаю азіяцкую магчымасьць дзеля нацыянальна-культурнага літоўскага будаўніцтва. Сярод гэтых дзеячоў знаходзіліся (і гэта трэба асабліва падкрэсьліць пазер) таксама сучасны прэзыдэнт Літвы Антон Смэтона і старшыня сучаснага фашысцкага ўраду Літвы—праф Вальдэмарас.

28 лютага—3 сакавіка 1916 г. адзін з дзеячоў нічэкае арэнтацыі Габрыс склікаў у Берліне з'езд літоўскіх дзеячоў. Канферэнцыя палічыла магчымым высунуць толькі трэбаваньне аб аўтаноміі Літвы ў межах Нямеччыны. Трэбаваць незалежнасьці канферэнцыя не адважвалася. Нямеччына знаходзілася на вяршыні сваіх ваенных посьпехаў і трэбаваць што-небудзь а[illegible]яе ня вельмі-то можна было.

Тымчасам у самой Нямеччыне было шмат упливовых прадпрыёмцаў далучэньня Літвы да Нямеччыны. Прускія аграрыі не жадалі канкурэнцыі вытворчаў літоўскае сельскае гаспадаркі, а рабочыя прамысловых раёнаў Нямеччыны апасаліся, што депутаты з рэйхстаг ад Літвы (як вякультурнае і сельска-гаспадарчае краіны) будуць рэакцыйнымі і пагоршаць сутнасьціны сілу на некарысьць рабочых. На гэтыя тэмы вялося шмат спрачак. Аўтарытэтнасьць Берлінскае канферэнцыі і яе права гаварыць ад імя літоўскага народу былі пастаўлены пад знак запытаньня. Нямецкі ўрад вымушаны быў запрасіць у Берлін не выпадкова сабраных літоўскіх дзеячоў, а прадстаўнікоў ад палітычных партый і арганізацый з самае Літвы.

У другой палавіне сакавіка 1917 г. у Берлін прыехала дэлегацыя з трох прадстаўнікоў: ад сацыял-дэмакратаў—д-р. Скайрыс, ад саюзу каталікоў Літвы (вальнейшы „крышэўскі" хадзкаў) кесідз Шаўліс, [illegible] (вальнейшых таўшінкаў)—Антон Смэтона. Гэтая дэлегацыя падала мэмарандум у нямецкае міністэрства замежных спраў. Паставіць пьёрда пытаньне аб незалежнасьці Літвы дэлегацыя не асьмелілася, як і Берлінская канферэнцыя 1916 г. Дэлегаты выказалі толькі тое, што ім было дазволена нямецкім урадам. Сацыял-дэмакраты Літвы так-жа згіналіся і поўзалі перад нямецкім імпэрыялізмам, як і іх буржуазныя сябры.

Нямецкі ўрад ня даў ніяк адказу дэлегатам, што ён мецада зрабець з Літвою: ці проста далучыць яе да Нямеччыны на подставе аўтаноміі ці даць ёй «незалежнасьць» абмежаваную радам „саюзных" умоў).

Толькі расейская рэвалюцыя з яе лёзунгамі самавызначэньня народаў паставіла на чаргу дня пытаньне аб незалежнасьці Літвы. Літоўскія дзеячы ў Ленінградзе зьвярнуліся да Мілюкова з просьбаю пад

Рабочае жыцьцё.

Ход калдагаворнай кампаніі па саюзу сельгаслесрабочых.

Падрыхтоўчая праца да пра[illegible]ня калдагаворнай кампаніі на саюзу сельска-гаспадарчых і лясных рабочых пачалася яшчэ з ліпеня м-ца 1927 г. Згодна дырэктывам ЦП саюзу, на мясцох былі падвезены вынікі калдагаворнай працы саюзу сярод лесарубаў і плытагонаў за 1926-27 аэрацыйны год. Акрамя, гэтага на сходах лесарубаў і плытагонаў абгаварваўся праэкт неабходных зьмен і данаўненьні да існуючага калдагавору з мэтай паляпшэньня працы і прававых норм рабочых. Пасьля гэтага пры ЦП саюзу была склікана ўсебеларуская нарада саюзных працаўнікоў лесарубных райёнаў і прадстаўнікоў ад рабочых лесарубаў і плытагонаў, на якой быў дэтальна апрацован праэкт новага калдагавору. Кавчаткова дагаворы па лесарубаў і плытагонаў заключаны ў лістападзе м-цы. Гэтымі дагаворамі ахвачана да 30.000 лесарубаў і плытагонаў. Трэба адзначыць, што новыя калдагаворы маюць у гэтым годзе цэлы шэраг значных паляпшэньняў, у параўнаньні з мінулым годам. Асноўным дасягненнем новых калдагавораў зьяўляецца тое, што у іх канкрэтна абгавораны ўсе прававыя нормы рабочых. Так, з мэтай далейшага, болей правідловага рэгуляваньня працы рабочых на лесараспрацоўках і сплава, а таксама і выкарыстаньня беспрацоўных, дагаворы прадугледжваюць выдзяленьне груп сезонна-штатных рабочых. Гэтым групам гаспадарчыя органы павінны даваць пастаянную працу і аплачваць згодна тарыфнай сеткі. Сябром саюзу і батракам гаспадарчыя органы павінны прадстаўляць інструманты. Ратыфікацыя калдагавораў [illegible] бочым-жа, якія працуюць свімі ўласнымі інструмантамі, адміністрацыя павінна плаціць за амортызацыю іх. І яшчэ цэлы шэраг паляпшэньняў дабіўся саюз. Так, напрыклад, уведзена аплата за праезд на працу па 5 кап. з кілемэтру па грунтовых дарогах і каштоўнасьць білетаў на чыгунках. Рабочым, якія прыяжджаюць з далёкіх мейсц, павінны быць прадстаўлены кватэры, альбо аплачваць кватэрныя.

Разам з калдагаворамі на рабочых лесарубаў і плытагонаў саюз сельгаслесрабочых ужо заключыў дагаворы з гаспадарчымі ворганамі на служачых лесараспрацовак і плытагонаў. Трэба адзначыць, што гэтыя дагаворы ўпяршыню заключаліся саюзам сельгаслесрабочых. Дагаворы на служачых абгаварваліся на мясцох і ўсе прапановы былі вучцены пры заключэньні калдагавораў. Асабліва вялікіх посьпехаў дабіўся саюз на дагавору з Заходнімі чыгункамі, на якому ў мінулым годзе было дапушчана шэраг памылак. Так, павялічаны стаўкі 1-га разряду для служачых, агавораны шэраг прававых момантаў, як прадстаўленьне бясплатных кватэр, папраўленьне норм спецадзеньня і г. д.

Саюз таксама дабіўся павялічэньня сум на спецадзеньне для лясьнікоў, павялічэньне крэдытаў на жылбудаўніцтва, павялічэньня водпуску дроў тым лясьнікам, якія жывуць у наёмных кватэрах.

Вось што дабіўся саюз сельгаслесрабочых адносна паляпшэньня быту і становішча рабочых.

Калдагаворная кампанія на саюзу сельгаслесрабочых павінна быць скончана да 15 студзеня. **М. А.**

Прафсаюзная праца на прыватных прадпрыёмствах.

На апошнім насяджэньні прэзыдыуму ЦСПСБ быў заслуханы даклад аб выніках абсьледваньня прафсаюзнай працы сярод рабочых прыватных прадпрыёмстваў. У дакладзе былі прыведзены даныя аб удзельнай вазе рабочых, занятых у прыватных прадпрыёмствах у параўнаньні з іншымі рабочымі сябрамі прафсаюзаў. Спыніўся таксама дакладчык на «обходах» і правапарушэньнях з боку прыватных прадпрыёмцаў: дагэтуль прыватнікі спрабуюць скарыстоўваць таемна рабочую сілу; назіраюцца фіктыўныя кампаньёнствы, няправільныя разрахункі з рабочымі і г. д.

Прэзыдыум ЦСПСБ у рэзалюцыі адзначыў, што момант неразаключэньня калдагавораў з прыватнымі прадпрыёмцамі павінен рабіцца саюзамі ў найбольш карысны из ўмовах вытворчасьці для саюзаў чыг. Зарплата ў прыватных прадпрыёмствах павінна быць вышэй, чым у дзяржаўных прадпрыёмствах і саюзам даедзены дырэктывы, каб быў узяты курс на яе павялічэньне там, дзе яна ніжэй, чым у дзяржаўных.

Паміж іншым, прэзыдыум ЦСПСБ лічыць неабходным, у мэтах зьлікідаваньня авансаў у разуках зарплаты, устанаўліваць штотыдневую выплату апошняй. У сувязі з выпадкамі несвачэчасовай выплаты вярплаты і няправільных разрахункаў пры звальненьнях, лічыць неабходным унясьсьне ў дагаворы пунктаў аб тым, што звальненне лічыцца са дню канчатковай расплаты.

Прэзыдыум ЦСПСБ зварачвае ўвагу НК Юстыцыі і працоўнай пракуратуры на неабходнасьць тэрміновага разглядаць у працоўных сэсіях іскавыя і крымінальныя справы супроць прыватнікаў і хутка і поўнасьцю правозіць іх у жыцьцё.

Зварочана таксама ўвага саюзаў на неабходнасьць узмацненьня кас узаемадапамогі на прыватных прадпрыёмствах. **В.**

Завод ажыў.

Сярод лясістых нетраў Случчыны, на тым месцы, дзе калісьці сталі завод яснавяльможнага пана Незабытоўскага, адбудован савецкімі рукамі новы вялікі шкляны завод «Акцябр».

Не назваць цяпер гэтага заводу. Замест сырых малых і цесных памяшканьняў адбудованы высокія, новыя, прасторныя і сьветлыя памяшканьні. Адбудована сталоўка для рабочых. Печы перабудованы. Цяпер ужо яны ня будуць бязьлітасна паліць цела рабочых.

Цяпер каля заводу пабудована некалькі домікаў над кватэры рабочых. Весела іскрыцца электрычнасьць на ўсяму заводу.

Цяпер пры заводзе пабудована школа, пабудована амбуляторыя, адчынен аапэратыў.

Хіба аб гэтым мог марыць рабочы раней. Не, ніколі.

Вось нагэтаму факт перабудовы заводу ператварыўся ў вялікае радаснае сьвята.

Гучна грымеў аркестр. Весела было на сэрцах рабочых.

Такой урачыстасьці яшчэ ня бачыў завод.

Успаміналі рабочыя свайго былога эксплёататара. Успаміналі і з жартам казалі, што апошні-б панэўна памер-бы, набачыўшы новы завод і ўрачыстае сьвята рабочых на выпадку яго аднаўленьня...

А назаўтра запылалі вялізныя печы заводу, зазьвінела шкло, задрыжэлі варштаты. Завод ажыў. 600 рабочых прыступілі да працы ў нова адбудованым шкляным заводзе „Акцябр".

Бабруйшчына. **А. Дамброўскі.**

Няпрыкметныя гэроі.

У дыму грамадзянскай вайны, пад самым Перакопам, шалёным снарадам яму адарвала нагу ў той час, калі, па рэвалюцыйнаму загаду чырвонага камандзіра, ён кідаўся разам з сваімі таварышамі на апошнюю рашучую атаку белагвардзейскіх пазіцый. Ён пацяліва вынес і месяцы ў шпіталю, і часамі цяжкія хвіліны першых год мірнага будаўніцтва. Ён зусім не ганарыўся зробленым ім, таму, што ці мала сотняў і тысяч іншых страцілі свае рукі, ногі і ўсё сваё здароўе на палёх боек, дзе яны вялі гэраічную ўпартую барацьбу з ворагамі працоўных, дзе яны, забыўшы ўсё, са зброяю ў руках, баранілі права на лепшую будучыну ўсяго чалавецтва.

А потым, калі замоўклі гарматы і кулямёты, калі над гэраічным пацісканам Чырвоных войск уцякалі за мора і акіяны контр-рэвалюцыйныя банды капіталістаў і белагвардзейцаў, калі увесь Савецкі Саюз, адклаўшы ў бок баявы меч, адважна ўзяўся за сацыялістычнае будаўніцтва—тады здарылася нешта яшчэ больш вялікае і значнае. Тыя, хто на чырвоным фронце страцілі ў агні баёў усе свае сілы і ўсё сваё здароўе, хто вярнуўся дамоў у свае гарады і вёскі скалечаным і стомленым, тыя, хто на вышэйшаму маральнаму праву маглі-б патрабаваць ад дзяржавы працоўных клопатаў аб сабе і свайго поўнага забясьпечаньня, яны не захацелі карыстацца сваім правам, яны не захацелі быць толькі гледачамі пачатага вялікага сацыялістычнага будаўніцтва.

— У краіне працы ня можа быць гультаёў! казалі яны і, замяніўшы вінтоўку на малаток ці гэбель, бязногія і бязрукія адважна ўвайшлі ў шэрагі рэвалюцыйных будаўнікоў сацыялізму. З гэрояў грамадзянскай барацьбы, з легендарных байцоў за волю працоўных яны зрабіліся прыкметнымі гэроямі працы, адданымі і ўпартымі будаўнікамі новага пралетарскага жыцьця!

Увойдзем вось сюды, на гэту вуліцу што завецца цяпер Камсамольскай, у гэты досыць пахмурнага выгляду шматпаверхавы дом, падымемся на яго шырокіх драўляных сходках. Тут працуе шавецкая арцель інвалідаў, тут 32, пераважна гэрояў вайны, восем галзін у суткі стукаюць малаткамі, зарабляючы сабе хлеб і гэтай сумленнай працай укладаючы і сваю маленьку частку ў будаўніцтва сацыялізму ў саюзе працоуных.

У вас толькі інваліды працуюць? —пытаю ў старшыні мясцкому.

—Так, за выключэньнем майстраў для навучаньня некваліфікаваных,—уважліва адказвае апошні,—але і тут мы стараемся нават інструктароў наступова замяняць нашымі-ж інвалідамі.

—А колькі зарабляеце?

— У сярэднім рублёў семдзесят у месяц.

— І вам хапае?

Нічога, жыць можна!

— Культпрацу таксама не забываем. Маецца рэдкалегія, якая досыць рэгулярна выпушчае насценную газэту. Маецца перасоўная бібліятэка, якая штотыдня абмяньваецца ў саюзе гарбароў.

Амаль усе сто процантаў выпісваюць газэты і часопісі—мясцовыя і цэнтральныя.

—Ну, што ж, ня цяжка вам працаваць вось гэтак бязрукім і бязногім—пытаю пры разьвітаньні ў абступіўшых мяне інвалідаў.

Нішто, спраўляемся!—бадзёра адказваюць усе разам інваліды.

А адзін дадае:

—Усе павінны працаваць, а чым-жа мы горшыя за іншых?

І зноў бадзёры стук маленькіх малаткоў напаўняе пакоі, і растуць горы пашытага абутку—вынікі сумленнай працы няпрыкметных гэрояў інвалідаў.

Н. П.

Захады да забясьпечаньня Менску вадой.

У бліжэйшыя месяцы распачнецца дасьледчая праца для пабудовы новай водаправоднай станцыі.—Вясной г.г. на існуючай водаправоднай станцыі будуць устаноўлены 3 моцныя насосы і водаём на 50.000 вёдзер вады.

На розных сходах працоўных Менску часта скардзяцца на тое, што наш водаправод працуе з перабоямі і паогул, не задавальне, як належыць, горад вадой.

Справа ў тым, што Менская водаправодная станцыя вельмі старая: яна пабудавана гадоў 50-60 таму назад і за апошнія 20 год зусім не пашыралася, а між тым насельніцтва Менску з году ў год павялічвалася. Не зважаючы на тое, што запас вады ў станцыі падасьцца на 13 проц. больш, чым у даваенны час, усё-ж яе не хапае, бо лік насельніцтва павялічыўся ня менш як на 30 проц., а яшчэ больш вырас лік дамоў, у якія праведзена вада.

Апрача таго, гарсавет быў прымушан зачыніць некалькі нагнабоких студняў, якія раней абслугоўвалі горад вадой, і зачыніць з прычыны дрэнняй якасьці вады. Зразумела, што гэта мерапрыёмства таксама адбілася на недахвацы вады.

Усе гэтыя абставіны гарсавет прадугледзіў яшчэ ў 1925 годзе і намеціў плян для разьвязваньня гэтага вельмі важнага пытаньня. Плян у асноўным зводзіцца да наступнага:

Першым чынам павялічыць колькасьць студняў на водаправоднай станцыі і магутнасьць насосаў. Наогул, гарсавет мяркуе паступова пашырыць водаправодную станцыю, каб канчаткова зьлікідаваць водзяны крызіс.

Да выкананьня гэтага пляну было прыступлена яшчэ 2 гады таму назад:—было распачата буроньне 2 новых артэзіянскіх студняў на тэрыторыі водаправоднай станцыі. Тады-ж былі заказаны 2 электрычныя цэнтрабежныя насосы магутнасьцю ў 20.000 вёдзер у гадзіну, старыя-ж гарызвы насосы давалі ўсяго толькі 11.000 вёдзер у гадзіну. Гэтая праца была скончана яшчэ ў 1926 годзе, але калі было прыступлена да адкачкі вады з новых студняў, то высьветлілася, што апошнія часткай перахватваюць ваду ў старых студнях, відаць, з прычыны невыстарчальнай магутнасьці водаяной крыніцы, якая дае ваду студням водаправоду.

Такім чынам, высьветлілася, што стары плян, які прадугледжваў штогоднае павялічэньне колькасьці студняў на станцыі, нельга выканаць.

Перад гарсаветам паўстала пытаньне аб неабходнасьці пабудовы новай водаправоднай станцыі на новым месцы. Зразумела, што гэта значна ўскладніе пытаньне як у сэнсе атрыманьня неабходных сродкаў, так і ў сэнсе распрацоўкі пляну пашырэньня водаправоду. Раней, чым пачаць складаць плян, неабходна правесьці вялікую дасьледчую работу, каб знайсьці месца для пабудовы новай станцыі.

Пабудову станцыі і поўнае забясьпечаньне вадой гораду, у зьвязку са складанасьцю гэтай справы, можна канчаткова разьвязаць на менш як у 2-3 гады. Але разам з тым можна і неабходна прыняць шэраг мер, якія на перу гадоў зьменшаць водзяны крызіс

Гэтыя мерапрыёмствы гарсавет намеціў, і ў асноўным яны наступныя:

1) устаноўка над існуючымі скважынамі новых насосаў глыбокай адкачкі, што дасьць магчымасьць павялічыць здабываньне вады прыблізна на 25 проц. Ліцэнзія на атрыманьне 3 замежных насосаў ужо атрымана, і ў бліжэйшыя тыдні будзе зроблен заказ. Гарсавет прымае ўсе меры да таго, каб да пачатку лета гэтыя насосы былі ўстаноўлены і пушчаны ў работу.

2) Пабудова жалезна-бэтоннага рэзэрвуару на 50 000 вёдзер. Цяпер на станцыі ёсьць рэзэрвуар толькі на 15.000 вёдзер. З устаноўкай новага рэзэрвуару будзе магчымасьць расходаваць у дзень на 50.000 вёдзер вады больш, чым было дагэтуль.

3) У бліжэйшыя месяцы будуць распачаты дасьледы для пабудовы новай водаправоднай станцыі. Між іншым гэтыя дасьледчыя работы, якія будуць заключацца ў буреньні скважын, ужо ўлетку гэтага году дадуць некаторую дадатковую колькасьць вады.

Такім чынам, гэтыя мерапрыёмствы павінны прывесьці да таго, што падача вады гарадзкім водаправодам паступным летам значна павялічыцца, але, ня гледзячы на гэта, усё-ж нельга разьлічваць на ліквідацыю водзянога крызісу, бо насельніцтва ўсё павялічваецца, а адначасова вельмі шпарка разьвіваецца будаўніцтва

В. З.

ВОЎЧЫ ЛОГ.

(Апавяданьне).

Хораша ў полі зімою... У полі асьнежаным, дзе такія гурбы прыгожыя, неахопная шырыня і празрыстае неба, што пачынае цямнець з падыходам вечару.

Серабрыцца сьнег, мільгацяць пязьлічаныя мілёны брыльянці стых іголак, вецер-кусака шчыпле шчокі і нос, дабіраецца за каўнер, нявідзімкаю прабіраецца над кажух са сваёю халоднай пяшчотай. Жмешся, пацягваешся, падбіраеш пад сабе ногі, да якіх вельмі ахвоч мароз са сваімі балючымі пацалункамі.

Але ўсё-ж-такі добра. Так бадзёра скрыпяць палазы, сьнежны пыл ляціць з пад капыт, абдае цябе ледзяністымі пырскамі, аж зажмурваеш вочы. А калі бягуць—падганяць ня трэба—дарога крышталь, дарога склізка, чаму-ж ня бегчы.

Надыходзіць вечар, сінеюць сьнегавыя гурбы, ад блядага месяцу цягнуцца празрыстыя промені і ня зьзяюць, а тлеюць над лесам і полем. Сінія цені плывуць за кустамі, кладуцца ў баразёнкі, у сьнегавыя калдобіны. А зоры, тыя нібы вылящець хочуць з сваіх недасяжных гнёздаў, да таго яркі, бліскучы яны ў марозным паветры.

І салодкі сум закрадваецца ў сэрца, ціхі сум, непазнаны. Здаецца, што пяюць над табой сярэбраныя жаўранкі, заліваюцца таемныя бомы цудоўнымі танюсенькімі пералівамі, якія казытаюць кроў, перамешваюць радасьць і сум, нагружаюць цябе ў нябыцьцё... Нібы вясна абыймае цябе пахучымі кветкавымі абнімкамі.

То пачынаецца драмаць...

— Н-но... гнеды...

І зноў скрыпяць палазы, скрыпяць упарта і мілагучна. Іх скрып далёка разносіцца па полю, здаецца, ад гэтага скрыпу зацярушыўся сьнег вунь з той сагнутай галінкі бярозы, прытуліўшайся ля дарогі.

Скрыпяць палазы...

А ноч спускаецца ніжэй і ніжэй на сьнегавыя абшары і ўсё навакол пачынае прымаць воблік нявыразнай фантастыкі. Вунь бяроза пасоўваецца на нас нязграбнаю цёмнаю гурай, дубовы куст ня куст, а таемнае чудзішча. Нават здаецца, што шавеліць ён кручкам-рукамі, маніць, набіць да сябе варожай таемнасьцю. Цішыня навакол, ні гуку, ні стуку, і яшчэ бадзёрай скрыпяць палазы.

Уяжджаем у лес. Спачатку рэдкія хвойкі, голыя бярозы, алешнік. Чым далей у лес, тым гусьцей дрэвы, тым вышэй магутныя сьнегавыя шапкі, што маўчаць, не зварухнуцца, нібы думаюць думу, нібы мараць у халодным сьне. Аб чым? Запытай іх, мо' даведаешся. Мо' аб лепе цёплым, аб яркім сонцы, аб бярозавым соку вясновым, аб бліскучым дубовым лісту... Маўчаць сьнегавыя шапкі, нахіліліся галіны пад белым уборам. Унізу змрок і ў ім блядыя плямы ад месяцу. У іх калмаціцца асьнежанае ламаччо-гальлё, выступаюць пні ў прытульных сьнегавых ямках.

Добра ў лесе і страшна, прызнаюся. Прыгнятае нязвычайная цішыня, якая нібы павісла ў паветры, не зварухнецца. Толькі гайданецца часам галіна і пасьміцца з жудлатае хвоі серабрысты пух, зацярушыцца ціха, ціха на зялёных іголках. А вуха адразу напружана ловіць гэтыя ледзь чуткія гукі, настаражваецца, гатова прагалынуць, уцягнуць у сябе ўсю цішыню, каб не прапусьціць, не абмінуць ніводная шораху, ні трэску замерзшай галінкі.

А сьлядоў колькі ў лесе, розных сьлядоў. І вялікія, і маленькія, разьбягаюцца ва ўсе бакі на чыстаму сьнегу і сплятаюцца ў сьнегавыя вузоры, разыходзяцца над навісшым гальлём, хаваюцца над ёлкі і хвоі.

— Вунь заяц прабег, а то воўк сігануў ад дарогі, бач, на сажань скочыў... А тут, бач, цэлае вясельле пабегла, ім абтаптаны сьнег каля хвоі...

Коні ідуць паволі, часам старожка стрыгуць вушні, фыркаюць, калі ў змрочаным гушчары трэсьне замарожаная галінка, ці мякка ўпадзе сьнежны камяк з абцяжаранае яліны.

Дзед Ігнат сымае свае паўпудовыя сподкі, дастае каптук і ў хуткім часе на яго твары пачынаюць грань яркія водблёскі, а сам ён увесь хаваецца ў шэрых клубах даўкага дыму. Пішка дзеда смыліць ваўсю. А калі пішка гарыць, значыць дзед Ігнат абавязкова што-небудзь ды скажа, такі ўжо дзедаўскі звычай.

— А мароз тае, мацнее...

— Чаму-ж яму і не мацнець, яго-ж сьвята, піліпаўка.

— Яно так, піліпаўкі. Н-но, гнедыя, варушыся, нято закарэзьнеце з холаду. Але хіба і разгонішся тут. Дарога кепская, хоць бы хутчэй выбрацца з гэтага воўчага логу.

— Чаму воўчы?—пытаю.

— А хіба я ведаю, так ужо людзі прозвалі, дый расказываць доўга—даўно было...

Вядома, дзед раскажа. Яму ня стрымацца, бо любіць стары пагаварыць, ператрэсьці ў памяці мінулае, даўно пражытое. Але-ж трэба трохі пафанабэрыцца, звычайна гэта ўжо ў чалавечай натуры.

. . . . . .

— Ну, дык вось слухай. Жыў калісьці ў маёнтку нашым пан. Пан як пан і звычайная душа панская—жыў, гуляў, пеставаў паню. А пані была дзіўная. Ні то што дзіўная, а ня к ночы будзь сказана, сатана сатаной, з нячыстаю сілай была ў вялікім сваяцтве. Але што гаварыць, сабой была вельмі прыгожа і такія вочы былі прыгожыя, што зірнеш у іх і холадна стане на сэрцы, нібы вып'юць цудоўныя вочы тваю душу да дна і пакінуць пусточу.

Адкуль узялася яна—ніхто ня ведаў. Казалі адны, нібы прывёз яе пан з-над Турэччыны, другія казалі, што была яна з Вэнгрыі. Але толкам ніхто ня ведаў, ды й ня цікава гэта. Ведалі толькі, што вялікую сілу мае яна над панам, такую сілу, як ніхто. Ходзіць пан у яе на ланцужку. З намі грозны, а перад ёй ніжэй травы, цішэй вады. Так і пасьцілаецца лістом асеньнім, выпаўняе прыхамаці заморскай пані. Але дзе яму выпаўніць, стары быў ужо, недалужны.

Затое і былі заўсёды буры ў панскіх пакоях. Вышчарыцца яна на яго, а ён толькі лыпае вачмі, трымціць, як асінавы ліст. Трымціць, трымціць, а злосьць стаганне на парабкох, ды па парабчанках..

Вось каму жысьць ня ў жысьць была, а адна пакута. І да чаго дапякаў іх пан, да чаго вьдзекваўся—утаніцца мала.

Але справа ня ў гэтым. Пачалося ўсё вось з чаго. Было ў пана семера парабкоў, адзін другога прыгажэй і здатней. Прыгожыя былі хлапцы, падабраў іх пан з усяе акругі, бач, клапаціўся, каб прыемна было вачам пенагляднае пані глядзець на іх—любіла яна ва ўсім красу і здатнасьць. Але на сваю бяду панабраў іх пан. Мусіць заходта чорныя вочы былі ў пані і заходта многа агню ў яе палкай крыві, толькі стала паня ласьціцца да хлапцоў. Ні то што ласьціцца, а так цёмнаю ночу якой падбярэцца да таго, да другога, абаўе сілком рукамі за шыю, ды шопча на вуха:

— Любі мяне, будзеш вечна шчасьлівым, інакш... пагібель..

А парабкі, вядома, хлапцы пужаныя, баяліся пана хужэй сьмерці, дый сама паня дзіўная — рабіліся вочы яе на сінія аганькі падобныя. Нібы тыя агні, што гараць на начох на панных балотах, на бяздонных непраходных нетрах. Уцякалі хлапцы ад пані, баяліся духу яе, баяліся яе пацалункаў нячыстых, якія пяклі сатанінскім агнём і высушвалі сэрца. І вялікая злосьць запанавала тады ў сэрцы пані. Яна паскардзілася старому пану, нібы парабкі хацелі ўзяць яе беласьнежнае цела, забрудзіць яе лебядзіныя грудзі, замуціць ясныя вочы векавечнай ганьбаю.

Чаго толькі ня было тады. Цэлыя ночы сядзеў пан у сваім пакоі, думаў усё ды абдумваў, якую кару даць парабкам за нячуванае іх злачынства. А хлапцоў пасадзіў у падзямельны склеп, панавесіў замкоў, варту прыставіў. Нібы хмары панавісьлі тады над старым замкам, кожны абыходзіў яго, баяўся зірнуць на вокны, каб ня страціць нячыстага зірку, не пагубіць сваёй душы.

А ў старым парку ляталі совы ўночы і кружыліся кажаны паміж дроў ды з цёмнага склепу раздаваліся часам глухія стогны ды прыдушаны стук кайданоў.

І было раз у цёмную, цёмную ноч па восені і калі ня відно ні зор, ні нябеснага месяцу, калі выс толькі вецер па лясох ды балотах, засьціле вочы дажджавой мітульгою. Вышла пані з пакояў у стары парк. Загудзеў ён нячуванымі галасамі, зашумелі векавыя ліпы абашпаленым газьлём, закружылася пажоўклае лісьце—нібы нечысьць уся пазьлазілася з усіх бакоў, павылазіла са сваіх патаемных нор і прышла да сваёй гаспадыні.

Кажуць людзі, падышла да склепу пані, адамкнула замкі заржавеўшыя, пачала казаць загаворы:

— Ня бачыць вам долі людзкой і людзкога шчасьця, ня ўзіраца ў блакітныя вочы дзявочыя. Вам радзіма—балота і глухія лясы, нагарода вам—воўчае сэрца. Бяжыце-ж ваўкам шэрымі па незнаных сьцежках лясных, шукайце шчасьця ваўчынага, шукайце долі сваёй у хмызьнякох і непраходных нетрах...

І прабегла па цёмнаму парку сем шэрых ваўкоў, усе адзін у адзін.

Даўно гэта было і аб парабкох ня стала чутно ні слуху, ні духу, нібы й ня было іх на сьвеце, нібы й ня былі яны ў нашым маёнтку.

— А пры чым жа тут воўчы лог?

— Эх, прыткія вы маладыя, вам адразу і падай усё ў рукі, адразу хочаце ўсё схапіць адным махам. Не, пачакай, дай давесьці ўсё па парадку... Бачыш, капліца стаіць, вунь, вунь, паза хвояй...

Запраўды, на раскрыжаваньні дарог у самым непраходным гушчары стаяла невялічкая капліца і глядзела з-за хвоі сваімі цёмнымі, павыбіванымі вакенцамі. Гэтыя вакенцы, нібы заняпаўшыя мерцьвяковыя вочы, жудасна назіралі з пад навісшых лап старых ялін і разгалістых суччаў хвоі, што сталі навакол, старажылі пакой гэтай дзіўнай, нікому не патрэбнай будыніны. Каля капліцы стала некалькі струхнеўшых пахіліўшыхся крыжыкаў. На іх віселі страціўшыя свой колер і выгляд некалькі выпетраных ветрам і нягодаю пярэдзімкаў. Хто іх вешаў, хто выпываў рупліваю рукой выцьвеўшыя пад сонцам і сіверам узоры, чые надзеі ўкладаліся ў гэтыя «божыя рушнікі»—мусіць, ведаць толькі старым хвоям, ды старым ялінам. Наўкол была сумная пішыня, цішыня старага клодаўя, дзе ні песьняў, ні радасьці, ні вясёлага гоману-шуму.

Мярцьвячына, цьвіль...

— Дык вось... Справа была ў піліпаўку. Кажуць людзі, завёс былі вялікія, трашчалі маразы лютыя, ніхто ў дарогу ня схаў, сядзелі па хатах. Надыходзілі каляды. Паехаў пан з паняю ў горад. Ні то ў госьці, ні то так куды, адным словам, панскія справы. Поч у той час была асабліва, такая замяць узьнялася, што суседняй хаты ня ўбачыш, ня толькі што. Наваліла замяць такія гурбы, што з канём утапіцца можна.

І праходзіць дзень, праходзіць другі, ня чуваць ні пана, ні пані. Прашло колькі дзён і вольнуўся ў маёнтак фурман панскі. Дзіўны зьвярнуўся—ні слова ад яго не пачулі людзі талковага, такое верз—нямаведама што. Звар'яцеў клапец. Толькі і расабраць можна было:

— Ваўкі шэрыя, шэрыя... а вочы—сьвечы, ды вострыя зубы...

А ў хуткім часе знайшлі і пана. Ня пана, а косьці яго пад стараю хвояй. А пані і сьлед прастыў і ніхто ня бачыў яе з таго часу, ні чуў аб ёй і ня ведаў. Праўда, знашлі пастушкі персьцянёк залаты з самацьветам—усё, што засталося ад пані. Прынесьлі ў вёску гэту, паказвалі ўсім. Цудоўны персьцень, так і гарыць агнём яго камень дзівосны. Ды ўсе, хто толькі глядзеў на гэты персьцень, нудзіліся потым, на сэрца сохлі. І казалі яшчэ, калі паглядзець на персьцень апоўначы — убачыш страшныя вочы пані ў самацьвеце цудоўным. Але ніхто не глядзеў, баяліся, бо толькі надыйдзе цёмная ноч, да разгуляецца ў полі бура-віхура, падыходзяць пад вокны шэрыя ваўкі, вышчараюць зубы, улыпаць вочы сваё агнявыя ў няшчасную хату, дзе ляжаў пярсьцёнак, ды як завыюць, завыюць, ніхто ў сьвеце такога вою ня чуў.

Кінулі потым персьцень у гэта балота, закінулі ў непраходную дрыгву, каб не спакушалася чалавечае сэрца на страшэнны бляск самацьвету. І вось балота, дзе было гэта ўсё, і празвалі воўчым логам, а на месцы тым, дзе загінуў пан, сваякі яго капліцу паставілі. Сказаць наміж нами — непакойнае месца тут, не к ночы будзь сказана: прытулак усяго нячыстага. Колькі раз траплялася нашым людзям нападаць у нядобрыя здарэньні калі капліцы, то сядзіць на хвоі белая здань, то плача нібы хто, ці скаточа ў капліцы, то гоніцца нібы хто найстрашэнны, цудоўны за праходжым, ці за праясджым, асабліва калі ідзеш ці едзеш у адзіночку.

Дзесьці далёка, далёка, вярсты за тры, за чатыры завыў у адзіноце воўк. Вой быў ціхі, працягны, поўны пейкай навыразнай жудасьці, абрачонпасьці, безнадзейнасьці.

Праз хвіліну раздаўся другі вой, больш грубы, больш гучны, дзесьці бліжэй...А там трэці, чацьверты, пяты, і хутка жудасны канцэрт апанаваў усім лесам, перапоўніў яго страхам і жудам. Коні пужліва замахалі галовамі, настырчылі вушы. Дзед Ігнат прыціх адразу, сьцяўся ў камок на сваёй варшаньцы, перахрысьціўся і пужліва пачаў падганяць коняй. Ён спалохана, няўпэўнена махаў пужкай і ціха, але настойліва занукаў:

— Н-но...но...Чаго прысталі...Хутчэй дома будзем...

І толькі праз хвіліну, прыслухаўшыся да лясных гукаў, Ігнат гаварыў ужо весялей:

— Мусіць, пашлі мохавым балотам, цяпер ужо далёка, каля самых пашлаў будуць. Да і лепей... ну іх, ня варта з імі ў дарозе сустракацца, лепш далей ад граха...

Лес станавіўся радзей і радзей, хутка выехалі на чыстае поле і ўперадзе зазьялі дымэнтнымі зоркамі яркія аганькі. То сьвяціліся электрычныя лямпачкі заблытаўшагася сярод лясоў і балот шкляного заводу. Усё адразу згінула, засталося дзесьці далёка, далёка з-заду, засталося прыгожаю казкай, усхваляваўшаю выбражаньне.

Нават зьмяніўся сам Ігнат. Ён загаварыў пра работу, пра гуту.

— Бач, сьветла як. Хіба было там за панам—была гута калісьці панскай. Куды там, было цёмна, хоць вока выкалі. А цяпер, куды там...

І Ігнат пачаў расказваць, як жыве яго сын на заводзе, як распальвае ён страшэнныя печы...

—Мо' страшней самацьвету і шэрых ваўкоў?

— Камень тут ні прычым... Што і гаварыць...Камень там—у лесе, у балоце, вунь, у нетрах у тых, дзе гараць по начох сінія аганькі... А тут, ды што казаць...Н-но, гнядыя, падварушвайся...

Палазы заскрыпелі гучней, дзед прысьвіснуў па коняй, і сані панесьліся віхрам па крыштальнай, наежджанай дарозе

МІХАСЬ ЛЫНЬКОЎ.

У стаўцы Духоніна.

(З цыклю «1917 год на Магілеўшчыне»).

I. ПРАДСТАЎНІКІ ЧУЖАЗЕМНЫХ МІСІЙ ПРЫ СТАЎЦЫ.

У тыя гістарычныя дні, на ніжы дзьвюх эпох, калі апошні эшлот часовага ўраду—стаўка з хвіліны на хвіліну павінна была перайсьці ў рукі вярхоўнага галоўнакамандуючага Крыленка, прычым доўгачаканае слова «мір» ня сходзіла з вуснаў пераважнай большасьці дэлегатаў шматмілённай расейскай арміі,—вельмі актыўна выявілі сябе і прадстаўнікі чужаземных місій пры стаўцы.

Іх выступленьне даводзіла тое, што карабль тоне, ідзе на дно, што набегшыя высокія хвалі ад буры трохгадовай шалёнай, бяссэнсовай бойні штохвілінны могуць змыць дашчэнту цытадэль тых, хто рыхтаваўся (у цішы кабінэтаў) да 4-ай зімовай кампаніі.

Ледзь, напрыклад, скончылася размова па простаму проваду паміж Крыленкам і камісарам часовага ўраду пры стаўцы Станкевічам, прычым вярхоўны галоўнакамандуючы Крыленка катэгарычна заявіў:

— Я выслаў парляманцёраў для перамовы аб замірэньні на ўсіх франтох. Адказнасьць за зрыў справы ўсегульнага міру ўскладаю цалкам на стаўку сучаснага складу.

Ледзь у бюлетэні «агульнаармейскага камітэту» агалошана была тэлеграма вярхоўнага галоўнакамандуючага Крыленка з Дзьвінску, як прадстаўнікі чужаземных дзяржаў згоды сьпяшаюцца ўжо прад'явіць генэралу Духоніну сваю дэкларацыю пратэсту адносна гэтага.

Агульны вывад і агульны тон гэтай дэкларацыі прыблізна гэткі:

— Як «яны» адважваюцца і думаць аб гэтым, якал нагласьць і інш.

Але рэдакцыя ня, зразумела, высьпенькая, прылізаная.

Вось яе галоўныя вытрымкі:

„Я г о прэвасхадзіцельству генэралу Духоніну, вярхоўнаму галоўнакамандуючаму расейскай арміі. Магілеў, 23 лістапада.

„Ніжэйпадпісаныя начальнікі вайсковых місій пры вярхоўным расейскім камандаваньні, дзейнічаючы на падставе спэцыяльных зазначэньняў, атрыманых ад сваіх урадаў, маюць гонар заявіць самы энэргічны пратэст перад расейскім вярхоўным камандаваньнем супроць усякага парушэньня ўмоў дагавору ад 23-5 верасьня 1914 г. дзяржаў згоды, перад якімі Расея ўрачыста абавязалася не падпісваць ні замірэньня, ні прыпыненьня ваеннай чынасьці. Ніжэйпадпісаныя начальнікі вайсковых місій лічаць таксама сваім абавязкам падаць да ведама вашага прэвасхадзіцельства, што ўсякае парушэньне дагавору з боку Расеі будзе мець вельмі цяжкія вынікі".

Дэкларацыю падпісалі: начальнік брытанскай місіі генэрал Бартэр, начальнік францускай місіі генэрал Лаверн, начальнік італьянскай місіі генэрал Рамэй і г. д., а ўсяго прадстаўнікі місій 6 дзяржаў, сталае месцазнаходжаньня якіх Магілеў-стаўка і якія з трывогаю прыслухоўваюцца да ўзрастаючага гулу Кастрычнікавай рэвалюцыі з яе лёзунгам—зараз-жа спыніць вайну.

Яшчэ больш рашучы і грозны пратэст вядомага ў гісторыі імпэрыялістычнай вайны францускага генэрала Бэртэло:

„У наведамленьні галоўнай расейскай кватэры (стаўкі) ад 21 лістапада нічога не гаворыцца аб становішчы на фронце, а замест гэтага зьмяшчаецца загад Савету Народных Камісараў з прапановай вярхоўнаму галоўнакамандуючаму распачаць з войскам ворага перамовы аб неадкладным прыпыненьні ваеннай чынасьці і распачаць мірныя перамовы.

Я заяўляю, што Францыя не прызнае ўлады Народных Камісараў і, ўпэўненая ў патрыётызьме вышэйшага расейскага камандаваньня, яна разьлічвае, што апошняе рашуча адхіліць перамовы і ўтрымае расейскую армію на фронце, тварам да агульн

Сёньня, 10-га студзеня, у 7 гадзін увечары ў залі пасяджэньняў СНК БССР адбудзецца ўстаноўчы сход Таварыства садзейнічаньня разьвіцьцю аўтамабілізацыі і палепшаньню шляхаў—«Аўтадора» БССР.

ПАРАДАК ДНЮ:

1. Мэты і задачы „Аўтодора"—уступны даклад т. Карклiна.
2. Статут „Аўтадора" БССР—т. Арлоў.
3. Выбары савету, праўленьня і рэвізійнай камісіі Таварыства.
4. Бягучыя справы.

Там-жа будзе адбывацца і запіс жадаючых уступіць у члены Т-ва „Аўтадор" БССР.

Часовае бюро.

1-шы ЎСЕБЕЛАРУСКІ ЗЬЕЗД СЯЛЯН-ЛІТОЎЦАЎ.

8-га студзеня а 7-ай гадзіне ўвечары ў клюбе акрвыканкому адчыніўся першы ўсебеларускі зьезд сялян-літоўцаў. З усіх куткоў БССР на зьезд прыехала з пастаноўчым голасам 70 і з дарадчым—28 сялян, сярод якіх ёсьць і жанчыны-літоўкі.

Прысутвічае на зьезьдзе прадстаўнік літоўскай сэкцыі Камінтэрну член ЦК літоўскай кампартыі тав. **Ангарэціс.**

Ад імя Нацкамісіі пры ЦВК БССР зьезд адчыніў тав. Бучукас, які адзначыў, што навокал гэтага зьезду ў Польшчы і Літве падняўся вялікі шум: буржуазея гэтых краін кажа, што Саветы хочуць утварыць Савецкую Літоўскую Рэспубліку ў межах БССР, а таму склікаюць зьезд літоўцаў, на які прысылаюць камуністаў-літоўцаў са усяго СССР, а як вы самі бачыце, сярод дэлегатаў-сялян ніводнага камуніста на вялікі жаль няма.

Далей т. Бучукас спыніўся на тых задачах, якія прыдзецца разьвязаць зьезду. На парадку дню—даклады: аб міжнародным і ўнутраным становішчы, аб мерапрыёмствах савецкай улады на падняцьці сельскай гаспадаркі і дапамозе беднаце, аб нацпалітыцы савецкай улады і працы сярод нацменшасьцяў у БССР.

У прэзыдыум зьезду абіраецца 15 чалавек, сярод якіх т. т. Хацкевіч, Адамайціс, Бэйлін, Абрамчук і інш. У складзе прэзыдыуму—8 сялян, а ў ліку іх—3 жанчыны.

У ганаровы прэзыдыум абраны—Сталін, Бухарын, Рыкаў і іншыя члены Палітбюро УсеКП(б). Пад гром воплескаў абіраюцца таксама ў ганаровы прэзыдыум т.т. Кнорын, Васілевіч, Чарвякоў, Галадзед і Ангарэціс.

Зьезд адразу прыступіў да дзелавой працы. З вялікай увагай дэлегаты заслухалі даклад тав. Васілевіча аб міжнародным і ўнутраным становішчы.

Пасьля т. Васілевіча з дакладам аб палітычным і эканамічным становішчы Літвы і аб узаемаадносінах апошняй з Польшчай выступіў член ЦК ЛКП(б) т. **А гарэціс.**

Тав Ангарэціс, вітаючы зьезд ад імя Літоўскай кампартыі і ад імя тых таварышоў, якія зараз у Літве праліваюць сваю кроў за справу пралетарыяту, спыніўся на эканамічным становішчы Літвы.

— У даваенны час літоўская прамысловасьць была досыць добра разьвіта, а цяпер яна з кожным месяцам падае, і рабочыя працуюць толькі тры разы ў тыдзень. Раней можна было эмігрываць у Амэрыку, а зараз і там беспрацоўе; адгэтуль відаць, што становішча рабочай клясы Літвы вельмі цяжкае. Баючыся паўстаньня рабочых, буржуазея правяла зямельную рэформу і дэкляравала даць зямлю, але тое, што было дадзена, ужо забіраецца назад і аддаецца зноў абшарнікам.

Пасьля фашысцкага перавароту літоўская буржуазея расстраляла чатырох правадыроў рабочай клясы, а зараз расстрэльвае выпадковых рабочых і сялян. Пасьля спробы паўстаньня ў Таўрогене сярод расстраляных няма ніводнага камуніста, а расстрэльваюць тайна і адкрыта. Цікава адзначыць, што сяляне супроць расстрэлаў арганізоўваюць асаблівую забастоўку, — у працягу некаторага часу зусім ня выходзяць на вуліцу.

Фашысцкая ўлада сваёй мэтай паставіла ня толькі расстрэльваць рабочых, але і скарыстаць Літву супроць СССР. Буржуазея непакоіцца за сваю ўладу, а таму ўвесь час узмацняе рэпрэсіі супроць рабочых і сялян: забаранілі сходы, зачынілі шэраг газэт распусьцілі прафсаюзы, а волю даюць толькі кулацтву і абшарнікам. Згодна літоўскай канстытуцыі, усе органы, а таксама і прэзыдэнт павінны абірацца, а зараз мы бачым, што не прэзыдэнт залежыць ад сойму, а наадварот. Фашысты сьвядома вядуць Літву да манархіі: Сьмятона хоча быць літоўскім каралём. Нават ёсьць свой літоўскі „Распуцін»—адзін ксёндз. Фактычна зараз Літвой кіруе жонка прэзыдэнта, якая знаходзіцца пад уплывам гэтага «Распуціна». Прэзыдэнт у канцы лета падарожнічаў па Літве, а для гэтага сялян прымушалі кідаць палявыя работы і рамантаваць дарогі і будаваць аркі. Але яго падарожжа было няўдалым, бо ён падтрыманьня сярод сялян не знайшоў.

Фашысты гавораць, што камуністы—ворагі літоўскай незалежнасьці, а самі, як узялі ўладу ў рукі, дык зараз-жа распачалі торг з Польшчай аб далучэньні Літвы. Польшча таргавалася з рознымі літоўскімі групоўкамі і шукала, хто таньней прадасьць Літву. Нагул, незалежнасьць можа бараніць армія, але ў Літве яна аддадзена ў рукі польскіх генэралаў: камандуючы арміяй генэрал Жукоўскі ў 1920 годзе працаваў на карысьць польскай дэфэнзывы, начальнік генэральнага штабу Плехавічус таксама польскі абшарнік; ваенны міністр нядаўна зваўся **панам** Даўкантасам. Калі-б у Літве пачалася рэвалюцыя, дык адны фашысты не маглі-б справіцца з рабочымі; вось чаму ім неабходна падтрыманьне Польшчы; а польскія фашысты гавораць,—мы вам дапаможам разьбіць рабочых, але вы нам аддайце Літву.

Фашысты пахваляюцца, што на Жэнэўскім кангрэсе яны выйгралі, але яны зрабілі тое, што ім загадалі прадстаўнікі буйных буржуазных дзяржаў.

Далей тав. Ангарэціс спыняецца на той працы, якую вядзе літоўская камуністычная партыя. Літоўская кампартыя загнана ў глыбокае падпольле, але, не зважаючы на расстрэлы, яна вядзе барацьбу, бо ведае, што раней ці пазьней, а перамога будзе на баку працоўных. Кампартыя заклікае да барацьбы за незалежнасьць Літвы, але толькі не фашысцкай, а рабоча-сялянскай. Кампартыя заклікае да зьнішчэньня фашыстаў у Літве і Польшчы і спадзяецца, што гэты час ужо блізка.

Зьезд доўга вясьціхаючымі воплескамі спаткаў прамову т. Ангарэціса.

Пасьля гэтага заслуханы шэраг прывітаньняў. Паміж іншым, зьезд вітала дэлегацыя сэсіі ЦВК БССР, у якую ўвайшлі прадстаўнікі ад рабочых і сялян. Ад ўраду БССР зьезд вітаў Наркамгандлю тав. Адамайціс. Віталі таксама зьезд прадстаўнікі яўрэяў-земляробаў, сялян-палякаў і латышоў. У прывітаньнях апошніх праводзілася адзіная думка, што толькі пры савецкай уладзе могуць вольна разьвівацца ўсе нацменшасьці.

Хроніка Усебеларускага Зьезду сялян-літоўцаў.

Прывітаньне ад члена ЦК ЛКП(б) тав. Міцкевіча-Капсукаса.

На ўчарашнім пасяджэньні зьезд заслухаў прывітальны ліст ад члена ЦК Літоўскай кампартыі тав. Міцкевіча-Капсукаса, які адзначае вялікае палітычнае значэньне зьезду ня толькі для сялян-літоўцаў БССР, а і для Літвы і іншых буржуазных краін.

Прывітаньне ад рабочых-літоўцаў г. Харкава.

Зьезд атрымаў тэлеграму з Харкава ад агульнага сходу рабочых-літоўцаў. „Горача вітаем I усебеларускі зьезд сялян-літоўцаў. Ваш зьезд яшчэ раз даказвае працоўным усяго сьвету, што толькі савецкая ўлада дае сапраўдную волю нацменшасьцям",—гаворыцца ў тэлеграме.

Праца зьезду 9-га студзеня.

Зранку пасьля заслуханьня прывітаньняў зьезд заслухаў даклад аб мерапрыёмствах савецкай улады па падняцьці сельскай гаспадаркі і дапамозе беднаце.

Даклад зрабіў на літоўскай мове Нар. Кам. Гандлю БССР т. Адамайціс. Пасьля дакладу разгарнуліся спрэчкі, якія сьведчаць аб надзвычайнай актыўнасьці літоўскага селяніна.

Зьезд выдзеліў дэлегацыю для прывітаньня сэсіі ЦВК.

На раніцнім пасяджэньні 9-га студзеня зьезд абраў дэлегацыю ў складзе 21 чал для прывітаньня Сэсіі Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР.

Менскі Загс выклікае на 7-га лютага г. г. гр-на **НАСЫБУЛЬЛІНА Ібрагіма-Б Махаметава** па справе скасаваньня шлюбу з гр-кай **НАСЫБУЛЬЛІНАЙ Раісай Мустафавай.**

Гр-н **ФРЭЙДЗІН Абрам Ісаевіч**, які паходзіць з грамадзян г. Расляўля і жыве ў г. Ворпы, зьмяняе прозьвішча **Фрэйдзін** на **„СЯРГЕЕЎ"**, а імя **Абрам**—на імя **„АРКАДЗЬ"** і імя па бацьку **Ісаевіч**—на **„АРЦЁМАВІЧ"**.

Асобы, якія маюць пратэсты супроць зьмены прозьвішча і імя, павінны паведаміць аб гэтым Загс.

Хроніка.

Беларускія пісьменьнікі сярод курсантаў

(Вечар беларускай літаратуры ў Аб'яднанай Беларускай Вайсковай Школе).

Хто з вясковых хлапцоў не зачытваўся паэмамі народнага беларускага пісьменьніка Якуба Коласа „Сымон Музыка" і «Новая Зямля»? Хто з вясковых граматных камсамольцаў ня дрыжэў і не хваляваўся, чытаючы апавяданьне Тараса Гушчы „На прасторах жыцьця"? Хто з моладзі ня радаваўся разам са Сьцёпкам і Алёнкай пасьля кожнай маленькай перамогі?

Каму невядомы мілагучныя вершы беларускага баяна Янкі Купалы?

... І хлапцы з гораду і вёскі, ад плуга і варштату, якія прышлі ў Вайсковую Школу, каб выгартаваць з сябе непераможных камандзіраў Чырвонай арміі, чыталі творы Янкі Купалы і Якуба Коласа, не адзін верш вывучвалі на памяць і заклікалі ім масы да працы, да перамогі.

Але мала хто з курсантаў бачыў беларускіх пісьменьнікаў сваімі вачыма, мала хто чуў, як паэты чытаюць свае ўласныя творы.

Вось таму ў нядзелю, 8 студзеня, курсанты школы не прасіліся «найсьці ў горад», а нецярпліва чакалі 7 гадзін вечару, калі прыяць беларускія пісьменьнікі.

З невялікім, але багатым па зьместу дакладам аб сёнешнім беларускай літаратуры выступіў **Міхась Зарэцкі.**

Выступленьне **Цішні Гартнага** даноўніла даклад Зарэцкага, азнаёміла курсантаў са справай культурнай сувязі Беларусі з іншымі краінамі.

Дружнымі воплескамі вітаюць курсанты **Янку Купалу**, які прачытаў два новыя вершы:—„У дарозе" і „Пагранічнік".

Чыталі яшчэ свае вершы **Александровіч, Дудар і Вольны.**

Урэшце, выступіў **Якуб Колас.** Спакойным голасам ён расказвае курсантам зьмест свае новае поэмы—„На шляхох волі".

Ціха і плаўна льюцца словы з вуснаў Коласа, і мёртвым спакоем ловяць курсанты радкі паэмы аб франтавой наласе...

Вечар беларускай літаратуры скончыўся. Кожны жадаў: часьцей нас наведвайце, часьцей прыходзьце да нас з літаратурнымі навінамі.

Зьм. П.

Прыезд Латвійскага консула.

Учора ў Менск прыехаў латвійскі консул п. Пунга, які будзе прысутнічаць на Сэсіі ЦВК БССР.

Прыезд нямецкіх кулцоў.

Сёньня зранку ў Менск прыехалі 4 прадстаўнікі нямецкай прамысловасьці. Мэта прыезду—перагаворы з Лесбелам адносна экспорту лесаматэрыялаў.

Сувязь з замежнымі рабочымі арганізацыямі.

Сувязь эсэрантыстаў з замежнымі рабочымі арганізацыямі ўзмацняецца. У 1927 годзе беларускія эсэрантысты паслалі за межы 8.570 лістоў, з якіх звыш 600 зьмешчаны ў розных замежных газэтах і журналах.

Льготны праезд для палітэмігрантаў.

Тарыфны камітэт НК Шляхавых Зносін прадставіў палітэмігрантам 50 проц. скідкі для праезду на дарогах СССР. Льгота прадастаўлена 750 палітэмігрантам.

1-шы ўсесаюзны пэдалёгічны зьезд.

Закончыўся першы ўсесаюзны пэдалёгічны зьезд, у якім прымала ўдзел звыш 2.000 чал. Ад Беларусі на зьезьдзе прысутнічала дэлегацыя з усіх округ у складзе 40 чал. пэдагогаў, урачоў і пэдалёгаў.

Зацікаўленасьць да радыё ўзрастае.

Колькасьць радыё - ўстановак штомесяц павялічваецца ў сярэдзім на 30-35. Зараз у Менску налічваецца 2.200 радыё-ўстановак, якія абслугоўваюць вялікую колькасьць радыё-аматараў.

Фізкультурны тэхнікум.

Зацьвярджана палажэньне аб беларускім тэхнікуму фізкультуры. Тэхнікум адчыняецца ў Менску. Тэрмін навучаньня—2 гады. У тэхнікум будуць прымацца памоцнікі інструктароў фізкультуры, дэмабілізаваныя чырвонаармейцы і інш.

Назначэньне.

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР на пасяджэньні сваім ад 30-га сьнежня 1927 г. пастанавіў назначыць тав. Файнбурга Ільлю Львовіча загадчыкам Арганізацыйнага Аддзелу Прэзыдыуму ЦВК БССР. Тав. Файнбург да гэтага часу выконваў абавязкі загадчыка Арганізацыйнага Аддзелу Прэзыдыууу ЦВК.

Зьніжэньне адміністрацыйна-упраўленцкіх выдаткаў.

У сувязі з дырэктывамі ўраду аб скарачэньні адміністрацыйна-упраўленцкіх выдаткаў ва 20 проц., усім вучасткам Заходніх чыгунак дадзен загад аб правядзеньні ў працягу 1927-28 гаспадарчага году гэтых дырэктыў у жыцьцё.

Будзе завезена на 1.685.000 руб. хлебапрадуктаў.

Белкаапсаюз у студзені мяркуе завезьці 950 вагонаў розных хлебных прадуктаў на суму 1.685.000 руб. Большасьць гэтых прадуктаў—жыта і жытняя мука.

Экспортныя загатоўкі па спажывецкай кааперацыі.

Водгук даных, праз сыстэму спажывецкай кааперацыі за першы квартал 1927-28 году загатоўлена для экспорту ў замежныя дзяржавы прадукцыі сельскай гаспадаркі на 223.000 руб.

Новае школьнае будаўніцтва.

У 1927-28 годзе ў Менскай акрузе мяркуецца распачаць пабудову 100 школьных камплектаў пляшавых будынкаў, што будзе каштаваць прыблізна 436.000 руб. Апрача гэтага, райвыканкомы будуюць 37 непляшавых школ пры дапамозе насельніцтва.

50.336 руб.—у фонд абароны.

Да 1-га студзеня г. г. з усіх округаў БССР паступіла ў Цэнтральны Савет Осоавіяхіму 50.336 руб., у тым ліку на пабудову самалёта „Наш адказ Чэмберлену"—39.955 руб.

Бібліяграфія.

АПІСАНЬНЕ ГОРАЦКАГА РАЙЁНУ.

(Працы Навук. Т-ва па вывучэньні Беларусі пры БДА Сельск. Гасп., тыр. 1000 экз., цана 2 р. 75 к.

Горацкае Навуковае Таварыства па вывучэньні Беларусі выпусьціла 3 ці том сваіх прац па апісаньні Горацкага раёну. Гэта першае апісаньне раёну БССР.

3-ці том Прац Навуковага Т-ва зьмяшчае шырокае апісаньне прыроды Горацкага раёну. Прафэсар Лугэргаузен дае падрабязны абгляд геолёгічнай пабудовы раёну, у якім выкарыстоўвае як свае ўласныя дослэды, так і працы іншых вучоных дасьледчыкаў у гэтай галіне. Пётра Кучынскі апісаў глебу Горацкага раёну. „Матар'ялы да флёры Горацкага раёну" праф Васількова ўпяршыню падагульвае ўсё багацьцо флёры ў межах раёну. Прафэсар Салагёў даў дакладны нарыс фауны раёну. Эканоміка вызначана ў трох нарысах. Гэльмі багаты адзел гісторыі і быту. Тут зьвяртае на сябе ўвагу артыкул Сграговіча—„Яўрэйскае насельніцтва Горацкага раёну",—які выяўляе ход гістарычнага жыцьця яўрэйскага насельніцтва да апошняга дню.

Значэньне гэтай кнігі пашыраецца далёка за межы Аршаншчыны. Кніга карысна ня толькі для краязнаўцы, а і для ўсякага, хто цікавіцца сучасным і мінулым Беларусі, а таксама і для школ.

Д. В.

ВАЛЕРЫ МАРАКОЎ. На залатым пакосе. Вершы. Выд. ЦБ Маладняка. Стар. 70. Цана 65 к. т. 1500.

Вершы В. Маракова, зьмешчаныя ў зборніку „На залатым пакосе", вылучаюцца з шэрагу яго аднаўлечнікаў-паэтаў і ў лепшы для яго бок.

Творчасьць Маракова прасякнута шчырасьцю, часамі сустракаюцца наіўныя мясьціны і ўсё гэта пакідае ў поўнай меры прыемнае ўражаньне.

Валеры Маракоў знаходзіўся пад моцным уплывам Надсона; спачатку ў Маракова сустракалі мы „скаргаьно", „расчараваньне", „адзіначаньне думкі", „ростань", у гэтым зборніку аўтар ужо пераходзе да апісаньня новага жыцьця, сустракаюцца пэўныя поўныя бадзёрага настрою, поўныя ўпэўненасьці ў перамогу пралетарыяту.

Такі наварот у творчасьці В. Маракова трэба вітаць. Але адначасна мы лічым патрэбным зазначыць і на адмоўныя бакі.

Трэба раз і назаўсёды адмовіцца ад складаньня зборніку мастацкіх твораў па прынцыпу „сямейнага альбому".

(Прысьвячэньне т. т., сёстрам, братом, маці і амаль ня цёткам—у зб. „На залатым пакосе"—займаюць значнае месца).

Пры складаньні зборніку трэба заўсёды прытрымлівацца поўнае сыстэмы. В. Маракоў разглядаемы зборнік разьбіў на дзьве часьціны: 1) „У разгары жыцьця" і 2) „На залатым пакосе", а па сутнасьці творы абудзвых аддзелаў вічым між сабой ня розьняцца. І апошняе, што зьяўляецца бясспрэчна ў поўнай меры адмоўнасьцю, гэта перавага «я» над «мы».

В. Маракоў бязумоўна мае здольнасьці і падалей яму трэба больш стала і грунтоўна азнаёміцца з сучасным жыцьцём, нашым будаўніцтвам—такое азнаёмленьне ўзбагаціць тэматыку, што для Маракова так патрэбна.

В. Маракову варта яшчэ ўзбагаціць фармальна мастацкія сродкі для разьвіцьця далейшае творчае працы.

Баг.

ПАДРЫХТОЎКА ДА ВЯСЕНЬНЯЙ ПАСЯЎНОЙ КАМПАНІІ.

Плян правядзеньня вясеньняй пасяўной кампаніі па лініі Белсельсаюзу прадугледжвае загатоўку і рэалізацыю рознага насеньня на 1.200.000 руб., штучнага ўгнаеньня на 250.000 руб. сельска-гаспадарчых машын на суму да 600.000 руб.

Плян загатоўкі насеньня, галоўным чынам гародніх культур, будзе часткай выкананы закупкай за межамі. На рынку БССР будзе загатоўлена 10.000 пуд. насеньня капюшыны; апроч таго, 6.000 пуд. будзе завезена в Сібіры, а 4.000 пуд. заказана за межамі.

Віка, лубін і сэрадэля загатаўляюцца выключна ў Беларусі. Наогул, трэба сказаць, што плян загатоўкі насеньня культурных траў будзе выкананы поўнасьцю.

У сувязі з незрашэньнем да гэтага часу пытаньня адносна завозу ў БССР штучнага ўгнаеньня і насеннага аўса, праўленьне Белсельсаюзу камандыравала ў Маскву свайго прадстаўніка для хутчэйшага разьвязваньня ўсіх гэтых пытаньняў.

У Маскве канчаткова ўдалася разьвязаць пытаньне адносна завозу супэрфасфату, частка якога будзе атрымана з савецкіх заводаў, а частка з-замежаў. Зроблен догавар з Хімсындыкатам на дастаўку 1.800 тон супэрфасфату савецкай вытворчасьці, і да сакавіка гэты дагавор будзе выкананы поўнасьцю. Ужо атрымана ліцэнзія на ўвоз з-замежаў 3.000 тон супэрфасфату; гэты заказ прыбудзе ў Беларусь таксама да сакавіка. Белсельсаюз разьмеркаваў заказаны супэрфасфат па акрсельсаюзах, і ён будзе дастаўляцца непасрэдна ў округі, што значна зьменшыць накладныя выдаткі.

Згодна экспортнага пляну, Белсельсаюз павінен экспартаваць на 700 тысяч руб. льнянога валакна. З прычыны таго, што сувязь у нас з заграніцай яшчэ слабая, Белсельсаюз дагаварыўся аб экспорце гэтага прадукту з маскоўскімі экспартуючымі кааперацыйнымі арганізацыямі.

Ня зусім добра стаіць пытаньне з насеньнем аўса. Беларусь зрабіла заяўку аб неабходнасьці завезьці з іншых рэспублік Саюзу 960.000 пуд. аўса, але гэтае пытаньне дасюль ня вырашана.

Пытаньне гэта праз сталае прадстаўніцтва БССР у Маскве ставіцца ў Савеце Працы і Абароны.

Белсельсаюз даў дырэктывы па ўсёй сыстэме ўзмацніць загатоўку аўса і ячменю на мясцох і ўсю палічную колькасьць апошніх забараніваць да вясеньняй пасяўной кампаніі і ні ў якім разе не расходаваць гэтага насеньня на іншыя патрэбы.

Неабходна, каб і Нар. Кам. Гандлю даў гэткіх-ж дырэктывы па ўстановах, падпарадкаваных яму.

ФІЗКУЛЬТУРА.

Першыя ў сэзоне лыжныя спаборніцтвы.

8-га студзеня закончыліся менскія прафсаюзныя лыжныя спаборніцтвы, у якіх удзельнічала 13 мужчын і 8 жанчын.

Вынікі спаборніцтваў гэткія:

У дыстанцыі на 10 кілёмэтраў для мужчын першым прыйшоў Ёўдакімовіч (Зах. чыгунка)—54 мін. 18,6 сэк., другім—Дынэрштэйн (будаўнікі) у 55 мін. 33,6 сэк. і трэцім—Варабёў (Зах. чыгунчы) у 55 мін. 58,6 сэк.

У дыстанцыі на 7 кілёмэтраў для жанчын на першым месцы аказалася Сашко (Зах. чыг.) у 53 мін. 58,7 сэк., на другім—т. Груздзь (Зах. чыг.)—54 мін. 43,2 сэк. і на трэцім месцы—т. Макарэвіч (Зах. чыг.) 54 мін. 43,7 сэк.

Менскае акруговае сьвята ФК.

14 студзеня ў Менску распачынаецца зімовае сьвята ФК Менскай акругі дзеля складаньня каманды ад Менску на ўсебеларускія спаборніцтвы па зімовых галінах спорту.

Баскетбол, валейбол і гарадкі зімой.

У садзе „Прафінтэрн" на зімовай спартплянцоўцы арганізоўваюцца плянцоўкі для гульні ў баскетбол, валейбол і гарадкі. Гэта цікавая навіна дасьць магчымасьці займацца памянёнымі летнімі галінамі спорту на ат і ўзімку.

ЗАКОНЫ і ЗАГАДЫ ЎРАДУ БССР.

ПАСТАНОВА

Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР

аб аплаце камандыровачнымі ўдзельнікаў зьездаў, канфэрэнцый, пленумаў і нарад.

Паводле пастановы Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР ад 25 мая 1927 г. „Аб аплаце камандыровачных удзельнікам зьездаў, канфэрэнцый, пленумаў і нарад", Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускае ССР пастанаўляе:

устанавіць наступныя разьмеры і парадак аплаты ўдзельнікам зьездаў саветаў і пленумаў выканаўчых камітэтаў і зьездаў, канфэрэнцый і нарад, якія арганізуюцца ведамствамі і навучальнымі ўстановамі:

1. Члены ўсебеларускіх і акруговых зьездаў саветаў атрымоўваюць за час дарогі да месца зьезду і назад сутачныя ў разьмеры 1/30 іх месячнага ўтрыманьня.

Тым членам паказаных зьездаў саветаў, якія не атрымоўваюць сталага ўтрыманьня, плацяцца сутачныя ў пастуных разьмерах: адна трыццатая месячнага ўтрыманьня членаў прэзыдыумаў раённых выканаўчых камітэтаў—членам усебеларускіх зьездаў саветаў і адна трыццатая месячнага ўтрыманьня членаў прэзыдыумаў раённых выканаўчых камітэтаў—членам акруговых зьездаў саветаў.

2. Члены ўсебеларускіх і акруговых зьездаў саветаў атрымоўваюць харчаваньне і кватэру натурай або грашыма. Харчаваньне натурай можа заменьвацца выдачай сучасных у разьмеры паказаным у арт. 1 гэтай пастановы, а дача кватэры натурай можа заменьвацца грашовай аплатай у разьмеры, вызначаным у арт. 4 пастановы ЦВК і СНК Саюзу ССР ад 14 студзеня 1927 г. „Аб службовых камандыроўках у межах Саюзу ССР" (Збор 3. і З. СССР за 1927 г. № 4, арт. 42).

3. Аплата членаў і кандыдатаў у члены Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту сутачнымі за час Сэсіі Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту вытвараецца ў разьмеры 1/30 месячнага акладу адказных палітычных працаўнікоў цэнтру (па 17 разраду).

Аплата членаў акруговых выканаўчых камітэтаў сутачнымі за час пленумаў акруговых выканаўчых камітэтаў вытвараецца ў разьмеры 1/30 месячнага акладу адказных палітычных працаўнікоў цэнтру (па 17 разраду).

4. Члены ведамственых зьездаў, канфэрэнцый і нарад атрымоўваюць харчаваньне ў разьмерах вызначаных пастановай ЦВК і СНК Саюзу ССР „Аб службовых камандыроўках у межах Саюзу ССР", паказанай у арт. 2 гэтае пастановы.

5. Усім членам усебеларускіх і акруговых зьездаў саветаў, а таксама членам і кандыдатам у члены Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускае ССР і членам акруговых выканаўчых камітэтаў вызначаюцца кошт праезду на адзначаныя зьезды і сэсіі выканаўчых камітэтаў у два канцы па тарыфу мяккага вагону.

6. Сэзонным і тым часовым рабочым—членам усебеларускіх і акруговых зьездаў саветаў, а таксама тым-жа рабочым,—членам ведамсьцьвенных зьездаў, нарад і канфэрэнцый, якія не атрымоўваюць платы ад прадпрыемстваў за час дарогі і зьезду, павінны выдавацца адзначанымі ўстановамі і арганізацыямі, звыш прадугледжаных у арт. арт. 1, 2, 4 і 5 гэтае пастановы аплаты праезду, харчаваньня і кватэры, сутачныя ў разьмеры 1/30 іх сярэднягa заработку.

7. Сутачныя за час дарогі (арт. 1) у абодвы канцы, а таксама кошт самага праезду (арт. 5) аплачваюцца за рахунак органаў, устаноў і прадпрыемстваў, якія насылаюць дэлегатаў на зьезды, канфэрэнцыі і нарады.

Дача натурай харчаваньня або кватэры на месцы зьезду, канфэрэнцый і г. д. або выдача грашовых сум замест дачы харчаваньня і кватэры натурай, вытвараюцца за рахунак органаў, устаноў і прадпрыемстваў, якія скліканьне адзначаныя зьезды, канфэрэнцыі і нарады.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвякоў.
Сэкратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацкевіч.
22 сьнежня 1927 году.
г. Менск.

ПОСТАНОВЛЕНИЕ

Президиума Центрального Исполнительного Комитета Белорусской Советской Социалистической Республики

о оплате командировочными участников с'ездов, конференций, пленумов и совещаний.

На основании постановления Президиума Центрального Исполнительного Комитета Союза ССР от 25 мая 1927 г. «Об оплате командировочных участникам с'ездов, конференций, пленумов и совещаний», Президиум Центрального Исполнительного Комитета Белорусской ССР постановляет:

установить следующие размеры і порядок оплаты участников с'ездов советов, пленумов исполнительных комитетов и организуемых ведомствами, научными и учебными учреждениями с'ездов, конференций и совещаний:

1. Члены всебелорусских и окружных с'ездов советов получают за время дороги к месту с'езда и обратно суточные в размере не более одной тридцатой их месячного содержания.

Членам указанных с'ездов советов, не получающих постоянного содержания, уплачиваются суточные в следующих размерах: одна тридцатая месячного содержания членов президиумов окружных исполнительных комитетов—членам всебелорусских с'ездов советов и одна тридцатая месячного содержания членов президиумов районных исполнительных комитетов—членам окружных с'ездов советов.

2. Члены всебелорусских и окружных с'ездов советов получают довольствие и квартиру натурой или деньгами. Довольствие натурой может заменяться выдачей суточных в размере, указанном в ст. I настоящего постановления, а предоставление квартиры натурой может заменяться денежной оплатой в размере, указанном в ст. постановления ЦИК и СНК Союза ССР от 14 января 1927 г. „О служебных командировках в пределах Союза ССР" (Собрание З. и Р. СССР за 1927 г. № 4, ст. 42).

3. Оплата членов и кандидатов в члены Центрального Исполнительного Комитета суточными за время сессий Центрального Исполнительного Комитета производится в размере одной тридцатой месячного оклада ответственных политических работников Центра (по 17 разряду).

Оплата членов окружных исполнительных комитетов суточными за время пленумов окружных исполнительных комитетов производится в размере одной тридцатой месячного содержания, установленного для членов президиумов соответствующих окружных исполнительных комитетов.

4. Члены ведомственных с'ездов, конференций и совещаний получают довольствие в размерах, определенных постановлением ЦИК и СНК Союза ССР „О служебных командировках в пределах Союза ССР", указанном в ст. 2 настоящего постановления.

5. Всем членам всебелорусских и окружных с'ездов советов, а также членам и кандидатам в члены Центрального Исп. Ком. Белорусской ССР и членам окружных исполнительных комитетов уплачиваются стоимость переезда на соответствующие с'езды и сессии исполнительных комитетов в два конца по тарифу мягкого вагона.

6. Сезонным и тем временным рабочим,—членам всебелорусских и окружных с'ездов советов, а также рабочим,—членам ведомственных с'ездов, совещаний и конференций, не получающим от предприятий платы за время дороги и с'езда, должны выплачиваться соответствующими учреждениями и организациями сверх предусмотренных в ст. ст. 1, 2, 4 и 5 настоящего постановления оплаты переезда, довольствия и квартиры, суточные в размере одной тридцатой их среднего заработка.

7) Суточные за время дороги (ст. 1) в два конца, а также стоимость самого переезда (ст. 5) выплачиваются органами, учреждениями и предприятиями, посылающими делегатов на с'езды, конференции и совещания.

Представление натурой довольствия или квартиры на месте с'ездов, конференций и т. д. или выдача денежных сумм вместо предоставления довольствия и квартиры натурой производится за счет органов, учреждений и предприятий, созывающих соответствующие с'езды, конференции и совещания.

Председатель Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Червяков.
Секретарь Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Хацкевич.
22 декабря 1927 г. г. Минск.

Адказны рэдактар М. КУДЗЕЛЬКА.

КІНО-ТЭАТР.

БЕЛАРУСКІ ДРУГІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР.

СЕРАДА 11-1-28 г. „СОН У ЛЕТНЮЮ НОЧ", камэдыя ў трох дзеях.
НЯДЗЕЛЯ 15-1-28 г. „КАЛЯ ТЭРАСЫ", драма ў 4-х дзеях з часоў 1917 г.
ПАЧАТАК А 8 З ПАЛОВ. ГАДЗ.

КІНО-ТЭАТР «КУЛЬТУРА» — Першы бытавы баявік **„ВОДОВОРОТ"**. ЗВЫШ ПРАГРАМЫ ХРОНІКА СОВКІНО № 108.

КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА". — ГРАНДЫЁЗНЫ АМЭРЫКАНСКІ БАЯВІК **„ВЕЧНАЯ БОРЬБА"**. Мастацкая драма ў 7-мі частках. ШТОДНЯ—4 СЭАНСЫ. АНОНС! ХУТКА „ВАР'ЕТЭ".

КІНО «ПРАЛЕТАРЫ». — **„СПАРТАК"** ШТОДНЯ 4 СЭАНСЫ. Пачатак у 6, 7 з палов., 9 і 10 з палов. гадз. веч. АНОНС! Чарговая праграма **„ВТОРАЯ ЖЕНА"** вытворчасьці Узбекдзяржкіно.

КІНО „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ". — Грандыёзная мастацкая фільма па аповесьці ЛЕРМАНТАВА **„БЭЛА"** у 8-х частках.

ПРЫМАЕЦЦА ПАДПІСКА НА 1928 ГОД

НА ВЯЛІКУЮ БЕЛАРУСКУЮ ЧАСОПІСЬ ЛІТАРАТУРЫ, ПАЛІТЫКІ, ЭКАНОМІКІ, ГІСТОРЫКІ, КРЫТЫКІ

„ПОЛЫМЯ"

(СЁМЫ ГОД ВЫДАНЬНЯ)

пад рэдакцыяй: З. Жылуновіча (адказны рэдактар), М. Зарэцкага і Я. Ліманоўскага

У ЧАСОПІСІ ПРЫМАЮЦЬ УДЗЕЛ САМЫЯ ВЫДАТНЫЯ БЕЛАРУСКІЯ —) ЛІТАРАТУРНЫЯ І НАВУКОВЫЯ СІЛЫ. (—

ЧАСОПІСЬ „ПОЛЫМЯ" ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ПАЎТАРА МЕСЯЦЫ

(8 кніжак на год) разьмерам кожны нумар 12-14 друкаваных аркушаў.

З ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ 1928 Г. НАМЕЧАНА ДА ДРУКУ:

ПРОЗА: Я. Пёманскі—„На рубяжы сталеньня", раман; І. Бохэра (chci і CH 3: As Lewisit) (Адзіная справядлівая вайна), раман, забаронены да друку ў Нямеччыне. Цішка Гартны—„Крыжавыя дарогі" (3-я частка раману „Сокі палины"); Тарас Гушча—„У палескай глушы" (У глыбі Палесься), 3-я частка, аповесьць; Я. Ліманоўскі—„Пад абрывам", аповесьць; В. Каваль—„Пальма", аповесьць; М. Зарэцкі—„Закляты мох", аповесьць; А. Дудар—„Калі паходні дагараюць"—апавяданьне. Апавяданьні: Гергарт Поль, Ю. Фучык, Ф. Вейскопф, Ванчура і іншых. ПАЭЗІЯ: Якуб Колас—„На шляхох волі", паэма; Т. Кляшторны—„Сусьветы", паэма; Андр. Александровіч—„Цені на сонцы", паэма; А. Дудар—„Кастрычнік", паэма. ВЕРШЫ: Янкі Купалы, І. Бохэра, В. Маракова, М. Грамыкі, Гурло А., Гора.,